БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. У ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

СЛАВАМІР АДАМОВІЧ

***

За гэтыя вусны, што шэпчуць

мне па-беларуску,

за гэтыя вочы, што па-беларуску

глядзяць,

мы заўтра пакрочым лясною

сьцяжынаю вузкай

ад кулі варожай на росных імхах

паміраць...

23 сакавіка 1996 году



РЭСПУБЛІКА РАДЗІМА

Некалькі нумароў запар у «Нашай Ніве» друкуюцца лісты беларусяборцаў. Маўляў, кепскае імя нашай краіны фатальна навісла над ейным лёсам і не дае ёй вылузацца, стаць самастойнай і самавітай. Адзін чытач прапануе называцца Крывіяй, другі Літвой. Абодва падтрымваюць адзін аднога ў крытыцы імя Беларусь, але ў выбары альтэрнатывы разыходзяцца. Маўляў, Крывія сымбалізуе толькі паганскую веру, а Літва — хрысьціянскую. Трэці чытач, якому таксама недаспадобы Беларусь, адмаўляе Крывію, бо ён гомельскі, г.зн. радзіміч і ганарыцца ўласнай родаплемянной традыцыяй. Я думаю, прыгожая магла б атрымацца назва — Рэспубліка Радзіма...

Эсэ на старонцы 3.

№ 2 (99) 2 ЛЮТАГА 1998 г.

Філязофія перапужаных мужчынаў

Эсэ на старонках 14-15.

МРОЯ зьмяніла дзяржаўны лад

Справаздача з «Рок-каранацыі'97» на старонцы 4.

Прышчэпленая любоў

З нагоды 60-х угодкаў з дня нараджэньня Уладзімера Высоцкага. На старонцы 13.

Імя краіны

Спрэчка чытачоў на старонках 2-3.

Пра унію з дакорам

Рэцэнзія на старонцы 5.

Эратычныя занатоўкі

Адама Глёбуса на старонках 14-15.

Weissrussland

Краіна ў краіне. Выкрыцьцё змовы. У наступным нумары «НН».

СПЭЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

КГБ ПА-НЯМЕЦКУ: Штазі

Цяпер, пасьля вяртаньня зь Нюрнбэргу, я ведаю, як выглядае жах катаў.

Аляксандар Лукашук

... Сьветлы пакой, два сталы, на кожным — сотні шматкоў ірванай паперы. Чалавек бярэ кавалачкі, сартуе іх паводле гатунку паперы, машынапісу, почырку, колеру ў невялікія купкі, пасьля прыкладае адзін да аднаго, шукае супадзеньня краёў, нарошчвае суцэльную плошчу, часам пакідаючы дзіркі, пакуль з ашмяткаў не вырастае найвышэйшае дасягненьне цывілізацыі — аркуш з тэкстам.

Так у ваколіцах Нюрнбэргу паўсотні архівістаў ужо два гады рэстаўруюць сакрэтныя дакумэнты міністэрства дзяржбясьпекі ГДР, якія пасьля падзеньня Бэрлінскай сьцяны нямецкія чэкісты ліхаманкава ірвалі на шматкі.

Калі ў студзені 1990 дэманстранты ўварваліся ў Бэрлінскую Лубянку, яны знайшлі 17 тысячаў акуратна запакаваных мяхоў ірванай паперы. Гэта каля ста мільёнаў старонак даносаў, рапартаў, фатаздымкаў, відэа і аўдыёзапісаў.

ШТО Ў ІМЕНІ

Назва ўсходненямецкага міністэрства дзяржаўнай бясьпекі для беларускага вуха гучыць амаль як дзявочае імя, — Штазі. Гэта было самае ненавіснае імя для адных немцаў; другія ім ганарыліся, трэція пагарджалі і ўсе, у тым ліку члены палітбюро — баяліся.

Хросным бацькам Штазі, як і іншых усходнеэўрапэйскіх сакрэтных службаў, быў Лаўрэнці Берыя. Першыя дзесяцігоддзі Штазі працавала пад дыктоўку савецкіх дарадцаў. Пазыней Штазі пачала дзейнічаць больш самастойна, а ў 80-я гады ёй нават аддавалі перавагу перад КГБ: Штазі была лепш арганізаваная, яна надзвычай эфэктыўна кантралявала нямецкае грамадзтва і вельмі пасьпяхова працавала на Захадзе. Сотні расстраляных ля Бэрлінскай сьцяны, падтрымка тэрарыстычных арганізацыяў і арганізацыя забойстваў у Нямеччыне і за мяжой, палівязьні, змарнаваныя чалавечыя лесы, растаптаныя душы — гэты рахунак аднолькавы для ўсіх сакрэтных службаў таталітарных грамадзтваў.

Кіраўніком, ідэолягам і арганізатарам рэпрэсіяў і дыктатуры ў сацыялістычных краінах Усходняй Эўропы былі камуністычныя партыі. Аднак сакрэтныя службы зьяўляліся ня проста іх неадхоўленым інструмэнтам, — іх нездарма называлі органамі, г.зн. арганічнай, неад'емнай часткай цэлага. Немагчыма правесьці падзел, дзе канчаецца юрыдычная і маральная адказнасьць кампартыі і пачынаецца адказнасьць тайнай паліцыі. Паняцьце злачыннага загаду і злачыннай арганізацыі, выпрацаванае на Нюрнбэрскім трыбунале, вызначае агульны юрыдычны фон праблемы. Штазі была ўвасабленьнем сыстэмы: яны разам усталёўвываліся, мацьнелі, пашыраліся — і разам сканалі. Нязьменны кіраўнік Штазі ад 1971 году Эрых Мільке выступіў 13 лістапада 1989 году ў парлямэнце з апраўданьнем сваёй місіі:

Працяг на старонцы 11.

Будзьма жывыя!

У газэце № 98 сп. Ксенія Паўленка разьвярэдзіла мне душу сваім звышпэсымістычным артыкулам пад назовам «Мы ня ведаем сваёй мовы» наконт марнасьці беларускага адраджэньня.

У пэўнай ступені Ксенія мае рацыю ў тым, што нас ня многа, але мы ў «цяльняшках». Арганізацыі, пра якую піша чытачка, я, шчыра кажучы, ня ведаю. Калі сп. Паўленка пад гэтым назовам мае на ўвазе толькі рэдакцыі «Нашае Нівы» і некаторых іншых незалежных газэтаў, то яна памыляецца. Людзі апантаныя ідэяй адраджэньня, складаюць не арганізацыю, а шырокамаштабны рух, які складаецца з апазыцыйных уладзе партыяў, незалежных газэтаў і ўрэшце з проста сьвядомых ліцьвінаў (беларусаў). І «арганізацыю» гэтую не задушаць улады, яны могуць толькі пазбавіць рух легітымных сродкаў барацьбы (што, дарэчы, ужо адбываецца). Але хіба можна задушыць прагу да волі, яе толькі можна трансфармаваць у іншую форму існаваньня. І пакуль будзе жыць (а яна будзе жыць) гэтая форма існаваньня, да тае пары будзе жыць мова, і ня бачыць расейцам пашырэньня сваіх калёніяў.

Будзьма жывыя!

Ігар Максімаў, Менск

На мяжы здароўя і адукацыі

Разьмеркаваньне. Жудаснае слова, трывожныя водгукі якога выклікаюць абурэньне, незадаваленьне, няўпэўненасьць студэнцкай моладзі, сучасных абітурыентаў, былых школьнікаў. Іх сапраўды можна зразумець: ніхто зь юнакоў і дзяўчат не жадае быць ахвярай радыяцыі, чаго хочацца невядомым складальнікам авантурных і небясьпечных праграмаў. Разьмеркаваньне — зьява прымусовая, а гэта значыць, што маладых спэцыялістаў будуць накіроўваць у раёны Магілёўшчыны і Гомельшчыны, найбольш забруджаныя ізатопамі радыёактыўных рэчываў. Пра вынікі падобных мерапрыемстваў мала хто задумваецца, спадзеючыся ў каторы раз падмануць моладзь.

А вынікі невясёлыя, тут праўду ў мяху не схаваеш: па колькасьці анкалягічных хворых Беларусь зойме першае месца ў сьвеце, жанчыны стануць нараджаць дзяцей з рознымі фізычнымі адхіленьнямі, беларускі народ апынецца перад рэальнай пагрозай зьнікненьня ад промняў чарнобыльскага пекла, сьмяротнасьць будзе значна перавышаць нараджальнасьць... Смутныя факты можна працягнуць.

Акрамя таго, разьмеркаваньне закране шэраг сацыяльна-эканамічных праблемаў, вырашэньне якіх у адно імгненьне немагчымае. На прасторах роднага краю пануе беспрацоўе, нявыплата і затрымка заробкаў на дзяржаўных прадпрыемствах. Уявім, якая галеча чакае пакаленьне выпускаў ВНУ і ССНУ апошніх гадоў XX стагодзьдзя.

Студэнтаў і навучэнцаў, не спытаўшы пра іхнае меркаваньне, гвалтоўна кінуць на волю лёсу, тым самым адрываючы ад бацькоў, роднага кута, каханых, каб два гады адпрацоўваць на карысьць новых Гарлахвацкіх.

Маладыя людзі сустрэнуцца зь іншымі непрыемнасьцямі: за жыльлё плаці, на прадукты харчаваньня і тавары шырокага попыту грошы рыхтуй, на падпіску, на пэрыёдыку зьберагай. Тут хоць зубы на паліцу кладзі ад жабрацкіх умоваў жыцьця, ніхто за цябе не заступіцца, не паспачувае. У бюджэтнікаў заробкі не гумовыя.

Студэнты апынуцца перад сур'ёзным выбарам: вышэйшая адукацыя ці здароўе. Вучоба цяпер ня танная, але здароўе даражэй. Таму кожны з нас павінен прыкласьці шмат намаганьняў, каб атрымаўшы пры заканчэньні ВНУ дыплём, захаваць пры гэтым каштоўнае для чалавека здароўе.

Сяргей Званар, Менск

Згадваючы бацькоў

Добры вечар, паважаная «Наша Ніва»!

Калі я бяру цябе ў рукі, каб чытаць, заўсёды ўспамінаю тату і маму. Чытаючы «Нашу Ніву», я быццам бы размаўляю са сваімі бацькамі. Іх гаворка супадае з тваім пісьмом. Толькі цяпер я зразумеў, як мы многа страчваем, калі ад нас сыходзяць нашы бацькі.

Калі навучыўся чытаць, то бацька не даваў вечарам і ноччу чытаць кніжкі, каб не паліў газы і таму што ў гэтых кніжках напісаная няпраўда. Тады, калі быў падлеткам, бацька гаварыў, што ў Катыні расстралялі польскіх афіцэраў ня немцы, а Саветы. А мама расказвала, што адным разам у вайну выпівалі нямецкія афіцэры і чамусьці яны размаўлялі на польскай мове. То адзін зь іх гаварыў, што калі заваюем Расею, то трыццаць гадоў немцы ня будуць працаваць, а будуць жыць за кошт завяваных народаў. Расказвала, як карміла «освободителей» ў 1939 годзе. Самым лепшым пачастункам для чырвонаармейцаў быў саган варанай бульбы і міска квашанай капусты. У 1944 годзе немцы ледзьве ўсю вёску не расстралялі, бо партызаны на шашы спалілі мост. Старэйшы начальнік пасьля ператрусу паліцыі ў хатах зрабіў выснову, што ў цывільнага насельніцтва ня можа быць тратылавых шашак. А немцы адступалі арганізавана, усю ноч чуўся тупат па шашы. Пасярод вёскі былі пабудаваныя баракі для жыдоў. Мама расказвала, што аднаго разу маладая жыдоўка зайшла ў хату. Мама запытала ў яе, чаму яна не шукае партызанаў, бо немцы ўсё роўна іх расстраляюць. Дзяўчына адказала, што ня можа пакінуць сваіх бацькоў. Аднога разу немцы затрымалі двух маладых хлопцаў жыдоў, завялі за вёску і расстралялі, а затым пазьдзіралі зь іх боты, бо боты ў іх былі хромавыя.

Пасьля «освобождения» арыштавалі солтыса, хоць народ казаў, што ён людзям кепскага не рабіў. Пасьля арышту ён так і не вярнуўся дадому, дзесьці загінуў у ГУЛАГу.

Я ўжо памятаю, як ствараліся калгасы. Летам падчас жніва прыгналі камбайн, каб жаць людзкое жыта. Але народ ня даў. Тым летам мужыкі самі аралі свае палоскі, а на наступны год усё ўжо стала калгаснае. З нашай вёскі ў калгас запісаліся лічаныя гаспадары, сем'яў пяць. Астатнія засталіся толькі са сваімі прысядзібнымі агародамі. Мой бацька, які ня меў нават і аднаго гектара зямлі, у калгас не запісаўся. Працаваў вартаўніком у дарожнай арганізацыі. Жылі ў Горы і нястачы. Разам з хатай было толькі 10 сотак агароду. А нас у сям'і было 5 дзяцей. Памятаю, з бацькам трэсьлі грушыдзічкі на палях, а іх тады было яшчэ многа, і як падгніюць, можна было есьці. У тое лета да суседавага гумна падагналі малацілку і ўвесь ураджай перамалацілі, а яго як кулака засудзілі. Вярнуўся дамоў толькі тады, калі памёр Сталін, і ў яго трэслася галава. Пажыў нядоўга і памёр.

На сёньняшні дзень сядзіба дагнівае. На бацькаўшчыне мы пакінулі малодшага брата даглядаць бацькоў, што ён выканаў. Бацька пражыў 80 гадоў, а мама 76 гадоў. Брат не пражыў і 40 гадоў. Праца і п'янства зьнішчылі здатнага мужчыну. Жонка засталася ўдавою з двума сынамі. Братавая працуе даяркай і летам атрымлівала 700 тысяч рублёў. Сын сястры, трактарыст, атрымлівае 1 мільён 300 тысяч рублёў. А я ў горадзе пасьля апошняга падвышэньня — крыху больш за 2 мільёны. Як я помню, бацькі ў нядзелю ніколі не працавалі, а толькі ўходжваліся за жывёлай, каб пакарміць, напаіць. А сёньня я, жывучы ў горадзе, вымушаны гарбаціцца на так званай «дачы» кожны дзень пасьля працы, і ў суботу, і ў нядзелю, каб штосьці там вырасьціць для пракармленьня, бо заробку хапае толькі на малако і хлеб.

На сёньняшні дзень, пражыўшы пяцьдзясят гадоў, хачу выказаць свае думкі і меркаваньні пра нашае жыцьцё. Я не магу пагадзіцца з тым, што беларусы прагаласавалі за Лукашэнку. Я мяркую, што Лукашэнка — бачная частка «айсбэрга» нашага грамадзтва. Антыбеларускія сілы выпхнулі і трымаюць яго дзеля вынішчэньня ўсяго беларускага. Іншымі словамі, прышлы элемэнт, які атабарыўся на нашай зямлі, знайшоў свайго куміра. Імпэрыя вялікай лапатай перамяшала ўсе народы былога СССР, а на нашай тэрыторыі стварылася самая «салёная» канцэнтрацыя. Гэтая «соль» зьела нашу беларускую інтэлігенцыю і заможнае сялянства, якія перасталі супрацьстаяць русіфікацыі. Пасьля заканчэньня вайны адбываўся працэс унутранай акупацыі, які і завершыўся прыняцьцем лукашэнкаўскай канстытуцыі. Мы выйшлі на фінішную прамую канчатковага вынішчэньня беларускай мовы, а гэта значыць — беларускага этнаса. Няма мовы — няма народа. Беларусь без усялякай вайны апынулася ў акупацыі. Таму з гэтага трэба рабіць адэкватныя высновы, каб супрацьстаяць генацыду. Што рабіць? Каб у нас была беларуская эліта, то ўжо даўно б на цемя Лукашэнкі была б апушчаная пудовая гіра за ягоныя выказваньні пра неразьвітасьць беларускае мовы. На сёньняшні дзень ён ужо пераплюнуў В.Кубэ ў час нямецкай акупацыі па злачынствах супраць беларусаў. Надзеі на «легітымны» Вярхоўны Савет 13 скліканьня ня трэба песьціць. Трэба паказаць сусьветнай супольнасьці, што беларусы ёсьць беларусамі, яны не скарыліся нямецкаму фашызму і ня хочуць расейскага нацызму.

Беларуская школа задушаная «рэфэрэндумам», а вышэйшай няма ў зародку. Кіраўнічая намэнклятура і чынавенства адмовіліся ад беларускае мовы. Беларускае радыё садзейнічае толькі размываньню беларускасьці. Палітыка моўнага «вінэгрэта» яшчэ больш прыніжае беларусаў. Вось зараз па радыё выступае Бураўкін, і сьпяваюць песьні на ягоныя вершы, але гэта ўжо ня робіць надвор'я, бо не ўспрымаецца, таму што ўсё асяродзьдзе — у школе, на вуліцы, у горадзе, у транспарце, у крамах, у відэа і аўдыаінфармацыі — расейскае. Армія з савецкай ператварылася ў акупацыйную. Міністар абароны прывезены з другой дзяржавы. У вышэйшым кіраўніцтве адсутнічаюць сьвядомыя беларусы. Міліцыя ператварылася ў нямецкае СД, а КГБ і АМОН — у СС. А зьезд судзьдзяў — яскравы прыклад таго, што рэжым пад гучнымі лёзунгамі барацьбы са злачыннасьцю на самой справе гуртуецца для барацьбы са сьвядомымі беларусамі, каб канчаткова задушыць беларускі рух за адраджэньне і незалежнасьць.

Славянафашызм пераступіў парог беларускай хаты. Усе на барацьбу супраць ідэалёгіі славянафашызму! За свабоду! За незалежнасьць! Жыве Беларусь!

А.Малашковіч, Бярэсьце

Прыслухоўваюся да сябе

Не магу пакінуць бяз водгуку артыкул летувіскага эмігранта пра спыненьне «літоўска-беларускага» канфлікту ў №1 за 1998 г.

Перш за ўсё паведамлю, што чакаю кожнага другога аўторка, калі ў маю паштовую скрыню прыходзіць «НН», як наркаман чарговае дозы. Таму і ў гэты аўторак я, не даседзеўшы да завяршэньня абедзеннага застольля, пакінуў кампанію маіх сяброў і памкнуў дахаты, балазе што набрацца ўжо пасьпеў як трэба. Не распранаючыся пачаў прагна праглядаць доўгачаканыя бачыны. І што ж бачу я ва ўлюбёным пэрыёдыку? На лепшых старонках пад рубрыкай «Віленскі клюб» летувіскі навуковец палемізуе зь Сяргеем Шупам на тэму нашых з балтыйцамі гістарычных канфрантацыяў. Аргумэнтацыя нашых суседзяў не мяняецца, адно да старых аргумэнтаў дадалася прапанова ўсё забыць і «замірыцца». Уся пінта высмактанае гарэлкі кінулася мне ў галаву, калі ўбачыў даўно знаёмыя сьцьверджаньні, у якіх не дапускаецца й думкі пра тое, што «літоўскі этнас» XIV ст. ды сёньняшнія летувісы — гэта розныя рэчы. Як быццам і не існавала шматлікіх гіпотэзаў аб славянскай прыналежнасьці ліцьвінаў (у вузкім сэнсе гэтага этноніму) — вільцаў-люцічаў, як быццам Жмудзь і эта не асноўны складнік сёньняшняе летувіскае нацыі, а этнічны дадатак на ўскраіне.

Ізноў чытаю бязглузьдзіцу, што беларускае насельніцтва Віленшчыны a priori ня можа быць каталіцкім, быццам не было масавага навяртаньня беларускага насельніцтва ў заходні абрад пасьля касаваньня Вуніі, асабліва пасьля рэлігійнае лібэралізацыі 1905 году й асабліва ў заходніх губэрнях. Не, для п. Гурэцкаса аксіёмаю застаецца тое, што «канфэсійная мяжа адпавядае этнічнай літоўска-славянскай мяжы канца XIV ст.»! Вось жа аказваецца не было за шэсьць зь лішкам стагодзьдзяў ані значнейшых рэлігійных зрухаў (перад усім зьвязаных з уцёкамі беларускага аўтахтоннага насельніцтва ад хамства праваслаўнае расейшчыны ў рымскі абрад), ані агульнапрызнанага працэсу славянскае асыміляцыі ў напрамку паўднёвы ўсход — паўночны захад.

Не прэтэндуючы на навуковую крытыку, я проста хачу ўцяміць пазыцыю «НН». Навошта даваць каштоўную газэтную плошчу пад неарыгінальныя аповеды летувіскіх апанэнтаў? Потым да мяне прыйшла аптымістычная думка. А можа мы ўжо настолькі ўпэўненыя ў нашых сілах, каб друкаваць у хіба адзіным нацыянальным ва ўсіх сэнсах пэрыёдыку аргумэнтацыю апанэнта й зважаць на гэта роўна ў такой ступені, на якую яна заслугоўвае?

Яшчэ хачу падзяліцца цікавым досьведам у галіне магіі, які аналягічны Антанянаваму. Калі я быў у летніку пад Анапаю адразу па Чарнобыльскай катастрофе, то мы, 12-13-гадовыя падлеткі з Гомеля й пацярпелых райцэнтраў, аднойчы згулялі ў дзіўную гульню, якая мяне зачаравала назаўжды, але якой я ніколі не наважыўся ні з кім паўтарыць. Сэнс гульні супадаў з «Нашай Пані».

Адзін хлопец клаўся на тры крэслы так, каб пяткі й патыліца былі на скрайніх. Ён выцягваў рукі ўздоўж тулава, заплюшчваў вочы. Астатнія (нас было чалавек 8) станавіліся навокал, паднімалі рукі, спляталі іх адна з другой у пальцах і прамаўлялі: «Божа, молімся да Цябе». Затым адзін з нас прыбіраў сярэдняе крэсла. Але хлапец ня падаў! Ён трымаўся адно на пятках і патыліцы. Ніякае мускульнае напругі мы не заўважалі. Ён проста спакойна ляжаў...

Напрыканцы хачу падзякаваць Славаміру Адамовічу за ягонае эсэ «Блакітная мара...» Даўно я гэтак не сьмяяўся. Славамір заўжды ў вершаваныя і празаічныя творы, якія прасякнутыя патасам, устаўляе, знарок або не, такія радкі, што міжвольна зарагочаш, якой бы сур'ёзнаю ні была тэма.

Цяпер, вітаючыся за руку, я лаўлю сябе на думцы, ці адпавядае мой поціск Адамовічаваму патрыятычна-мужчынскаму ўзору. Адразу ацэньваю, на якім узроўні ад падлогі сустрэліся нашыя рукі. Пасьля ўважліва прыслухоўваюся да сябе, ці адбыўся пры поціску абмен «здаровай мужчынскай энэргіяй».

Макс Кірэйчык, Гомель

Імя краіны

Я ня маю ніякага маральнага права асуджаць першых адраджэнцаў, бо яны пачыналі амаль з нуля і ня ведаю, ці быў у іх сякі-такі выбар. Але хачу прааналізаваць наступствы наданьня нам і нашай краіне імёнаў «беларусы» і «Беларусь».

На працягу стагодзьдзяў на Эўразійскіх абшарах утваралася вялізная імпэрыя, якая мела ў розныя часы розныя назвы. На нейкім этапе (больш за 200 гадоў таму) яна падпарадкавала сабе і нашыя землі. З гэтага часу мы трывала знаходзімся ў палітычнай, эканамічнай, культурнай, псыхалягічнай прасторы гэтай дзяржавы. За стагодзьдзі існаваньня імпэрыі ў масавай сьвядомасьці яе жыхароў ды і ўсяго сьвету выпрацаваўся ўстойлівы стэрэатып, сыстэма кодавых знакаў, што вызначаюць сутнасьць і характар гэтага дзяржаўнага ўтварэньня, яго месца ў сусьветнай цывілізацыі. Гэта шэраг сымбаляў, ключавым зь якіх зьяўляецца этнонім «рускі». Вось, напрыклад, як выглядае гэты рад: Рускі — Расея — Русь — Праваслаўе — Масква —Вялікая дзяржава — Імпэрыя. Гэты шэраг можна працягнуць, а сымбалі перастаўляць як заўгодна. Зь цягам часу ўсе гэтыя словы сталі сынонімамі і набылі непадзельны характар. Як бы каму ні хацелася, але гэта — геапалітычная і геакультурная РЭАЛЬНАСЬЦЬ. І зьнікнуць яна можа толькі са зьнікненьнем самой дзяржавы, у што слаба верыцца (прынамсі на бліжэйшую будучыню).

А зараз разгледзім назву «беларускі» ў кантэксьце вышэйсказанага. Як ужо адзначалася, слова «рускі» зьяўляецца ключавым у вызначэньні дзяржавы, якая сёньня называецца Расейскай Фэдэрацыяй. Сэмантыка слова «белы» таксама вядомая — чысты, сапраўдны, сьветлы. Сыходзячы з прапанаванай лёгікі, атрымліваецца, што тэрмін «беларускі» азначае «чыста рускі», «сапраўдны рускі», іншымі словамі, больш рускі, чым уласна рускі. Усё гэта цалкам экстрапалюецца на ўсю сыстэму кодавых знакаў, якія вызначаюць Расейскую дзяржаву. Атрымліваецца, што мы большыя за расейцаў расейцы, больш праваслаўныя, больш імпэрскія і г.д. Як кажуць: вось і прыплылі! Уся праблема Нашага Нацыянальнага Адраджэньня палягае ў тым, каб давесьці беларусам сваю культурную адметнасьць ад іншых народаў (найперш ад рускага) і самадастатковасьць беларускае культуры. Як гэта можна давесьці да народа, які ўжо паводле свайго самавызначэньня «рускі» (прыстаўка «бела» адыгрывае другарадную ролю)? Няўжо даказаць «старэйшаму брату», што ты на самой справе «больш рускі», чым ён сам? Бязглузьдзіцца ды й толькі. Таму ня дзіва, што ўсе папулісцкія выказваньні наконт «адзінага народу з адзінай гісторыяй, які прагне зноў зьяднацца» ўспрымаюцца абсалютнай большасьцю як цалкам нармальныя і справядлівыя. Вось, сапраўды, дзе ключ, якім «зачынілі» нацыянальную ідэю.

Ключавое слова «рускі» як кампутарны вірус разбурае й будзе разбураць і надалей усе самыя лепшыя праграмы Нацыянальнага Адраджэньня. Была гэтая сыстэмная памылка першых адраджэнцаў фатальнай, ці не, пакажа час, а пакуль усе горкія наступствы яе відавочныя. Што ж, трэба прапанаваць нешта канструктыўнае. Тут я цалкам салідарны з Максімам Кірэйчанкам з Гомеля. Каб сьцьвердзіць сваю адметнасьць і самастойнасьць, лепш за ўсё падыходзяць спрадвечныя нашыя імёны «Літва» і «Ліцьвіны». З гэтым адразу паўстае некалькі вастрэйшых праблемаў. Найпершая зь іх — унутраная: большасьць насельніцтва адрыне новыя (старыя) імёны. Што ж, няхай пакінуць сабе звыклыя. Але, са свайго вопыту я ведаю, што людзі, якія сталі патрыётамі сваёй Радзімы і добра ведаюць яе гісторыю, прымуць імёны «Літва» і «Ліцьвіны» без асаблівых цяжкасьцяў. Вядома, на гэта патрэбны час, але ж паўтараць старыя памылкі ў нашых умовах — гэта згубіць, мабыць, апошні шанец на збудаваньне Нацыі.

На прыканцы хацелася сказаць колькі словаў пра камп'ютарныя гульні. Вельмі цікава пра гульню «Бранявы кулак-2» распавядае Вацлаў Арэшка. Сапраўды, вельмі прыемна адчуць сябе ў ролі вызваліцеля Радзімы ад акупантаў. А ці ведаеце вы, што адна маскоўская фірма кампутарных гульняў выпусьціла ў сьвет навінку пад назвай «Всеслав Чародей»? Калі вы думаеце, што празь яе даведаецеся пра подзьвігі легендарнага Палачаніна, то жорстка памыляецеся. У прадмове да гульні няма ані каліва гістарычнай праўды. Нават няма згадкі пра тое, што Ўсяслаў быў Полацкім князем! Адзінае, што пакінулі распрацоўшчыкі гульні, гэта тое, што падзеі разгортваюцца на тэрыторыі «Древней Руси начала XII века». Ня кепскі прыклад канцэпцыі «единого народа с единой историей».

І.Д. Віцебск

Больш рускія

Здаецца, я здагадваюся, чаму Вы не жадаеце друкаваць майго ліста. Мабыць, Вы ня згодныя з маёй думкаю, што ніякія мы, беларусы, ня балты, як пісаў С.Паўлоўскі ў 88-м нумары, а славяны, да таго ж славяны рускія, і ня менш, а мабыць і больш рускія за любога маскаля, і таму ў дачыненьні да беларусаў ды ўкраінцаў нельга ўжываць такіх словаў як «русификация» і «обрусевшие», бо гэта ёсьць нонсэнс. А трэба казаць: «абмаскальваньне» ды «абмаскаленыя», як казаў Кастусь Каліноўскі, бо маскалі — гэта гістарычная назва нашых «старших братьев» у нашай мове, без усялякае абразы для іх.

Ігар Казакоў, Салігорск

Адраджаць трэба аўтэнтыку

Вельмі цешуся сподумам «Вырачэньне чужога імя» пана Ўладзімера Лобача пра Крыўю! Запраўды! Дакуль будзе ва ўжытку найме «Беларусь — беларусы» — знойдуцца пачвары, якім закарціць плявузгаць аб Русі адзінай. Першая «Беларусь» была акупаваная першай. БНР жыве на высяленстве, а РБ мадзее ды рымсьціць. Але асобы, якім мы вінныя задзячыць за захаваньне краіны, пачуваліся Ліцьвінамі, ад Радзівілаў да Касьцюшкі й Адама Міцкевіча. А часы росквіту й нашай магутнасьці — за Літвою! І менавіта Літва, а ня Крыўя выстаяла супраць гвалтоўнай хрысьціянізацыі, даўшы захаваньне інстытуцыі Крэваў. Варта памятаць пра суіснаваньне Літвы з Крыўяй. А як гукаць дрыгавіцка-гуда-гоцка-яцьвяскіх палешукоў, якія ані крывічамі, ані ліцьвінамі не былі? Адраджаць трэба аўтэнтыку, а не насоўваць штучную шыльду. Калі гукнуць усю прастору краіны толькі Літвой або толькі Крыўяй, дык гэта будзе такая ж мана і няпраўда як і «Беларусь». Маюць права ўскроснуць усе плямёны і княствы, усе кшталты культураў і моваў. Літвой маюць гукацца Меншчына, Віленшчына, Беласточчына й Гарадзеншчына. Крыўяй — Віцебшчына, Полаччына, Смаленшчына й Пскоўшчына. Палешукі ж самі няхай вызначаюць сабе мяно. Найбольш апраўданае імя для адроджанае дзяржавы — Людовая Рэч Паспалітая Літва-Крыўя-Яцьвезь.

Скіргайла Паланецкі, Менск

Гусоўскі — наш

У кнізе «100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі» ў артыкуле «Хто такі Мікола Гусоўскі?» ёсьць абзац: «М.Гусоўскага часам беспадстаўна прыпісваюць да жамойцкае, украінскае або польскае літаратуры, ня ўлічваючы відавочных сьведчаньняў яго беларускага паходжаньня ў самой паэме. Зубр, на якога ў маладосьці паляваў паэт, не вадзіўся ў стэпах Украіны, а рака Дняпро, як вядома, не працякае ні ў Польшчы, ні ў Жамойці. Да таго ж, ідэал паэта — Вітаўт — у палякаў асабліва не шанаваўся. І, нарэшце, самае галоўнае —беларуская мэнтальнасьць, якою прасякнуты твор і якая фіксуецца на ўсіх узроўнях ягонае будовы».

Магчыма, для жамойтаў, палякаў ды ўкраінцаў гэтыя довады могуць здацца малапераканаўчымі, а сьведчаньні —недастаткова відавочнымі. Тады, са свайго боку, я хачу прывесьці сапраўды відавочнае сьведчаньне, зь якім можна нават ня ведаць зьместу «Песьні пра Зубра».

Зьвярніце ўвагу на тытульны аркуш паэмы (яго выява — у артыкуле), на прозьвішча аўтара па-лацінску: HUSSOVIANI. Пачатковая літара прозьвішча — «H» — абазначае гук [h], які супадае зь беларускім [г] ці, прынамсі, блізкі да яго. (Гуку [г] (выбуховаму) адпавядае літара «G», а гуку [х] — дыграф «CH».) Гук [г] (плаўны), які адпавядае лацінскай літары «H», быў і ёсьць уласьцівым беларускай ды ўкраінскай мовам . (Ім жа неўласьцівы [г] (выбуховы)). Але гэты гук неўласьцівы жамойцкай і польскай мовам — ён абазначае адпаведнае «H» і зьяўляецца толькі ў запазычаньнях з замежных моваў —напрыклад, тых жа лацінскай ды беларускай (польскае «hańba»). (Гэтым жа мовам уласьцівыя «G» і «CH»). Той факт, што прозьвішча аўтара перадалося ў лацінскую мову з гукам, з усіх згаданых моваў уласьцівым адно беларускай ды ўкраінскай, аўтаматычна адмятае магчымасьць польскага ці жамойцкага паходжаньня Гусоўскага.

Таму надалей варта адразу пачынаць з гэтага аргумэнту, а потым казаць пра стэпы ці штось яшчэ адносна апошняга кандыдата — Украіны.

Віталь Станішэўскі Менск

Выхваленьне

«Нашай Нівы» з нагоды яе 100-га нумару

Наша Ніва... Каб не было цябе гэтыя гады, дык нават і ня ведаю, не ўяўляю, як склалася б гісторыя сучаснай Беларусі (адно зразумела, што ня ў лепшы бок).

Ты заўжды, у любы час, стаяла на галаву вышэй за ўсю прэсу краіны. Некалі мой сябрук сказаў: «Наша Ніва» штонумар дае высьпятка астатнім газэтам, падганяючы іх наперад, у Эўропу, да прафэсіяналізму.

Празь цябе мы далучаемся да сапраўднай сусьветнай літаратуры на сваёй мове. Дзякуючы табе пачала стварацца новая беларуская літаратура. Дзякуючы табе мы пачалі вучыцца разважаць.

Ты сымбаль адрадж... Не, не адраджэньня. Наш род выродзіўся менавіта тады, калі мы вырашылі адраджацца. Бо не адраджацца, а нараджацца пачала зусім іншая нацыя, новы народ. Народ свабоды. Ты сымбаль нараджэньня і волі. І мы дзеці твае.

Дык адсьвяткуем жа твой соты нумар! Атрымаўшы поштай ці набыўшы ў шапіку, уздымем кілішкі з гарэлкаю, каньяком ці самагонам (хто што мае). Будзем сьвяткаваць і весяліцца на злосьць выраджэнцам. Хай будзе у гэтым годзе на адно сьвята больш. Больш сьвятаў (а ня «празнікаў») — больш шчасьця, радасьці, а тады, зразумела, і ўдачы. Посьпех не наведвае панурых і незадаволеных. Удача — нявеста весялосьці.

Веру, што б ні здарылася, але мы, народ «Нашай Нівы», дачакаемся і 1000-га нумару.

Жыве «Наша Ніва»!

Жыве Беларусь!

Руслан Равяка

Рэспубліка Радзіма

Днямі на вітрыне газэтнага шапіка я выпадкова прачытаў імя прадавачкі — Бэнэдыкта. У Менску адразу сказалі б — заходніца. А ў Вільні гэта справа звычайная. Тут, дзе жывуць некалькі народаў рознае веры, ніхто не задзівіцца твайму імю. Бо саміх імёнаў, прычым пашпартных, безьліч. Нашыя Сашы з Машамі гучаць тут, наадварот, як рэдкая трывіяльнасьць. А паспрабуйце ўявіць сабе беларускага чалавека, які б у пашпарце зваўся Саша або Маша, або Вова. Нерэальна. Не паложана. І гэтак толькі ў нас. У іншых народаў (апрача хіба расейцаў) такіх жорсткіх усенародных дамоўленасьцяў не існуе. І гэта, на маю думку, характарызуе ня столькі наш мэнталітэт, колькі сытуацыю, у якой апынулася Беларусь.

Падбіраючы для гэтае сытуацыі характарыстыку, я выйшаў на ключавое слова — кругагляд. Іменьнік, якім паслугоўваецца народ, сьведчыць пра кругагляд гэтага народу. Кругагляд — вось слова, якое вытлумачвае ці ня ўсе нашыя цывілізацыйныя пралёты апошніх гадоў і найлепшым чынам характарызуе ўладу, якая пануе ў краіне і электарат таксама. Усё б нічога, а вось кругагляд — вузкі.

У любым іншым месцы сьвету могуць назваць дзіця Сонейкам ці нават Ялінай, ніхто ня зьдзівіцца, а вакол быццам сьвятлей стане і адкрыюцца невядомыя энэргетычныя шлюзы. Імя маёй знаёмай літоўкі Айрыі перакладацца як Ірляндыя. Ёсьць у іх сямейнае паданьне, пра тое, як далёкага продка Аирыі з затанулага карабля выратаваў нейкі ірляндзец. У бацькоў іншай Айрыі паданьня не было, проста спадабалася імя.

Адзін піцерскі знаёмец некалі распавядаў мне, што для расейскага вуха Вячаслаў Францавіч Кебіч гучыць ня йначай як Беата Тышкевіч, гэта значыць, не па-свойску. У тыя часы людзі ў Расеі магчыма ўпершыню адчулі, што брацішка-беларус жыве ў іншай краіне. Прычым адчулі на самым жорсткім, знакавым узроўні — на ўзроўні ўласных імёнаў. Тады ж, спрабуючы вярнуць братэрскае адзінообразие, сёй-той з палітыкаў тлумачыў, што ў Беларусі ўладу захапілі палякі. А мясцовыя нацыяналы наадварот вышуквалі ва ўласных імёнах глыбокія эўрапейскія повязі. І калі Кебіч сустракаўся з Колем, яны задаволена адзначалі, што сустракаюцца дзьве капусты: Кебіч па-ангельску і Коль па-нямецку.

Выбар імя — надзвычай істотны жыцьцёвы акт, у якім сыходзяцца і агульныя традыцыі, і прыватныя густы, і энэргія Космасу. Калі ж над народам пануе абмежаваны загсаўскі сьпіс, для выбару амаль не застаецца месца. На гэтай абмежаванай прасторы мы поўнімся крытыцызмам да імёнаў сваіх суайчыньнікаў і да імя самое нашае краіны Беларусі. І гэта таксама вылучае нас у шэрагу іншых народаў. На маю думку, вольны выбар імя для дзіцяці ў Беларусі варта залічыць у фундамэнтальныя правы чалавека, якія яшчэ трэба будзе ўсталяваць.

Некалькі нумароў запар у «Нашай Ніве» друкуюцца лісты беларусяборцаў. Маўляў, кепскае імя нашай краіны фатальна навісла над ейным лёсам і не дае ёй вылузацца, стаць самастойнай і самавітай. Адзін чытач прапануе называцца Крывіяй, другі Літвой. Абодва падтрымваюць адзін аднога ў крытыцы імя Беларусь, але ў выбары альтэрнатывы разыходзяцца. Маўляў, Крывія сымбалізуе толькі паганскую веру, а Літва — хрысьціянскую. Трэці чытач, якому таксама недаспадобы Беларусь, адмаўляе Крывію, бо ён гомельскі, г.зн. радзіміч і ганарыцца ўласнай родаплемянной традыцыяй. Я думаю, прыгожая магла б атрымацца назва — Рэспубліка Радзіма...

Чацьверты прапануе, каб ня блытацца зь Літвой-Лєтувой, называцца Вялікалітвой. Пяты чытач ужо ня піша, а тэлефануе мне ў рэдакцыю і кажа, што пасьля ўсіх гэтых прапановаў у яго ня толькі ўсё пераблыталася ў галаве, але й паплыла трывалая глеба пад нагамі. Маўляў, справа, дзеля якой жывеш і выстойваеш у супрацьстаяньні з антыбеларускімі ўладамі, пачынае рассыпацца на мноства часьцінак. І калі ўжо на тое пайшло, яму зручней называцца як ягоная вясковая бабка — тутэйшым, самым мудрым і па-філязофску глыбокім сялянскім імем, ад канкрэтнага месца на зямлі — тут. Вось толькі ў горадзе гэтага «тут» няма, не намацваецца...

Парадокс у тым, што ўсе нашыя чытачы маюць рацыю. І наконт Беларусі, і наконт Крывіі зь Літвой, і наконт Тут. Усе іхныя прапановы сто разоў гістарычна апраўданыя і вартыя ўвагі. Адно, што выбар гэтых людзей, якія сыходзяцца ў справядлівай крытыцы імя Беларусь, разводзіць іх у розныя бакі. Ён іх не злучае, а разьядноўвае. Бо крывіч ніколі не захоча звацца ліцьвіном або тутэйшым і наадварот. І чым далей будзе працягвацца дыскусія, тым больш непераадольны будзе выраставаць паміж імі бар'ер. Досьвед у гэтым сэнсе ў нас ёсьць. Гэта расколатая беларуская эміграцыя, якая паглыбіла свае разыходжаньні ў выбары назвы краіны на раскол канфэсійны, партыйны і ўсялякі іншы. Прымірэньне ў большасьці выпадкаў аказалася немагчымым.

А між тым якраз беларушчына сёньня — адзінае, што дазваляе ідэнтыфікаваць і аб'яднаць супраць русіфікацыі і крывічоў, і ліцьвіноў, і радзімічаў, і тутэйшых. Уявім сабе «НН» як літоўскую або ліцьвінскую газэту, ці напісаў бы ў яе крывіч або які-небудзь яцьвяг — як у сваю, прычым адначасова сваю для ўсіх? Сумнеўна. Таму выбар у гэтай справе пралягае не паміж альтэрнатыўнымі назвамі, а паміж яднаньнем і расколам.

Назва краіны можа быць зьмененая ў часы ўсенароднага ўздыму і прыходу да ўлады нацыянальных сілаў або ў часы, калі нармальная ўлада стабілізуе сытуацыю ў краіне. Скажам, крывіцкая партыя пераможа на выбарах ліцьвінскую, і Беларусь стане называцца Крывіяй. Але гэта ня здарыцца сёньня. Сёньня антыбеларускі і антыдэмакратычны рэжым, які заняў пасад краіны, будзе назіраць за спрэчкаю крывічоў зь ліцьвінамі, і цешыцца тым, што іхны адзіны сьцяг разьдзёрты на дробныя кавалкі няісных краінаў.

Як ні круці, а зьмена назвы не выглядае сёньня панацэяй для Беларусі. Можа быць, у нашае агульнае маткі і сапраўды НЯ ТОЕ імя. Але на іншае яна нам не адгукнецца.

Сяргей Паўлоўскі

МРОЯ зьмяніла дзяржаўны лад

«Незалежная Рэспубліка Мроя» — лепшы рок-гурт 1997 году. Вось галоўная ацэнка, якую зрабілі аглядальнікі дваццаці восьмі СМІ і прад'юсары шасьці шоў-фірмаў. Такая супольная выснова была прадстаўленая менскай публіцы 29 студзеня ў кінатэатры «Москва» ў выглядзе імпрэзы «Рок-Карона'97».

Рашэньне журы фэстывалю аб каранаваньні мроеўскіх «рэспубліканцаў» ня сталася неспадзеўкай, бо папросту не магло быць іншым. На мінулай «Каранацыі» «NRM» атрымалі прыз за «Песьню году» дзякуючы ўласнай прынцыповасьці й шчырасьці гледачоў, якія на «гура» прынялі раптоўную замену прапанаванай спачатку бяскрыўднай «Мела мамка тры сыночкі» на сапраўдны хіт — «Партызанскую». Дэ факта «N.R.M.» ужо тады была гуртом году, бо стварыла больш, чым музычную падзею...

Народжаная ў 1994 годзе імпрэза пад назовам «Рок-Карона», сталася традыцыйнай. Гэтак, як традыцыйнай застаецца праблема выбару лепшых выканаўцаў з кола, якое за апошнія пяць гадоў павялічылася адно на каліва. Традыцыйна й тое, што якасныя зьмены адбываюцца толькі сярод фаварытаў, якія адначасова зьяўляюцца ўдзельнікамі «спаборніцтва» за «карону» беларускага року. Таму ініцыятарам «Каранацыі» шторaз даводзіцца прыдумляць адмысловую намінацыю, каб мець падставу адзначыць той ці іншы з гуртоў, якія аб'ектыўна ня горшыя адзін за другі. Гэтак у 1995 годзе асабіста для Касі Камоцкай была прыдуманая намінацыя «Рок-Князёўна», для «Крамы» — «За адданасьць жанру» ў 1996, а летась для «Нейродюбеля» — «За лепшую інтэрпрэтацыю эстраднага шлягера». І толькі сёлета фірма «Дайнова» выкараскалася з пасткі, у якую патрапіла на першай «Каранацыі», прапанаваўшы ў якасьці намінацыі свой фірмовы слоган — «Традыцыі й сучаснасьць». Толькі дзякуючы леташняму фэерычнаму ўварваньню гурта «Крыві» ў музычнае жыцьцё краіны, «Палац» нарэшце скінуў з плячэй «традыцыйна-сучасны» цяжар «гурта адной намінацыі», і атрымаў спадзеў быць адзначаным у іншых.

Ня дзіва, што пры такой тэндэнцыі апошняя «Каранацыя» падарыла новы прадукт у пошуку намінацыяў — «Надзею году». Ёю стаўся гурт «Happy Face». Як для мяне, дык шанцы ў гурта ня большыя, чым у «Адкрыцьця году» гомельскага «VooDoo». Зь першымі акордамі сталася ясна, што ягоныя музыкі вельмі любяць «Deep Purple», але асабіста ў мяне няма аніякае надзеі, што гурт калі-небудзь падорыць нам Рычы Блэкмара ці Яна Гілана... Ці можа на маю думку ўплывае традыцыйная беларуская адсутнасьць спадзяваньня?

На дзесяць намінацыяў фэсту прыйшлося 16 выканаўцаў, зь якіх толькі пяцёра выступалі ў якасьці гасьцей: Іван Маркаў, «Крама», «Ляпис Трубецкой», «Уліс», «Палац». Амаль усе госьці выканалі старыя хіты...

Адна зь неспадзяванак фэсту — адсутнасьць сярод гасьцей ці ўдзельнікаў «Новага Неба». Пэўна, у якасьці «суцяшэньня» Касі Камоцкай прапанавалі рэпрэзэнтаваць «Альбом году» — «Народны Альбом».

Наўрад ці такі вялікі й шматплянавы праект, як «Народны Альбом» можна рэпрэзэнтаваць адной песьняй. Па сутнасьці, «Народны Альбом» мог бы прэтэндаваць і на «Адкрыцьцё», і на «Традыцыі й сучаснасьць», і на «Падзею году»... Тым больш заканамерна, што праект у асобе Міхала Анемпадыстава атрымаў прыз за «Лепшыя тэксты». Зрэшты, ці толькі за «народныя» тэксты быў уручаны прыз? Калі я глядзеў, як мастацкі рэдактар «Нашай Нівы» Сяргей Харэўскі дорыць Касі ад імя рэдакцыі кветкі «зь Вільні», я ведаў, што падзяка сьпявачцы — менавіта за тыя песьні, празь якія «Новае Неба» сталася «небясьпечнай» зьявай.

... Пэўна, ня варта шукаць аніякае сымболікі ў тым, што сёлетняя, самая вялікая па колькасьці ўдзельнікаў і гледачоў «Каранацыя», адбылася ў кінатэатры «Москва», бо незалежна ад волі арганізатараў, найбуйнейшыя канцэртовыя пляцоўкі сталіцы дагэтуль носяць імёны «з акцэнтам», недастасоўным да беларускай культуры ўвогуле, а да беларускага року пагатоў. Тым ня менш, арганізатары «Рок-Кароны'97» спраўдзілі пастаўленае калісьці на мэце пераўтварэньне імпрэзы ў буйны фэст — «Москва» была запоўненая амаль цалкам.

Публіка й сталася самым вялікім сюрпрызам фэсту. Я зразумеў гледачоў, калі яны не «пранікліся» капрызна-пакрыўджаным, хаця й «мілым» і «гарэзьлівым», прывітальна-разьвітальным выступам леташняга караля імпрэзы «Ляписа Трубецкого», які песьняй «пра самы лепшы гурт, і самага лепшага сьпевака Сярожу» даў адказ «злапыхацелям», што не прызнаюць «ляпісаў» за рокавую каманду. Таксама відавочна, што вядучым праграмы, «зоркам» радыё Бі-Эй, было складана разьвесяліць публіку жартамі, створанымі ў стылістыцы радыёперадачы для «нармальных пацаноў» з Камароўкі... Але ж публіка не «завялася» нават тады, калі на сцэну выйшаў «цьвік» імпрэзы — адноўлены толькі на некалькі хвілінаў адмыслова для «Рок-Кароны» гурт «Бонда».

Мяркую, што тыя, хто мог зразумець маё зьдзіўленьне, не патрапілі на «Карону», бо не адужалі коштавы бар'ер квітка —выкласьці больш за пяць даляраў за адзін канцэрт для сёньняшняга падлетака, на жаль, складана... Зь іншага боку, я не паверу, што «дарослая» публіка ймкнулася ў кінатэатар «Москва» адно дзеля таго, каб паслухаць сьпявачку, якая ў аднайменным горадзе патрапіла ў «ляўрэаты конкурсу «Утренняя звезда».

Калі ў намінацыі «Падзея году» быў названы леташні праект «Песьнярок», дык на званьне «Падзеі» новага рок-сэзону, на мой погляд, ужо цяпер можа прэтэндаваць менавіта выступ «Бонды».

Севярын Квяткоўскі

«Народны альбом» на БТ

19-20 студзеня ў будынку былога Палаца культуры, які цяпер носіць годнае найменьне Дзяржаўны маладзёжны тэатар эстрады, праходзілі запісы канцэртаў «Жывы гук» у рамках тэлеканалу «Добрай раніцы, Беларусь». Для тых, хто ня ведае: крыху зьмяніўшы зьнешні выгляд, Беларуская тэлевізія паспрабавала паднавіць і вяшчальную сетку, зрабіўшы акцэнты на інфармацыйна-забаўляльных праграмах. «Добрай раніцы, Беларусь» і ёсьць адным з самых пэрспэктыўных праектаў БТ — усё цікавае й нязьведанае выпрабоўваюць менавіта на гэтым ранішнім канале, дзе працуе больш-менш маладая публіка.

Канцэрты «Жывы гук» былі арганізаваныя па некалькіх прычынах: па-першае, для таго, каб тэлегледачы маглі, нарэшце, пазнаёміцца зь беларускай канцэртай выканаўцаў, ацаніць іх майстэрства; па-другое, для саміх выканаўцаў, бо многія зь іх дагэтуль ня маюць прафэсійных video, па-трэцяе, каб вывесьці «ў людзі» маладых выканаўцаў, да якіх з прысутных на канцэрце з пэўнымі заўвагамі можна аднесьці толькі «Kriwi» ды «Mojo Blues». Дарэчы, кіраўнік Дзяржаўнага аркестру М.Фінберг на гэты конт выказаў не зусім зразумелую для ягонага статусу думку пра тое, што беларускія эстрадныя выканаўцы падобныя адно да аднаго, — такім чынам падтрымаўшы акцыю.

У першы дзень канцэртаў на сцэну выходзілі такія прызнаныя калектывы краіны як «Уліс», «Камэрата», струнная група Дзяржаўнага аркестра п/к М.Фінберга. На другі дзень былі выканаўцы іншага жанру: гурт «Mojo Blues», «NRM» і «Kriwi», напрыканцы быў рэпрэзантаваны праект «Народны альбом».

Акцыя сапраўды мелася быць грандыёзнай, але некаторыя тэхнічныя накладкі, у тым ліку і з самым галоўным у назове акцыі — жывым гукам, які пэрыядычна зьмяняў свае частоты ад нізкіх да радыкальна высокіх, — ледзь ня зьвёў усё да чарговага пшыку.

Акцыя прынесла прыемныя нечаканасьці і нават сэнсацыі. Ці не ўпершыню выступіў рок-гурт «Mojo Blues», які аб'яднаў С.Кныша («Bonda»), І.Шэўчыка (ex-»Krama») ды А.Казлоўскага («Zindan»). Хлопцы, як ад іх і чакалі, адыгралі выдатны блюз. Выступ «NRM» чамусьці нагадаў канец 80-х, калі «Мроя» грала канцэрты ў малых, «глухіх» залях на дрэннай апаратуры. Невядома чаму, але на перадапошняй песьні гурта зьнікла электрычнасьць, таму прыйшлося абвесьціць вымушаны перапынак, пасьля якога гук падраўнялі, і слухаць «Песьні пра каханьне» стала лягчэй. «Kriwi», як заўсёды, успрыняліся выдатна, але гук ізноў папсаваў усім нэрвы.

Прэзэнтацыя «Народнага альбому» ў рамках тэлеканалу «Добрай раніцы, Беларусь» сталася іспытам для ўдзельнікаў праекту. Як вядома, гэты альбом канцэптуальна цэласны, таму й псыхалягічна і тэхнічна было складана зрабіць нешта выбранае, як таго вымагала сытуацыя. З другога боку, цяжка было працаваць на публіку, якая мала ведае саміх музыкаў. Але ўдзельнікі з годнасьцю вытрымалі такія складанасьці і даказалі, што «Народны альбом» — альбом для народа і пра народ.

Сяргей Сахараў

Сэмантыка і формы

10 студзеня ў Беларускай акадэміі мастацтваў была праведзеная навукова-практычная канфэрэнцыя «Сэмантыка і формы традыцыйных беларускіх народных мастацтваў ад старажытнасьці да нашых часоў», прысьвечаная памяці выдатнага беларускага этнографа Міхася Раманюка. Канфэрэнцыя стала своеасаблівай прэзэнтацыяй Навукова-дасьледчай лябараторыі беларускага народнага касьцюма і арнамэнта, якую заснаваў Міхась Раманюк і загадчыкам якой быў прызначаны. На жаль, рашэньне гэтае засталося на паперы. Тымчасам 4 верасьня 1997 году Міхася Раманюка ня стала.

За гадзіну да пачатку канфэрэнцыі заля, у якой яна ладзілася, ператварылася ў людзкі мурашнік: навукоўцы і мастакі, госьці. Энэргетыка падзеі, яе духоўна-патрыятычны накал мне нагадалі тыя гадзіны чалавечага ўзрушаньня, якія перажывалі мы на Купальлях у Вязынцы ў 70-я гады, — калі ноч наўскрозь, хай сабе й пад навальнічным дажджом, стаялі людзі плячом да пляча і безь перапынку ад вечара да ўзыходу сонца сьпявалі песьні, чыталі вершы. Гэтак жа потым і ў Заслаўі, калі сьвяточныя карагоды цікавалі сабакамі, а Купальскае вогнішча залівалі вадой з пажарных машын...

Вялікая частка выступоўцаў складалася з паплечнікаў спадара Міхася — тых, з кім ён езьдзіў у свае першыя экспэдыцыі, з кім распачынаў Новую эпоху беларускага народнага касьцюма на прафэсійнай сцэне, з кім побач працаваў у якасьці пэдагога, і іншыя ягоныя аднадумцы, калегі, вучні.

Віктар Шматаў: «... беларускае грамадзтва толькі напачатку асэнсаваньня значнасьці жыцьця і творчасьці Раманюка». За апошнія паўгады сьвет пабачыла вялікая колькасьць артыкулаў, прысьвечаных Раманюку. Але сярод іх адзінкі, у якіх ёсьць спроба грунтоўнага аналізу, ці хаця б пачатковай інвэнтарызацыі навуковага і грамадзянскага ўкладу Міхася Раманюка.

Акрамя Віктара Шматава ў мэмарыяльнай сэкцыі выступілі Адам Мальдзіс («Сьветлая постаць Міхася Раманюка»), Вячаслаў Вайткевіч («Міхась Раманюк — піянэр мэмарыялізацыі мастацтва народнага касьцюма ў энцыкляпэдычнай справе»), Генадзь Сакалоў-Кубай («Праца Міхася Раманюка ў камісіі па сцэнічнаму касьцюму Міністэрства культуры Беларусі») і іншыя навукоўцы і дзеячы беларускай культуры.

Грунтоўнасьць і захапленьне Раманюка справай перадаліся ягоным вучням. Ад іх імя на канфэрэнцыі з дакладамі выступалі старэйшыя выкладчыкі БелАМ Юры Піскун («Палявыя досьледы нацыянальнага касьцюма як мэтад складаньня карціны этнакультурных і мастацкіх асаблівасьцяў лякальных строяў адзеньня ў Беларусі»), Галіна Мяшкова («Асэнсаваньне ролі і значэньне кнігі Міхася Раманюка «Беларускае народнае адзеньне»), Яўген Шунейка («Мастацкае выхаваньне праз далучэньне да народных традыцый»), старэйшы выкладчык Універсытэту культуры Тамара Васюк («Пластыка ганчарных традыцыйных формаў»), а таксама Міхась Баразна («Пераасэнсаваньне традыцыяў беларускага народнага мастацтва ў сучаснай кніжнай графіцы»).

З захапленьнем аўдыторыя заслухала даклады асьпірантаў катэдры Галіны Багданавай «Майстар майстроў (Вобразы народных майстроў у творчасьці Міхася Раманюка)»; Ірыны Каранеўскай «Судачыненьні сэмантыкі дызайну ў творах беларускага народнага мастацтва»; Алены Законьнікавай «Традыцыйны геамэтрычны арнамэнт як знакавая сыстэма сьвядомасьці беларусаў» і Ірыны Мазюк «Існаваньне старадаўніх сьпеўных формаў і праблемы трансляцыі іх у будучыню».

Грунтоўныя даклады прадставілі Ўладзімер Конан («Народнае адзеньне ў кантэксьце прыгожага і камічнага»), Лія Салавей («Традыцыйнае адзеньне ў народнай паэзіі»), Таціяна Ратабыльская («Элемэнты традыцыйнага беларускага мастацтва ў сучаснай тэатральнай практыцы (лён, саломка, выцінанка, батлейка)»), Людміла Дучыц («Старажытны касьцюм Беларусі (па матэрыялах археалягічных дасьледаваньняў)») і Эдвард Зайкоўскі («Балцкія і славянскія элемэнты ў беларускім народным арнамэнце»).

Чыны ўдзел у працы канфэрэнцыі ўзялі мастакі і мастацтвазнаўцы Яўген Кулік, Аляксей Марачкін, Пётра Васілеўскі, Таціяна Гаранская. Яўген Кулік сказаў: «Тое, што зрабіў Міхась Раманюк, заслугоўвае надзвычай высокай адзнакі. Мы, можа быць, надта сьціплыя ў сёньняшніх ацэнках яго дзейнасьці. Але, на мой погляд, сыстэматызацыя калясальнага, сабранага Раманюком матэрыялу, раянаваньне народнай вопраткі, стварэньне карты тыпаў народнага адзеньня беларусаў — ёсьць навуковы і грамадзянскі подзьвіг, унікальная зьява ў нашай культуры.

Міхась Раманюк быў сярод тых мастакоў, дзеячоў навукі і культуры, якія ў 70-я гады аб'ектыўна аказвалі супраціўленьне рэжыму і русыфікацыі. Тыя мерапрыемствы, якія ажыцьцяўляліся, вельмі часта праводзіліся патаемна. Нават сьвяткаванькне Купальля на тыя часы лічылася крамолай. Імпрэзы, якія наладжваліся ў майстэрнях мастакоў, у прыватнасьці, у майстэрні Віктара Маркаўца — сьвяткаваньні дзён памяці Ластоўскага, Луцкевіча, Драздовіча і іншых — не абыходзіліся безь Міхася Раманюка. Ён быў летапісцам гэтых падзеяў. Яго архівы захоўваюць фотаздымкі з гэтых імпрэзаў. І калі прыехаў у Менск з Масквы славуты беларускі гісторык Мікола Ўлашчык, яго сустрэча зь менскімі мастакамі і навукоўцамі адбылася ў старой майстэрні Раманюка ў Ракаўскім прадмесьці».

Вячаслаў Вайткевіч: «Я хацеў бы зазначыць, што рупарам нашага народа напярэдадні стварэньня БНР было менавіта народазнаўства. У 20-30 гады XX ст., як мы ведаем, з народазнаўцамі абышліся вельмі жорстка. Дык менавіта Міхась Фёдаравіч Раманюк па вялікім рахунку зьяўляецца падаўжальнікам традыцыяў народазнаўства як XIX, так і пачатку XX ст., стаўшы буйнейшым народазнаўцам нашай эпохі».

Па выніках работы канфэрэнцыя пастанавіла хадайнічаць аб наданьні лябараторыі імя Міхася Раманюка, стварыць грамадзкую каардынацыйную раду лябараторыі і грамадзкі фонд імя Раманюка, які б знаходзіў сродкі на выданьне падрыхтаваных ім кніг і альбомаў, хадайнічаць перад Міністэрствам культуры аб наданьні майстэрні Раманюка статуса Музэя-майстэрні з адпаведным фінансаваньнем і аб стварэньні рэспубліканскага аргкамітэту сьвяткаваньня 55-гадовага юбілею з дня нараджэньня Раманюка, які адбудзецца 3.01.1999 году, зрабіць такія канфэрэнцыі штогадовымі.

Таціяна Гаранская

Пра унію з дакорам

Уния в документах: Сборник / Сост. В.Теплова, З.Зуева. — Менск: «Лучи Софии», 1997.

Жанр гэтай кнігі пазначаны так: «Рэлігійнае выданьне». А вера справа такая — адныя вераць, другія — не. Якія могуць быць рэцэнзіі? Але кнігу рыхтавалі навукоўцы, супрацоўнікі Беларускага Дзяржаўнага Ўнівэрсытэту, гэта збор дакумэнтальных крыніц XIV-XIX ст. пра гісторыю грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы, таму на гэтую кнігу можна зірнуць і з навуковага пункту гледжаньня.

Увогуле зборнік вызначаецца прыкметамі навуковага выданьня: ёсьць тут і сьпіс дакумэнтаў, археаграфічная прадмова (ананімная), уводны нарыс «Берасьцейская царкоўная унія. Перадгісторыя, прычыны і наступствы» (В.Цярловай), заўвагі, сьпіс выкарыстаных выданьняў, а таксама «слоўнік малакарыстаных словаў і выразаў». Але як маем «рэлігійнае выданьне», відавочна — расейскае праваслаўнае, то гэта адбілася на агульным падборы дакумэнтаў. Яны павінны былі падмацаваць думку, што праваслаўныя пакутавалі за веру, якую ім навязалі звонку, але гістарычная справядлівасьць аднавілася, і унія была скасаваная ў 1839 годзе. Гэтую няхітрую схему мусяць падмацаваць і загалоўкі разьдзелаў: «Ад Крэва да Берасьцейскай царкоўнай уніі», «У уніі», «Да веры быцькоў і дзядоў». Складальнікі зборніка не палічылі патрэбным адшукваць новыя архіўныя крыніцы і скарысталіся з ужо выдадзеных зборнікаў дакумэнтаў, балазе такіх багата. Гэта і «Акты Заходняй Расеі», «Віцебская даўніна», «Зборнік дакумэнтаў, якія высьвятляюць адносіны лаціна-польскай прапаганды да рускай веры і народнасьці» і савецкія зборнікі «Беларусь у эпоху фэадалізму», «Дакумэнты і матэрыялы па гісторыі Беларусі» і іншыя.

Што адразу кідаецца ў вочы пры азнаямленьні з разьдзеламі кнігі — гэта пэрыядызацыя. Папярэдніцай Берасьцейскай царкоўнай уніі складальнікі палічылі Крэўскую унію паміж ВКЛ і Польшчай. У аддаленай гістарычнай пэрспэктыве пэўная сувязь тут ёсьць, але Крэўская унія працягвалася ў Віленска-Радамскай і Мельніцкай уніях, пра якія ані слова. А што датычыць царкоўных уніяў, то і тут няма ніводнага дакумэнта пра Флярэнтыйскую унію 1439 году. Дарэчы, пра Флярэнтыйскі сабор шматкроць успамінаецца і ва ўводным нарысе, і ў самых дакумэнтах, але ў чым там справа, чытач зборніка так і не даведаецца, як, дарэчы, і пра Ліёнскую царкоўную унію 1274 году. Ды й з самой Берасьцейскай уніяй справа не бліскучая. Існуе некалькі дакумэнтаў канца XVI ст., у якіх былі выкладзеныя розныя ўмовы меркаванай уніі. У гэтым зборніку чытач іх не адшукае, як ня знойдзе і дакумэнтальнага тэксту тых умоваў, на якіх былі аб'яднаныя цэрквы. Замест апошняга складальнікі прывялі вялікую цытату з кнігі М.Бантыш-Каменскага «Гістарычная зьвестка» 1795 году. Тое ж самае датычыць акту Крэўскай уніі. Дарэчы, чытач ня знойдзе ў зборніку і актаў трох падзелаў Рэчы Паспалітай, у выніку якіх Беларусь была акупаваная Расейскай імпэрыяй. Зразумела, вялікая тамніца й тое, на якой падставе юрыдычна была зьліквідаваная унія.

Усё ж складальнікі зрабілі вялікую працу па падборцы дакумэнтаў з розных выданьняў. Зразумела, з усімі іх хібамі, бо праверыць гэтыя крыніцы, седзячы ў Менску, немагчыма. У кнізе ёсьць невялікая прадмова, дзе распавядаецца, на якіх археаграфічных прынцыпах надрукаваныя дакумэнты. Памыляецца той, хто думае, што гэтыя прынцыпы высунутыя менавіта для гэтага зборніка. Складальнікі проста ўзялі іх з выданьня 1988 году «Сацыяльна-палітычная барацьба народных мас Беларусі», разам зь дзясяткам дакумэнтаў адтуль. А як дакумэнтаў у разгледанай кнізе каля 200, дык у гэтай прадмове няма зусім ніякай патрэбы. Прасьцей было б напісаць: дакумэнты ў зборніку зьмешчаныя ў такім выглядзе, як былі надрукаваныя 150 або 50 гадоў таму. Кім? Складальнікі пра гэта прамаўчалі. А мы назавем: І.Грыгаровічам, М.Каяловічам, А.Сапуновым, В.Шчарбаковым, К.Кернажыцкім, Дз.Даўгялам, З.Капыскім, Я.Марашам, П.Казлоўскім і інш. Новых дакумэнтаў у зборніку толькі два, яны былі перададзеныя ў распараджэньне складальнікаў У.Соснам. Яны датычаць гвалтоўнага пераводу уніятаў у праваслаўныя. Здаецца, гэта ўсё, што складальнікі палічылі патрэбным сказаць пра гвалт у той справе. Невыпадкова зборнік сканчаецца 1839 годам, калі унія была фармальна ліквідаваная на Полацкім саборы. А былі ж цікавыя падзеі і пазьней. І што значыць загаловак апошняга разьдзелу «Да веры бацькоў і дзядоў»? Калі Беларусь прыняла хрысьціянства, яно яшчэ не было фармальна падзеленае на праваслаўе і каталіцтва. Так што калі б у 1839 годзе беларусы вырашылі вярнуцца да царкоўных парадкаў прадзедаў, яны б мусілі падпарадкоўвацца ці то канстантынопальскаму, ці то рымскаму патрыярху. Працягваючы тэму ўлады, адзначым, што няма ў зборніку дакумэнтаў пра тое, якім чынам праваслаўныя беларусы падпалі пад царкоўную ўладу Маскоўскага патрыярхату.

Зьмешчаны ў кнізе слоўнік састарэлых словаў значна дапаможа чытачу разабрацца ў тэкстах. Там ёсьць нават слова «унія». Яно зьмешчана на вокладцы кнігі і сотні разоў сустракаецца на старонках, і тлумачэньне яго ў канцы выданьня сведчыць пра пачуцьцё гумару ў складальнікаў.

Ці можна зразумець унію з гэтага зборніка? Як гістарычная зьява яна была больш складаная, чым гэта вынікае з кнігі. Быццам бы пра гэты зборнік гаварыў вядомы дзяяч сярэдзіны XIX ст.: «Мы не баімся таго дакору, што зьмешчаныя намі дакумэнты ўсе аднаго роду, што яны падабраныя з наўмыснаю думкаю; такі дакор для нас роўны пахвале. Няхай тыя, якія захочуць абвінаваціць нас у аднабаковасьці, прывядуць нам дакумэнты супрацьлеглай уласьцівасьці і характару». Можа, хто і возьмецца.

Валеры Пазьнякоў

Папраўкі да хрэстаматыі

Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатру і драматургіі. Т. 1. Ад вытокаў — да пачатку XX стагодзьдзя. Укладаньне, рэдакцыя тэкстаў, уступны артыкул і камэнтары А.Сабалеўскага. — Менск: Беларуская навука, 1997

Да хрэстаматыяў мы звычайна ставімся дваіста. З аднаго боку — школьная алергія да нудных савецкіх «клясыкаў» ці па-барбарску пакарабачаных твораў клясыкаў сусьветных. З другога — усьведамленьне хрэстаматыі як кампэндыюму адборнага кшталту шэдэўраў («гэта войдзе ў хрэстаматыі» — як камплімэнт аўтару), ці, калі й не самых шэдэўраў, але твораў тыповых, такіх, што яскрава прадстаўляюць эпоху і ўжо праз гэта застануцца ў памяці нашчадкаў. Для нашае культуры хрэстаматыі адыгрывалі ролю надзвычай важную — акумулюючы тэксты, якія паасобку губляліся ў масе чужога матэрыялу, а сабраныя разам стваралі выразны корпус існай нацыянальнай культуры. У пасьляваеннай савецкай Беларусі «Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры» Коршунава, «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» пры ўсіх сваіх заганах існавалі падобна прыхаваным мінам беларускасьці. Гэтак жа ўспрынялася й «Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі» 1975 году, складзеная прафэсарам Анатолем Сабалеўскім. Тэксты, да таго раскіданыя па шматлікіх і часам рэдкіх выданьнях, па архівах, сталі даступныя разам, і зь іх пачала вымалёўвацца агульная карціна, хай сабе й з лакунамі і надта фрагмэнтарная. Хрэстаматыя на той час у пэўнай ступені выконвала ролю падручніка па гісторыі беларускага тэатру. Падручніка, які не існаваў тады, не існуе па сутнасьці й цяпер (бо нельга ж усур'ёз браць за падручнік «Гісторыю беларускага тэатру» Ул.Няфёда, а трохтамовая калектыўная «Гісторыя» занадта грувасткая для падручніка ды шмат у чым ужо састарэлая). Тады «Хрэстаматыя» (надрукаваная накладам усяго ў тысячу асобнікаў) хутка стала рарытэтам, і я памятаю, як доўга шукаў яе па букіністах на пачатку васьмідзясятых. Ня надта зьменшыла яе значэньне для тых, хто цікавіцца гісторыяй беларускага тэатру, і выданьне яшчэ адной «культавай» кнігі — збору «Беларуская дакастрычніцкая драматургія», складзенага Сяргеем Лаўшуком і надрукаванага ў 1978-м.

Ад зьяўленьня «Хрэстаматыі» прайшло дваццаць сем гадоў, за якія шмат чаго адбылося і зьмянілася ў Беларусі. Нарэшце, дачакаліся мы і другога выданьня, «пашыранага і ўдакладненага», ужо ў трох тамах, праўда, накладам у тую ж самую тысячу асобнікаў, што, напэўна, кампэнсуецца неблагой цаной — 100 тысячаў за адзін першы том — «бедныя студэнты» ўжо на пакупку не кандыдаты. Дзеля адпалохваньня лішняга, выпадковага пакупніка, напэўна, створана і псыхадэлічная бэзава-жоўтая вокладка.

Першы том — гэта ўжо не «дарэвалюцыйны пэрыяд», а «ад вытокаў — да пачатку XX стагодзьдзя», але, гэта значыцца, ўсё роўна «да рэвалюцыі», бо другі том заяўлены на пэрыяд «20-50-х гадоў», а трэці — «з 60-х і да нашага часу». (Шчыра кажучы, маю сумневы — ці нацягваецца за апошнія трыццаць гадоў такая ж «удзельная маса» хрэстаматыйных тэатральных тэкстаў, як за папярэднія чатырыста?) Зь цікавасьцю пачаў я гартаць том, шукаючы «пашырэньняў і ўдакладненьняў». Сапраўды, дабаўлены раней забаронены Францішак Аляхновіч — тры даволі раньнія тэксты (спадзяюся — для яго знойдзецца месца яшчэ і ў другім томе); да тэкстаў Максіма Гарэцкага дададзеныя ўрыўкі з артыкула «Наш тэатр»; нарэшце, дадаўся цэлы разьдзел «Драматургія і тэатр XVIII стагодзьдзя», важная старонка нашай тэатральнай гісторыі, якую большменш уважліва пачалі чытаць толькі ў апошнія два дзесяцігодзьдзі. Але тут, на жаль, маем толькі адзін пункт — дробныя ўрыўкі з «Агаткі» Мацея Радзівіла. У астатнім новы першы том цалкам ідэнтычны першаму тому зь сярэдзіны «эпохі застою». Нават даведачныя артыкульчыкі пры разьдзелах толькі згубілі згадкі пра «СССР» і «вялікую кастрычніцкую рэвалюцыю». Хіба не зьявіліся за амаль трыццаць гадоў новыя публікацыі, ня выплылі зь небыцьця забытыя ймёны й творы, не нарадзіліся новыя канцэпцыі? Можна, вядома, адказаць, што на тое яна й хрэстаматыя, каб рэпрэзэнтаваць вечнае, але ці ўсё «вечнае» ў нашай культуры так стабільна расстаўленае «па палічках», каб нічога ўжо не зварухнуць?

У сярэдзіне сямідзясятых, калі выйшла першае выданьне, большасьць твораў з хрэстаматыі былі маладаступныя. Таму нават ва ўрыўках знаёмства зь імі было «эксклюзыўнай падзеяй». «Навучальны» і «асьветніцкі» характар хрэстаматыі, яе адрасацыя на студэнтаў, «шырокія колы чытачоў» не выклікалі прэтэнзіяў да яе навуковага ўзроўню. Сёньня, калі збораў і перавыданьняў старых тэкстаў стала значна больш, публікацыі ўрыўкаў з «Паўлінкі» ці «Кветкі папараці» можа ўжо і для школьнікаў ня так важныя — можна адаслаць да папулярных больш поўных выданьняў. Калі ж даецца ўсё ж урывак зь вядамай са школы «Пінскае шляхты», ці ня варта хаця б згадаць пра тое, што тэкст яе быў напісаны на палескім дыялекце, а распаўсюджана яна сёньня ў перакладзе. А вось з тою ж «Агаткаю» добра было б пазнаёміць чытача бліжэй — пераклад яе ў «Тэатральнай Беларусі» можна знайсьці ня ў кожнай бібліятэцы. На жаль, школьны тэатар гэтак і застаецца «тэатрам інтэрмэдыяў». З усяе двухвяковай гісторыі гэтай цікавейшай для нашага рэгіёну тэатральнай зьявы увесь час мэханічна выдзіраюцца некалькі інтэрмедыяў, быццам бы адметных «дэмакратычнасьцю» і «беларускамоўнасьцю». А што такім чынам цалкам скажаецца ўяўленьне аб складанай структуры п'есаў, аб правілах і традыцыях гэтага тэатру, зьвязанага і зь сярэднявечным маралітэтам, і са спадчынаю антычнага тэатру, і зь мясцоваю культурай — гэта няважна. Нават наяўнасьць поўнага тэксту «Камэдыі» Марашэўскага гэтае сытуацыі не выпраўляе.

Але, тым ня менш, з удзячнасьцю стаўлю новую «Хрэстаматыю» на сваю тэатральную паліцу і застаюся ў чаканьні — таго, чым парадуюць, альбо зьдзівяць наступныя тамы, а таксама ў чаканьні трэцяга, сапраўды, «папраўленага і дапоўненага» выданьня.

Вацлаў Арэшка

Дух старое дагматыкі

Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасьці да 1861 г. Том 1. — Менск: Беларуская навука, 1997. — 431 с.

Што толькі ні пісалася нядаўна пра зьмярцьвеласьць гістарычнай навукі. Самыя апантаныя называлі яе галоўным ворагам марксісцка-ленінскую дагматыку. Нейкі час думалі — нарэшце згінула нялюбая пачвара, і вось айчынная навука выбілася на шлях уласнага разуменьня сваёй мінуўшчыны. Але вось гэты выразны канон абрыдлай гістарыяграфіі паўстаў з магілы. Ён жыве і без ідэалягічных ідалаў, бо кожны невук разумее, што менавіта мужыцкім мазалём мацаваўся і квітнеў гістарычны краявід. Пахаваны дух дагматыкі ўваскрос разам зь нізрынутымі аўтарытэтамі, пра што сьведчыць выданьне 1-га тому гісторыі беларускага сялянства калектывам навукоўцаў Інстытуту гісторыі нацыянальнай Акадэміі навук. Сярод аўтараў — знаўцы пэўных сюжэтаў гэтай даўніны, апрацаваных у дысэртацыях. Сярод іх і тыя, хто пасьпеў скарэктаваць замшэлыя погляды. Але ж і тыя, і другія па-ранейшаму трымаюцца ў многіх прынцыповых пытаньнях не канкрэтна-гістарычнага грунту, а спадчыны сваіх ідэйных апосталаў.

Возьмем, да прыкладу, разьдзел кнігі, прысьвечаны становішчу сялян пасьля далучэньня Беларусі да Расейскай імпэрыі. У адпаведным месцы сьцьвярджаецца, што гэтая падзея пакончыла з анархіяй Рэчы Паспалітай, якая «тармазіла эканамічнае разьвіцьцё» (стар. 259), што яна «стымулявала рост вытворчасьці». Аднак далей гаворыцца, што бурны росквіт зводзіўся да «імклівага росту таварнасьці панскай гаспадаркі» (стар. 260 і 301) і яе пасьлядоўных посьпехаў за кошт абезьзямельваньня сялян. А зараз паглядзіце ў разьдзел другі, прысьвечаны ўсталяваньню прыгоньніцтва. І там прачытаеце, што ўжо ў XV ст. адбывалася ўцягваньне ў рынак, менавіта заходнеэўрапейскі попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю «стаў галоўным фактарам інтэнсыўнага разьвіцьця панскай гаспадаркі ў форме фальварка» (стар. 71), што з-за гэтай кан'юнктуры «ўнутраны рынак набываў экспартна-імпартныя функцыі» (стар. 59).

Атрымліваецца, што з XV ст. і да 1772 году беларускія фальваркі арыентаваліся на Эўропу, а пасьля рэзка зьмянілі курс на Расею. Прычым, як вынікае з тэксту, Расея апынулася магутным гаспадарчым стымулятарам і моцным спажыўцом прадукцыі. Аўтары даводзяць, што пасьля 1772 г. і да 1861 г. плошча панскіх палеткаў узрасла з 7 да 73 % усіх ворыўных зямель у маёнтках. Аднак «інтэграцыя на ўсерасейскі рынак» ня проста спрэчная. Аўтары нідзе не падаюць лічбаў пра таварныя патокі менавіта ў Расею, з чаго б і вынікала прагрэсіўнае ўцягваньне беларускага рэгіёну ў расейскі рынак. Аўтары не ўдаваліся ў гушчары дакладных доказаў. Яны проста паўтарылі Ф.Энгельса і У.Леніна, якія сфармулявалі тэзу аб экспартнай накіраванасьці панскіх фальваркаў і ў XVI, і ў XIX стагодзьдзях.

У свой час гэтую схему спрабавалі абвергнуць з фактамі ў руках, каб занесьці панскія фальваркі якраз у аванпосты перашкод рыначным сілам, каб шляхам іх падзелу паміж сялянамі якраз стымуляваць росквіт кан'юнктуры. Але згаданая схема пазбаўляе неабходнасьці патрэбнага аналізу, бо яна — канон. І аўтарам ніяк не ўдаецца вызваліцца з дагматычных путаў. Да прыкладу, на іх меркаваньне, падзелы Рэчы Паспалітай «зьнішчылі... бескантрольную ўладу буйных зямельных уласьнікаў». Але ж далей гаворыцца, што ў Расейскай імпэрыі «як і раней... самавольства памешчыкаў нічым не абмяжоўвалася» (стар. 262). Адна рука піша, што напярэдадні далучэньня да Расеі пераважала фальварачна-паншчынная сыстэма эксплюатацыі сялян (стар.208), а другая піша пра перавагу зьмяшанай рэнты пасьля 1772 году, «як і ў былыя часы» (стар. 301). Адзін і той аўтар сьцьвярджае, што менавіта пад расейскім панаваньнем у першай палове XIX ст. паншчына набывае шырокае распаўсюджаньне, а потым заключае, што «захавалася тая бессыстэмнасьць у вызначэньні павіннасьцяў, якая існавала... да канца XVIII ст.» (стар. 303).

Ня трэба кліць з аўтараў з прычыны адсутнасьці ў іх канцэптуальнага адзінства. Наадварот, яно прасочваецца шмат у чым. Добра, што рэдактары тому прагледзелі падобныя замшэлыя стэрэатыпы, як некалі царскі цэнзар з разьліку на недасьведчаную публіку прапусьціў небясьпечны «Капітал» К.Маркса. Нядрэнна, што цэнзарскія нажніцы не закранулі аўтарскіх пазыцыяў, каб атрымаць «адзіны падыход» да праблем. Уніклівы чытач сам знойдзе часам проста недарэчныя супадзеньні і паўтарэньні, якія не на карысьць выразнага разуменьня гістарычных лёсаў беларускага сялянства. Сэнс у іншым. Выданьне валялася на паліцах выдавецтва, здаецца, з 1991 году. З таго моманту разуменьне гістарычнага шляху беларускай вёскі працягвае абапірацца на марксісцка-ленінскія мыліцы. На падыходзе — другі том, дзе пойдзе гаворка пра жыцьцё сялян пасьля 1861 і да 1917 году. Можа, і зараз нас узрадуюць абгрунтаваньнем непазьбежнасьці сацыялістычнае рэвалюцыі. Хіба і наступным разам сялянскі лёс будзе вызначацца не жыцьцёвымі рэаліямі, а кан'юнктурнымі клішэ?

Яўген Анішчанка

Ровар для беларускай культуры



Made in Belarus. Белорусские застольные песни в танцевальной обработке. Byelorussian Disco. — Менск: Vigma, 1998.

Адна з мараў беларускае культуры — пра масавасьць. У сытуацыі, калі большасьцю спажыўцоў мас-культуры сама беларуская культура разглядаецца як архаізм са сьпевамі бабулек, мары такога кшталту выглядаюць досыць прывіднымі. Але калі дэфініцыі «беларуская культура» і «фальклёр» (г.зн. народная творчасьць) разглядаюцца амаль як тоесныя, то чаму б гэта ня выкарыстаць як падмурак для стварэньня народнай (мас) культуры. Здаецца, прыкладна так маглі разважаць аўтары праекту «Made in Belarus».

Адразу зазначым, што ідэя стварэньня на аснове народных песень сучасных кампазыцыяў выкарыстоўваецца ўжо некалькі гадоў ва Ўкраіне і ў Расеі: апошняя паднесла сьвету такія «шэдэўры» як «Золотое кольцо» і «Балаган Ltd.», якія, дзякуючы сваім вычварным формам перапевак, лічацца ўзорамі сучаснага расейскага поп-фальклёру; Украіна ў гэтым сэнсе стаіць да нас бліжэй: сьвет пабачыў аж тры часткі праекту... «Made in Ukraina», да якога паводле стылю і зьместу вельмі падобная «Made in Belarus».

Але зьвернемся да «Белорусских застольных песен в танцевальной обработке» непасрэдна. Першае, што кідаецца ў вочы — вокладка альбому. Тут пануе трасянка. Магчыма — яшчэ адзін сродак для дасягненьня масавасьці.

Канцэпцыя песень вытрымліваецца амаль бездакорна. Сабраныя і апрацаваныя тут кампазыцыі вядомыя ўсім: «Ты ж мяне падманула», «Цьвіце ціран», «Ой, ляцелі гусі з броду», «Каля млыну» і да т.п. Здаецца, звычайны рэпэртуар якога-небудзь народнага хору, касэту якога можна набыць ці проста перапісаць з бэтэшных «Вячорак». Але менавіта тут пачынае працаваць азначэньне «масавасьць»: ніхто ў нас яшчэ не дадумаўся перакласьці ў сучасныя стылёвыя плыні народныя песьні так, каб гэта было цікава для ўсіх — ад навучэнца ПТВ да мэханіка з Трактарнага. А як жа «Палац»? «Палац», хочаце ці не, усё ж такі занадта інтэлектуальная каманда, ня ўсе яе песьні можна слухаць на працягу вечара ў цёплай кампаніі. Чаго ня скажаш пра «Беларускае дыска», дзе сьвядома атаясамліваюцца «народныя» і «застольныя» песьні як формы масавасьці: адпаведныя расейскія праекты ўзялі НАШУЮ аўдыторыю менавіта такім чынам. Дык ці варта было б прыдумляць ровар, калі можна ўзяць заежджаную, але прыдатную мадэль.

Чаму «амаль бездакорна»? Таму што, колькі ні думаў, ня змог сабе патлумачыць, як у разрад застольных трапіла калядная «Ціханая ноч», дарэчы, на вокладцы не згаданая.

Выснова, якую можна зрабіць пасьля праслухоўваньня й разгляданьня касэты — да беларускасьці пачынаюць праяўляць камэрцыйную цікавасьць «масавікі». Як да канкурэнтаздольнага прадукту.

Сяргей Сахараў

памятаючы пра цяпло рэчаў, якія згарэлі ў крэматорыях КГБ, загінулі на этапах, зьнішчаныя пры шмонах, —
кнігі,
вершы,
лісты...

З прысуду Віцебскага абласнога суда:

«Рэчавыя доказы:
(...) Друкавальную машынку «Любава», нож у скураных похвах, дзягу кустарнага вырабу, нунчакі, 3 агульныя сшыткі вярнуць Адмовічу С.Г. (...)».

Славамір Адамовіч

ВЯРТАНЬНЕ РЭЧАЎ

ЭСЭ

Трэба сказаць, што мне, як я сам пра сябе думаю, пэданту і акура тысту, зусім не спадабалася не ахайная работа віцебскага судзьдзі Гурко. Мне проста крыўдна, што ў судовым працэсе па справе №182 былі дапушчаныя грубыя памылкі і недаравальныя недакладнасьці. У выніку мне прыйшлося сварыцца з сакратаркай канцылярыі па крымінальных справах Віцебскага аблсуда, каб вярнуць сабе ня толькі 3 агульныя сшыткі, але й адзін штодзённік у чорнай вокладцы, выдадзены мне ў рэдакцыі «НН» спадаром Алегам Дзярновічам за некалькі сутак да арышту; адну запісную кніжку ў шэрай вокладцы; ваенны білет у адным экзэмпляры бяз вокладкі (дзе падзелася вокладка, мне не прыгадваецца, таму ўзьнікаюць пэўныя нядобрыя думкі наконт КГБ); два ключы (ад уваходных дзьвярэй у блёк і ад дзьвярэй майго вясёлага пакойчыка) з мэталічнай жалязячкай фабрычнай вытворчасьці, якою зручна адкаркоўваць піўныя бутэлькі; філязофскі сшытак беларуса Вітольда Дзісько, забітага спэцслужбамі ў 1964-м; тры фотаздымкі, перададзеныя мне, як і сшытак, ягонай сястрой Геленай, на якіх Вітольд сфатаграфаваўся ў малым веку разам з братам, адзін юнаком і з бацькамі, братам і дзьвюма сёстрамі; капэрта, у якой быў ліст зь Вільні ад Тарэсы Іванаўскайтэ, колішняй адзінай сяброўкі Вітольда Д. (ліст прапаў альбо, дазволю сабе так думаць, зьнішчаны сьвядома ці ў выніку злачыннай халатнасьці, што вымагае перасьледу паводле артыкула 168 Крымінальнага кодэксу РБ (невыкананьне альбо неналежнае выкананьне службовай асобай ускладзеных на яе службовых абавязкаў у выніку халатных адносінаў да іх выкананьня, калі гэта пацягнула па неасьцярожнасьці прычыненьне асабліва буйных стратаў ці істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзянаў альбо дзяржаўным і грамадзкім інтарэсам, — караецца пазбаўленьнем волі на тэрмін да трох гадоў альбо папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, альбо штрафам, альбо звальненьнем са службы)). Прыйшлося таксама адваёўваць у сакратаркі тры зборнікі ўласных вершаў: «Кальварыйскія клёны» (1990), «Зямля Ханаан» (1993) і «Зваротныя правакацыі» (1994).

Няхай даруюць мне пільныя чытачы некаторую таўталягічнасьць фразы, але рэч палягае ў тым, што вышэйназваныя асабістыя рэчы судзьдзя Гурко не назваў у пераліку тых, якія павінны былі вярнуць мне згодна з прысудам. На падставе гэтай халатнай памылкі сакратарка канцылярыі і не вяртала мне маёй дробнай маёмасьці.

Карцінка выглядала досыць міла. Крываватай з вока ды худаватай з костачкі, судовай дамачцы, як мне здалося, было прыемна дражніць мяне сваімі чыноўніцкімі штучкамі. Вось яна аддала гаспадару тры сшыткі й запатрабавала расьпіску (скінула старое трусінае футра й патрабуе з мужчыны, які выпадкова ўбачыў гэтую працэдуру, сто даляраў за прагляд). Я, вядома, не сьпяшаўся расьпісвацца, а папрасіў заадно вярнуць і ключы ад хаты, і ваенны білет (я даражу двума гадамі службы ў савецкім войску, як дзесяцьцю месяцамі адсідкі), і іншыя дарагія мне рэчы. Тады дамачка пачала распранацца далей. Яна дастала зь нетраў канцылярыі ключыкі і паклала перада мною на стойку (амаль як у бары). Гэтае дзеяньне лепш за ўсё параўнаць з тым, як жанчына здымае кліпсы перш чым прыняць гарызантальнае становішча. Потым сакратарка вымкнула з шуфляды мой чорны нататнік (павольна спаўзла долу чорная сынтэтычная камбінацыя, горкая на смак, калі паспрабаваць яе на зуб), потым тры зборнікі вершаў (рассыпаліся пэрлямутравыя каралі), пустую капэрту і тры чорна-белыя фатаграфіі (зьняла чорны сынтэтычны станік і чорныя панталёнчыкі з аборкаю). Паказаць паказала, але не аддала. Бессэнсоўна было працягваць сварку. Прыйшлося чакаць судзьдзю. Зьявіўся грамадзянін Гурко, забраў у сакратаркі рэчы і павёў мяне ў свой кабінет, дзе я напісаў расьпіску яму асабіста. Судзьдзя быў таксама настолькі мілы, што папрасіў у мяне на памяць зборнік вершаў. Я падпісаў яму «Зямлю Ханаан». Заўважце, аднак, што ў расьпісцы я паказаў, нібы атрымаў на рукі сярод іншага тры кніжкі вершаў, хоць у сапраўднасьці толькі дзьве, бо адну пакінуў судзьдзі «на доўгую памяць пра наш агульны працэс».

Вяртаньне рэчаў з сэйфаў і шуфлядаў КГБ і судоў — як вяртаньне жонкі ў сям'ю. Праўда, у палюбоўніка засталіся некаторыя жаночыя «дробязі» (нумары «НН», копіі зваротаў грамадзян, зварот расейскага Пэн-цэнтру, нумар «НН» з артыкулам пра расейскі фашызм у Беларусі, перададзены судзьдзі Гурко маім адвакатам, прыватны ліст на грамадзка значную тэму).

Рэчы зь Віцебскага аблсуда я забіраў 19 сьнежня 1997 году. Каля Сіняга дому, што насупраць ювэлірнай крамы, незнаёмец разам з газэтай прапанаваў мне некалькі лістовак са зваротам да жыхароў Віцебска, падпісаных групай вызвольнага руху «Рубон». Лістоўкі заклікалі вучыцца ваеннай справе, набываць адпаведны рыштунак, пляны дысьлякацыі спэцпадразьдзяленьняў, складаць сьпісы акупантаў. Віцебская група «Рубон» абяцае пакараць дэпутатаў-калябарантаў: намесьніка начальніка УКГБ па Віцебскай вобласьці Бурака, былога прадстаўніка ППРБ на Віцебшчыне Бялова, былога старшыню Віцебскага абласнога гаспадарчага суда Аляксандрава, старшыню аблвыканкама Ўладзімера Андрэйчанку, а таксама Гарбунова і Гаварушкіна. Цяпер аўтараў гэтае лістовачкі шукае сьледчы УКГБ нехта Музычэнка, з нагоды чаго не магу ня выказаць яму мае спачуваньні. Дарэчы, таварыш сьледчы мог бы заадно заняцца й пошукамі майго ліста, ад якога засталася адна капэрта.

22 сакавіка 1996 году ў маім пакойчыку трое ў цывільным у прысутнасьці двох панятых зрабілі вобшук. 22 сьнежня 1997 году ў 10 гадзін 30 хвілін я зайшоў у галоўны будынак КГБ РБ, каб забраць друкарку, нунчакі, нож і дзягу-ланцуг. Дзяжурны прапаршчык, да якога я зьвярнуўся, перадаў інфармацыю па інстанцыі і папрасіў пачакаць. Мне падалося, што быў гэта той самы прапар-баптыст, які падарыў біблію майму падзельніку Барысу Ханонавічу, калі той прыяжджаў забіраць свой кампутар. А яшчэ кажуць, што КГБ РБ не перажывае ніякіх істотных зьменаў. Вось жа, аказваецца, ніжэйшаму зьвяну супрацоўнікаў КГБ дазваляецца цяпер быць вернікамі хрысьціянскай ідэі, чытаць на рабоце біблію і нават распаўсюджваць яе сярод цывільных грамадзянаў, якія наведваюць камітэцкае бюро пропускаў.

Хвілін праз дваццаць пасьля званка дзяжурнага зьявіўся малады чалавек. У правай руцэ ён трымаў мой друкавальны апарат у чорным футарале, у левай — пакет з маімі жалязячкамі. Нас прапусьцілі ў асобны пакой, дзе мы зь незнаёмцам заняліся высьвятленьнем сапраўднасьці халоднай зброі і друкаркі. Зьняўшы верхнюю частку футарала, я праверыў работу клявіятуры і ход карэткі. Заводзкі нумар маёй «Любавачкі» адпавядаў лічбе «567299», што мяне, безумоўна, не магло не задаволіць. Але, бадай, зь яшчэ большай прыемнасьцю, зь яшчэ большым аўтарскім захапленьнем я атрымаў назад паляўнічы нож, дзьве мэталічныя трубкі, злучаныя мэталічным жа ланцужком, і дзягу-ланцуг са сьвінцовай спражкай. Гэтыя рэчы былі мне дарагія менавіта як зброя. І я не праміну скарыстаць яе, калі ўласным жыцьцю, здароўю альбо чалавечай годнасьці, ці маіх блізкіх, ці маіх сяброў, ці проста незнаёмага грамадзяніна, будзе пагражаць небясьпека з боку каго б там ні было. Зь ня меншай энэргіяй, з пранізьлівай жарсьцю, з глыбокім пачуцьцём любові да жыцьця й жывога я паласну па мускульным панцыры ворага маім сьцізорычкам, набытым у 1995-м за 70 тысячаў беларускіх рубельчыкаў, на лязе якога зьбіраецца скочыць прыгожы зьвер зь сямейства кашэчых. Будзь пэўны ты, сын валачашчай сукі, што я зраблю гэта зь пераможным клічам: «За зьнявагу нашай Любові!» Я зраблю гэта, як раблю мае радкі: рэзка, упэўнена, зь яснай галавою, гарачым сэрцам, зафіксаваўшы сябе паміж духам і воляй. Зраблю гэта як найлепшы ў сваім жыцьці верш...

... Рэчы вярнуліся да свайго гаспадара, вытрываўшы ледзь не двухгадовую няволю ў сэйфах судовых канцылярыяў і сьледчых кабінэтаў. Там яны набылі асаблівы гарт і энэргію, мае рэчы. Цяпер яны дадуць мне яшчэ больш сілы, яшчэ больш асалоды: гарачае жалеза; чульлівая сталь; крыху імпульсыўная, але ўпэўненая ў галоўным друкарка «Любава»; капрызьлівыя зборнікі вершаў; стажыльныя дыярыюшы з памяцьцю пра пахі жыцьця і сьмерці; канвэрт, у якім сьпіць наша надзея; ключы ад дзьвярэй, якіх больш няма; штодзённік на 1996-ы год з так і незапоўненымі старонкамі і самотным нумарам 2-29-92-99 «тэлефона даверу» КГБ... Дарэчы, як думаецце, сябры, можа набраць нумарок, падтрымаць мужычкоў хоць бы маральна, а заадно нагадаць, што, сьціснуўшы спружыну, трэба яе трымаць, каб не адскочыла ў зубы. Але ж утрымліваць цяжэй, чымся аднойчы сьціснуць. Тут як з жанчынай: узяць можна толькі на імгненьне, потым у мужычка настае абавязковы момант рэляксацыі, а партнэрка толькі ўвайшла ў смак...

Люблю мае некалі зьняволеныя рэчы. Мы цяпер ізноў разам, у кантэксьце ўмоўнай свабоды, і мусім працягваць выкананьне нашых задач. Каб нож не сумаваў, калі гаспадар выходзіць у горад, я купіў майму дружку ў якасьці суседа забранзавелы цяжкі падсьвечнік на чатыры пэрсоны. Калі мне не спадабаецца фізіяномія судовага выканаўцы, які сьпеліць надзею спагнаць зь мяне 537 тысяч рублёў на карысьць НДІ крыміналістыкі, г.зн. за экспэртызу рэчаў, якія мне вярнулі згодна апраўдальнага прысуду ў частцы артыкула 213, я магу вырашыць праблему і з дапамогаю новага сябра сям'і. А каб не было сумна маім «Кальварыйскім клёнам», якія аўтар некалі падпісаў сваёй гіпатэтычнай нявесьце, але якія трапілі ня ў ейныя ўсюдыісныя ручкі, а ў куксы сьледчага Кукольчыка, я выдаў пяты зборнічак, складзены зь вершаў, напісаных за кратамі, і назваў яго «Сьпіраль Бруна».

Рэчы вярнуліся і занялі свае ганаровыя месцы сярод разумных кніг і цёплага антыкварыяту. Вось дагістарычны прас цёткі Адэлі з Камарова і прас-параплаў маёй бабулі Грасільды мірна, як і належыць у такім паважным веку, сьпяць над фаліянтамі БелСЭ. А вось пляшываму хлебнаму пэдэрасту, зробленаму сяржанцікам тэрміновай службы ў 9-й камэры «амэрыканкі», не пашанцавала. Кожную ноч, калі я адкладаю ўбок асадку і засынаю на матрацы Валянціны, засьцеленым прасьцірадламі, якія вымыла перад самым вяртаньнем мужа любка Ірына, мае рэчы-зэкі ставяць пляшыўца ў стартавую позу і даюць высьпятка, прыгаворваючы:

«За маму, за тату,
за лысых пакрыўджаных
і за патлатых,
за Беларусь-Краіну,
за крывіцкія хаты,
за сына Янку, за дачку Паўліну,
за турэмныя краты,
за магільную гліну,
за тое, што не ўтапілі цябе малога,
твой гэта цяпер крыж,
вечная табе дарога.
Ідзі і нясі!»

***

Няма чаго варажыць-кумекаць, нашыя рэчы перажывуць нас. Калі маладая жоначка народзіць дачушку, дачка стане захавальніцай рэпрэсаваных рэчаў. Так, ва ўсялякім разе, хочацца думаць.

***

Нашыя рэчы — гэта другая рэальнасьць, паралельны сьвет. Нож з рукаяткай вядомы не адну тысячу гадоў. Гэты факт робіць яго прадметам сусьветнай культуры. Бытавы электрамлын на культурны кантэкст прэтэндаваць ужо не рызыкуе. Пэрманэнтная зьмена вобразаў (мадэлі А, Б, В, Г, Д; А1, Б1, В1, Г1, Д1 і так далей і далей) напаўняе яго часовай істотнасьцю прадмета цывілізацыі, і толькі.

Рэчы, як і людзі, аб'ектыўна і пастаянна палярызуюцца: ёсьць рэчы (і людзі) культуры (духу), і рэчы (людзі) цывілізацыі (функцыянальнага мінімалізму і самаўтылізацыі без захаваньня гістарычнай і генэтычнай памяці).

Рэчы культуры нельга зьнішчыць так, каб не засталося сьлядоў. Іх нельга арыштаваць, пасадзіць, схаваць, ні аддаць, выкінуць, тым больш яны не дазваляюць пра сябе забыцца. Гінуць салдаты, але застаюцца мэдальёны. Плавяцца мэдальёны — застаюцца медныя цьвікі з падэшваў салдацкіх ботаў.

Рэчы культуры растуць з культурнай глебы, як растуць камяні на беларускіх сельгаспалетках. Рэчы культуры будуць заўсёды вяртацца да чалавечага цяпла. Тэмпэратура загартаванай сталі — 36,6°. Ужо заўтра Інтэрнэт маральна састарэе, перастане быць актуальным нават для цывілізацыі постмадэрнізму, а трыццацігадовы пераросток страціць цікавасьць да яго, як першаклясьнік да пясочніцы.

Інтэрнэт, калі мы ўжо завялі размову пра гэтую электронную субстанцыю, можа распаўсюджваць па сьвеце інфармацыю пра беларускую газэту «Свабода», але ніколі не сфармулюе кардынальнага адчуваньня свабоднай рэальнасьці, тым болей не навучыць не баяцца свабоды як жыцьця, адрозьніваючы яго ад існаваньня як цяжкай неабходнасьці, дадзенай пры нараджэньні. Аднак жа, калі «высокія тэхналёгіі» аднойчы ізноў вернуць чалавека да першабытнай памяці, зямлю яму прыйдзецца калупаць не кампутарам «Вист», а ўсё тым жа каменным, бронзавым ці жалезным заступам. Заступ дасьць грунт пад нагамі, зьвяжа чалавека з глебай. Меч і крыж паклічуць на пошукі Грааля. Усё паўторыцца, магчыма.

... І вернуцца рэчы.

1998, студзень

ІНФАРМАТАР

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Добры маг дапаможа студэнтам здаць на «выдатна» ўсялякія апытаньні, залікі, іспыты. Кошт маленькі. Панкоў Міхась. Тэл.: 254-48-74

Беларускі грамадзкі дзеяч шукае сяброўку, беларуску (да 35 гадоў). Шкодных звычак ня маю, здаровы. Люблю музыку. Валеры. 220141, Менск, а/с 93

Набуду кнігу О.Шутова «Психоистория: школы и методы». Тэл.: 263-71-84

Зьбіраю беларускія значкі і мэдалі. Шукаю значкі дэпутатаў Вярхоўнага Савету БССР і Рэспублікі Беларусь. Прапаную часопіс «Пралескі» (Вільня, №3 сакавік 1936 г., №4 красавік 1935 г.) 211030, Ворша, вул. Флёрава, д. 76 кв. 16. Тэл.: 4-80-34. Алесь Сярожкін

Віншую А.Далідовіча з 16-годзьдзем. Алена

Шчыра віншую Аляксандра Далідовіча з 16-годзьдзем. Жадаю самага найлепшага й зычу вырасьці сапраўдным беларусам. Андрэй

Віншую Аляксандра Далідовіча з днём нараджэньня. Воля

Стаматалягічныя паслугі. Замаўляць праз тэл.: 214-87-39, 249-57-55. Таціяна Кійко

Куплю выданьні паэмы «Тарас на Парнасе» да 1982 г. Леанід. 8-239-23842 пасьля 17 гадзінаў

Шукаю матэрыялы, крытычныя артыкулы, што датычацца паэм XIX стагодзьдзя. Леанід, 8-239-23842 пасьля 17 гадзінаў

Куплю ангельска-беларускі слоўнік. Пётар. Тэл. (прац.): 223-69-49 (з 8.30 да 12.30 і з 14.15 да 17.15) акрамя суботы і нядзелі

Ангельская, баўгарская, беларуская, польская мовы: пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальныя заняткі. Тэл.: 221-23-68

Віншую Таціяну з Даўгабродзкай зь Імянінамі ды Народзінамі! Мікола з Магілёва

Запрашаем да згуртаваньня ліцьвінаў, прыхільнікаў манархіі. ВКЛ — наша Бацькаўшчына! 246012, Гомель, а/с 124

Zaprasajem prychilnikau manarchii. 246012, Homel, a/s 124

Тэрмінова набуду паштоўкі зь беларускай сымболікай (да 100 штук). 212001, Магілёў, Бялінскага, 22-13. Тэл.: 21-30-35, Аляксей

Створым беларускамоўную BBS у Менску, запоўнім яе інфармацыяй! Дапамажыце. E-mail: vics@null.net; FIDO: 2:450/77.12

Гурток «Спадчына» шукае сяброў. Пішыце нам: 221160, Жодзіна, СШ №4. Згрундо І.Г.

Праца ў хатніх умовах. Добры заробак. 2 капэрты, 1 са зв. адр. 211440, Наваполацак, вул. Я.Коласа, 36-49. Ірына

Віншую Лявона Вашко — ляўрэата «Глінянага Вялеса-97» за кнігу апавяданьняў «Паэты-цары». Алесь Аркуш

«Малады Фронт» пачаў выпуск сваёй газэты. Жадальнікі могуць яе набыць шточацьвер з 18 гадзіны на Ўправе БНФ: вул. В.Харужай, 8

Беларускія запісы, значкі, плякаты гуртоў можна набыць: у Менску — крама D.Shop (вул.В.Харужай, 19) ці замовіць па тэл.: 231-04-08 і 249-08-88, Віталь; у Маладэчне — шапік ТБМ і праз тэл.: 5-37-69; у Магілёве праз тэл.: 41-36-56, Ала; у Пінску праз тэл.: 33-84-91, Ганна; у Горадні праз тэл.: 2-10-54, Алесь

Калі ты хочаш, каб твой любімы беларускі гурт прагучаў на «Радыё Рокс», дасылай свае заяўкі на адрас: 220002, Менск, Старажоўская, 8а. «Радыё Рокс», «Мьюзыкбокс»

Грамадзянін!

60 гадоў таму 10 лютага 1938 году а 15-й гадзіне паводле пастановы тройкі НКВД Смаленскай вобласьці быў расстраляны Наш Пісьменьнік

МАКСІМ ГАРЭЦКІ

10 лютага 1998 году а 15-й гадзіне ў Знак Памяці група ініцыятараў зьбіраецца ля помніка Максіму Гарэцкаму, што на рагу Пляца Волі і вуліцы Койданаўскай, моўчкі, безь непатрэбных словаў і мітынгаў, ускласьці кветкі жалобы.

ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ ГЕРОЯМ!
ГАНЬБА КАТАМ!

Арганізацыя шукае спонсараў для арганізацыі канцэртаў беларускіх гуртоў, выданьня касэт. Тэл.: 213-50-41, Сяргей

Ты захапляесься беларускім рокам? Але ў цябе няма сяброў? Дасылай свае абвесткі ў «Музычную газэту», «Ніякіну», «Нашу Ніву», «Пагоню» і сябры ў цябе зьявяцца

Жадальнікі замовіць фільм «Звычайны прэзыдэнт» могуць дасылаць свае заяўкі на адрас: 220093, Менск, пр. Ракасоўскага, д.60, к. 1, кв. 299. Іне

Філялёгія (беларуская, польская, расейская мовы), кампутар, шукаю працу на 1/2 дні. Выдавецтвы і мас-мэдыя. 220015, Менск, а/с 124

Шукаю працу, зьвязаную зь перакладамі. Польская, беларуская, расейская, пісьмовая нямецкая, кампутар, Internet, з/п. 220015, Менск, а/с 124

Праца ў хатніх умовах — 8 відаў. Прыбытак ад 2 млн. рбл. на месяц. Ад вас — капэрта са зв/а і купон бясплатнай абвесткі. 246012, Гомель, а/с 143

Прыхільнікі клясычнага й беларускага рок-н-ролу, адгукніцеся. Я чакаю! 224022, Берасьце, Суворава 96-40. Тэл.: (8-0162) 43-12-30

Шукаем беларускамоўныя асяродкі для супрацоўніцтва ў Менску, асабліва ў Заводзкім раёне. Тэл.: 240-06-87 (Андрэй), 240-65-82 (Аляксей)

Куплю энцыкляпэдыі: «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», «Архітэктура Беларусі». Тэл.: 220-90-27, Алесь

Фонд «Наша Ніва» купіць былое ў карыстаньні вінтавое крэсла. Тэл.: 231-04-08 (пасьля 12.00)

8 лютага ў РДК Вэтэранаў (вул. Я.Купалы 21) адбудзецца канцэрт «Землякі» з удзелам беларускіх бардаў Эдуарда Акуліна, Уладзімера Клімовіча і паэтэсы Натальлі Хадкевіч. Пачатак а 19 гадзіне

КЛЮБ

Археалягічная культура

З 20 лістапада 1997 году клюб Археалягічнай культуры пачаў свой 3-ці сэзон дзейнасьці. На зборы сяброў клюбу быў прыняты плян тэматычных паседжаньняў. Асноўныя прыярытэты дзейнасьці клюба ў 1998 годзе будуць наступныя:

– досьвед археалягічных разьведак;
– адзначэньне археалягічных датаў і юбілеяў;
– стварэньне археалягічнай маладзёвай субкультуры.

Прыкладны плян паседжаньняў:
5.02.98. Індаэўрапейцы. Вытокі (відэапраграмы).
12.02.98. Індаэўрапейцы. Пошукі сусьвету (відэапраграмы).
19.02.98. Археалягічныя разьведкі на сакральных помніках.
26.02.98. Праблема балтаў і славян у археалёгіі.
5.03.98. Жанчыны ў археалёгіі.
12.03.98. Археалягічныя разьведкі на помніках раньняга сярэднявечча.
19.03.98. Археалягічнае вывучэньне позьнесярэднявечнай фартыфікацыі.
26.03.98. Ваенная археалёгія XX-га стагодзьдзя. Пэрспэктывы і праблемы.
2.04.98. Падрыхтоўка да сьвята Цэнтру Эўропы.
5.04.98. Сьвята Цэнтру Эўропы. Агляд усіх археалягічных сілаў.
9.04.98. Закрыцьцё 3-га сэзону дзейнасьці клюбу «Археалягічная культура».
15.04.98. Адкрыцьцё археалягічнага сэзону.

У гэты плян будуць уносіцца зьмены. Вылучаная тматыка будзе дапаўняцца. Наведваньне паседжаньняў клюбу вольнае і не патрабуе ніякіх фармальнасьцяў.

Паседжаньні клюбу адбываюцца:
Менск, вул. Акадэмічная (да 1998 году — вуліца Ф.Скарыны), дом 3, пакой 40.
Тэл. 268-45-80, зьвяртацца да Марата Клімава.

Выстава «Польская картаграфія»

Польскі інстытут паведамляе, што з 29 студзеня па 10 лютага 1998 году ў лекцыйнай зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) адбудзецца выстава «Польская картаграфія». Яе экспанаты — атлясы, карты і г.д. — па заканчэньні выставы будуць перададзеныя фондам «Дапамогі палякам на ўсходзе» Нацыянальнай бібліятэцы. Выстава працуе з 10 да 18 гадзінаў. Арганізатары выставы: НББ, Польскі інстытут у Менску. Тэлефон для даведак: 233-25-16. Дырэктар Польскага інстытуту — Томаш Нягодзіш.

ПОЛЬСКАЯ КАРТАГРАФІЯ

Першую геаграфічную інфармацыю пра польскія землі мы знаходзім у Пталемея ў 2 стагодзьдзі да нашай эры, і тычылася гэтая інфармацыя пасяленьня Calisia (Каліша). Самая старая зь вядомых сёньня картаў, распрацаваная й створаная ў Польшчы, была выкананая Бэрнардам Вапоўскім ў 1526 годзе.

Славутымі дасягненьнямі польскай картаграфіі зьяўляюцца: так званая «Інтэнданцкая карта» Польскага Каралеўства, падрыхтаваная ў 1815-1830 г., Геаграфічна-статыстычны атляс Польшчы Эўгеніюша Ромэра 1916 году, а таксама распрацаваная ў 1918-1939 г. Вайсковым геаграфічным інстытутам карта краіны ў маштабе 1:100 000. Выданьне гэтай карты лічыцца адным з найлепшых у картаграфічным сьвеце.

Пасьля Другой сусьветнай вайны польская картаграфія была падпарадкаваная вайсковым патрэбам. Для цывільных патрэбаў выдаваліся толькі спрошчаныя карты. Маладаступнымі былі карты іншых краін і іншых частак сьвету. У апошнія некалькі гадоў польскі чытач мае магчымасьць выбіраць сярод соцень новых картаў розных рэгіёнаў Польшчы і Эўропы, выкананых у самых розных маштабах і з рознымі малюнкамі. Надзвычай дынамічна пачала разьвівацца ўся картаграфічная «прамысловасьць» па выданьні картаў турыстычных раёнаў і эўрапейскіх сталіц, разам з суправаджальнымі да іх даведнікамі. Зьявілася некалькі выдавецтваў, якія спэцыялізуюцца на картаграфіі й выданьні падобных даведнікаў. Своеасаблівым «вынікам дзейнасьці» сучаснай польскай картаграфіі зьяўляецца Атляс Рэспублікі Польшчы 1993 году, падрыхтаваны паводле абноўленага Нацыянальнага атлясу Польшчы Інстытуту геаграфіі Польскай акадэміі навук, праца над якім закончылася ў 1978 годзе.

КУПОН Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71



Каб замовіць новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» ўказаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

КНІП - ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	60.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	16.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Ё.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнічак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	15.000
45	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
46	Новы Запавет.	65.000	16.000
47	Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура.	105.000	15.000
48	А Лукашук.«За кіпучай чэкісцкай работай»	50.000	12.000
49	Канвэер сьмерці	200.000	20.000

ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА

1	Кася ў школцы.	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

КАСЭТЫ - ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 42.000 + 7.000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. ŁaŁaŁaŁa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Торнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Торнадо. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Сяўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндан. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Галуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галюцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)
Кардон. Радыяцыя
Мроя. Дваццаць восьмая зорка
Небясьпечная Зона (Exhumator, Sarcastic Green, Barfly's Dreams, Gernunnos, God's Tower ды інш.)
Народны альбом: Супольны музычны праект (1997).
Made in Belarus: Беларускія застольныя песьні ў танцавальнай апрацоўцы (1997).
Сяржук Мінскевіч. Шляхі (1997).
Палац. Дарожка (1997).

КОШТ КАСЭТАЎ 43.000 + 7.000 ПОШТА

Gods Tower. The Eerie.
Gods Tower. Canticles.
Plastic Hardcore. Ultra.
Chemical Warfare. Demolition Tape.
Headcleaner. Hash. Hash. Resistance.
Insanta Trivium. Candle of Fire.

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

НАВІНКА !

Канвэер сьмерці: Дакумэнты. Сьведчаньні. Успаміны / Укладальнік і аўтар камэнтараў Ігар Кузьняцоў. — Менск: Наша Ніва, 1997. — 366 с. — (Архіў Найноўшае Гісторыі) ISBN 985-6374-04-9

НАВІНКА !

Дэрыда, Жак. Акрамя імя / Пер. з фр. Зьм.Коласа. — Менск: Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, 1997. — 104 с. ISBN 985-6012-34-1

Кніга-эсэ сучаснага французскага філёзафа, прысьвечаная фэнамэну нэгатыўнай тэалёгіі й у сувязі зь ёю — праблемам мовы, слова, імя. Гэтая кніга сталася першаю, якая выйшла па-беларуску ў рамках Праграмы міністэрства замежных справаў Францыі ў дапамогу беларускім выдаўцам імя Максіма Багдановіча. Раней кнігі гэтай праграмы выходзілі толькі па-расейску.

НАВІНКА!

Пресса на территории СНГ: конфликты и правонарушения, 1996. - Москва: «Права человека», 1997. - 448 с. (Фонд защиты гласности). ISBN 5-7712-0044-1

У гэтай новай кнізе 156 старонак з 448, альбо 35 % усяго тэксту, аддадзена пад беларускія матэрыялы (усяго рэпрэзэнтавана 11 краінаў). Маніторынг, дакумэнты, цытаты, звароты сьведчаць пра сапраўдную вайну супраць незалежных мэдыяў, якая вядзецца ў Беларусі.

НАВІНКІ !



Михаил Пастухов. Суд над «Свабодай». — Менск, 1997. —61 с.

Михаил Пастухов. СМИ в Беларуси: Нетипичная ситуация. — Менск: IREX/MINSK, 1997. — 27 с.

Mikhail Pastukhov. Abnormal conditions for Media in Belarus. — Miensk: IREX/MINSK, 1997. — 34 p.



Кнігі пра парушэньне свабоды слова ў Беларусі выходзяць і ў Менску. Тры новыя брашуры, укладальнікам якіх ёсьць прафэсар Міхал Пастухоў, утрымліваюць дакумэнты эпохі й юрыдычныя камэнтары да іх. Гэтыя кніжкі ў значнай ступені разьлічаныя таксама на зьнешняга спажыўца й выдадзеныя па-расейску й па-ангельску.

Новая кніга з архіўнае сэрыі праз дакумэнты й успаміны раскрывае стварэньне й прынцыпы функцыянаваньня савецкай рэпрэсіўнай сыстэмы. Калі апублікаваныя такія дакумэнты, то ўмовы для прапагандысцкай хлусьні ўскладняюцца.

НОВЫЯ КНІП І ПЭРЫЁДЫКІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЬЮ

Археалёгія Беларусі: У 4 т. Т. 1: Каменны і бронзавы вякі / Э.Зайкоўскі, У.Ісаенка, А.Калечыц і інш.; Пад рэд. М.Чарняўскага, А.Калечыц. –Менск: Беларуская навука, 1997. – 424 с., іл. – Наклад 1.200 ас. ISBN 985-08-0088-7

Ave Maria. Часопіс Менска-Магілёўскай Архідыяцэзіі. 1997, № 11-12 (37-38).

Беларуская драматургія. Вып.4 / М-ва культуры Рэспублікі Беларусь; «Тэатральная творчасьць»; Уклад. В.Валадзько, А.Сабалеўскі; Рэд. калегія: А.Сабалеўскі (адк.рэдактар) і інш.; Прадмова А.Сабалеўскага. – Менск: Беларуская навука, 1997. – 190 с. – Наклад 1.000 ас. ISBN 985-08-0024-0

Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасьці да 1861 г. / Я.Анішчанка, Г.Галенчанка, В.Голубеў і інш.; Пад рэд. В.Мялешкі і інш. – Менск: Беларуская навука, 1997. – 431 с. – Наклад 1.000 ас. ISBN 985-08-0060-7 (Т. 1) ISBN 985-08-0071-2

Дуктаў У. Трэцяя асоба. Апавяданьні / Прадмова В.Гардзея. – Менск: Мастацкая літаратура, 1997. – 174 с. (Першая кніга празаіка) – Наклад 1.000 ас. ISBN 985-02-0343-9

Дыялёг. Культурна-рэлігійны часопіс. 1998, № 1(45), студзень.

Дэрыда, Жак. Акрамя імя / Пер. з фр. Зьм.Коласа. – Менск: Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, 1997. – 104 с. ISBN 985-6012-34-1

Каталіцкія навіны. Інфармацыйны бюлетэнь. Выданьне Менска-Магілёўскай Ахідыяцэзіі Рыма-Каталіцкага Касьцёлу. № 12/1997 – 1/1998 (28-29).

Купала Я. Поўны збор твораў. У 9 т. Т.4: Вершы, пераклады 1915-1929. – Менск: Мастацкая літаратура, 1997. – 446 с., іл. – Наклад 6.000 ас. ISBN 985-02-0250-5 (т.4), ISBN 3-340-01093-7

Левановіч Л. Вяртаньн ў радыяцыю: Аповесьць, апавяданьні, нарысы. Для ст. шк. веку / Мастак К.Ракіцкі. – Менск: Юнацтва, 1997. – 222 с., іл. – Наклад 3.000 ас. ISBN 985-05-0-183-9

М.М.Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага). Матэрыялы навуковай каныэрэнцыі / БелНДІДАС; БДУ, Гіст. фак. Рэд.-укл. А.Гесь, В.Скалабан. – Менск, 1997. – 359 с. – 150 ас. ISBN 985-6099-40-4

Музы Нясьвіжа. Матэрыялы навуковай канфэрэнцыі / Пад навук. кіраўніцтвам канд. філяз. навук У.Скараходава; Рэдактар Н.Сярмяжка. – Менск: БелІПК, 1997. – 78 с. – Наклад 100 ас.

Пасьлясінадальная Апостальская Адгартацыя Christifideles Laici. – Мн.: 1997. – 112 с.

Скарабагатчанка А. Народная інструмэнтальная культура Беларускага Паазер'я. – Менск: Бел.навука, 1997. – 471 с., іл., ноты. – Наклад 800 ас. ISBN 985-08-0056-9

Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалёгія: Вучэб. дапаможнік / Н.Гаўрош, М.кавалёва, Н.Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. Яўневіча. – Менск: Выд. Ул.Скакун, 1997. – 288 с. – Наклад 8.000 ас. ISBN 985-6235-12-X

Царкоўны пасланец (Church Messenger). Паведамленьні Парахвіяльнае Рады Катэдральнага сабору сьв. Кірылы Тураўскага. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. – Каляды 1997. № 3-4/44/54.

Чацьвёртая ўлада. Бюлетэнь Беларускай асацыяцыі журналістаў. – 1997, № 12, сьнежань. – Наклад 499 ас.

Бунд в Беларуси. 1897 – 1921: Документы и материалы / Укладальнік Э.Савіцкі. – Менск: БелНИИДАД, 1997. – 608 с. – Наклад 100 ас. ISBN 985-6099-39-0

Пастухов, Михаил. СМИ в Беларуси: Нетипическая ситуация. –Менск: IREX/MINSK, 1997. – 27 с. – 450 ас.

Пастухов, Михаил. Суд над «Свабодай». – Менск: БАЖ, 1997. –61 с.

Савченко В. Экология Чернобльской катастрофы: Научные основы Международной программы исследований / Пер. с англ. А.Кириленко. – Менск: Беларуская навука, 1997. – 224 с. –Наклад 1.000 ас. ISBN 985-08-00-55-0

Фонды бывших архивов Коммунистической партии Белоруссии: Кароткі даведнік. У 2 ч. Ч.1 / Укладальнікі Г.Данілава, В.Селяменеў; Прадмова В.Селяменеў, М. Шумейка. – Менск: НАРБ, 1997. – 104 с. – Наклад 500 ас. ISBN 985-6372-05

Czasopis. Pismo Informacijno-Kulturalne Wschodniej Bialostocczyzny. – 1998, № 1 (84), styczen.

Kultura. – Paryz. 1997, Grudzien / Decembre, Nr. 12/603. ISSN 0023-5148

Pastukhov, Mikhail. Abnormal conditions for Media in Belarus. – Miensk: IREX/MINSK, 1997. – 34 p.

грамафон.

Аляксандар Антончык

РОДНЫ КРАЙ

Пасярод балот і пушчаў,
Уздоўж дарог, што імчацца ў Русь,
Між Дняпром і Бугам сінім
Ляжыць край мой Беларусь.

На яго раўнінах вольных
Нівы хлебныя шумяць,
Туманоў блакітных хмары
У далінах ціхіх сьпяць.

Зелянеюць ў поймах травы
Цішыня, спакой кругом,
Толькі ветрык пяе жвавы
Песьні ў небе залатом.

Сонца сыпле жменяй промні
На духмяныя палеткі.
П'юць чароўны водар лета
З асалодай травы й кветкі.

Жыццю радуюцца й рыбкі
Ў прахалодзе сьветлых рэк,
У акіян нясучы воды
З году ў год і зь веку ў век.

У гаях, барах цяністых
Няма ліку галасам.
Салаўі, шпакі, сініцы
Гімн сьпяваюць тут і там.

Гімн сьпяваюць лесу, небу
Лугу, сонейку з вадою,
Усёй зямліцы нашай любай,
На якой жывём з табою.

Зьміцер Бартосік

ГОМЕЛЬСКАЯ РЭСТАРАННАЯ

Канстанціну Залатых

Заўтра ты ізноў ляціш
Праз Сант'яга на Парыж,
Я паеду зноў праз Гайнаўку ў Варшаву.
Усё радзей нам дорыць лёс
Для візытаў вольных дзён,
Разыходзяцца ўсё далей нашы справы.

Толькі места ёсьць куды
Праз завеі і гады
Мы вяртацца не аднойчы будзем, дружа.
Горад нашых першых спраў,
Што калісьці нас зьвязаў
Па руках, па думках, а, можа, і па душах.

Не за понтам і грашмі,
За жыццём рванулі мы.
Бы баяліся спазьніцца — моў, пара ўжо.
Пакідаць дамы бацькоў,
Як зацеснае кубло,
Нават толкам ў мітусьні не разьвітаўшысь.

Ўжо ня грэлі нас агні,
Што зьнікалі ўдалечыні,
І завеі ўсё шчыльней замяталі
Нашы даўнія сьляды
Па дварах тых, дзе жылі
Нашы першыя няўдалыя каханьні.

Парк шляхетнае пары,
Што сышоў да нас нібы
Са старых гравюр Напалеона Орды.
Дзе ў прысадах мо, як знаць,
Даўнім рэхам шчэ гучаць
Нашых першых песень першыя акорды.

Баляваньні да пазна,
Слодыч першага віна
І гаркота першай ў роспачы зацяжкі
Не зьнікаюць ў прорве ЧАС,
Усё мацней гукаюць нас,
І чым далей, тым больш вяртаньне будзе цяжкім.

Ды ня сьціхне струнны звон,
І квітнець каштанам зноў
Ад Палаца і да вуліцы Пабеды.
Там, дзе некалі расьлі
Неблагія пацаны
Ўсё чакаючы шчасьлівага білету.

І я думаю, што ў год,
Калі свой страшны акорд
Нам зайграе вецер самай лютай сьцюжы,
Самі вернуцца туды,
Ў горад вечнай цеплыні
Нашы мары, нашы думкі, нашы душы...

Тацяна Барысава

ЗА ВАКНОМ

За вакном дагарае Сонца,
як згарае маё жыццё.
Прада мной і за мною бясконцасць —
невымернае небыццё.
Я пайду назаўжды калісьці,
дзе няма ніякіх дарог.
Памалюсь, каб заўсёды літасьціў
да Айчыны быў пане-Бог.
Як пакуты Хрыста-Збавіцеля
Яе боль не магу трываць.
Кроў і сьлёзы яе пралітыя
несуцішана мне баляць.
За вакном дагарае Сонца,
залацістыя промні шле.
Як апошнія Абаронцы
адбіваліс яны на шкле.

Аляксей Бацюкоў

***

Не, я ня дробязь, я ня
Пыл,
Мне гэты край даў Імя
Сын.
Разам з вамі такі ж я хмяльны
Зноў,
А для роднай зямлі усе мы —
Боль.
Мы для гэтых нябёс жмень шчаўя,
Плён.
Дай жа моцы мне, Бог, каб ня стаў я
Праклён.

Тацяна Будовіч

***

Заўтра ты атруціш блазна,
Што жыве ў душы маёй.
Каб дарэшты стаць тваёй,
Мушу я пазбыцца блазна.

Вольга

***

Па гэтых сьцежках выйсьце ў краі
Якіх ужо на мапе нету
У краяглядзе патанаюць
Канаюць у Лету

Пакуль збянтэжаная восень
На досьвітку пляце павуту
Адно — абрыс дзьвярэй замкнутых
Дый рэха кросен

Яшчэ ня згас апошні шолах
Яшчэ блукае цень. Міцкевіч?
Дый не пачуўшы сьпеваў кволых
Канае ў невеч

Марта Гамановіч

***

У мяне не было слоў.
У цябе не было слоў.
У мяне ўсё ж былі сны,
У цябе не было й сноў.

Толькі ружа была ў нас,
І пунсовай была кроў...
А ў мяне не было слоў,
Бо ў цябе ж не было сноў.

Сяргей Герасімаў

ШЧЫРАЕ ПРЫЗНАНЬНЕ
КАЛГАСНАГА ВОРА

Марозным вечарам нязгасным,
Калі жыццё — пад зорным шляхам,
Я «завітаў» на двор калгасны —
«Пазычыць» з трактару саляркі.

«Пазычыць», каб аддаць за пляшку
Хлапцам у шэрым «Мэрсэдзсе»,
Забыцца на жыццё і Сашку,
Згубіцца у зімовым лесе.

Трымаючы ў руцэ каністру,
Поўз вужаком па белым сьнезе.
Не пазайздросьціш трактарысту,
Што заўтра прыйдзе, ды паедзе...

Ну, не зьвязе тым тром кароўкам,
(Тры засталіся у калгасе)
Апошні мех гнілое морквы —
Не ўпершыню тое няшчасьце.

Зьвязуць на коні адным махам —
Яму салярка непатрэбна.
А я працягваў грэшным шляхам
Ажыццяўляць злачынну мэту.

Старожка месьціцца за плотам.
Так, вартаўнік стаіць на ганку,
Сабака сьцеражэ вароты, —
Прыйдзецца йсьці другім напрамкам.

Папоўз далей, бо двор — вялікі,
Там, ззаду можа не пачуюць.
Спыніўся. Вось — камбайн забыты,
Ён палівам не пачастуе.

А побач «Беларусь» стаіць іржавы,
Ды сілы ёсьць яшчэ ў рухавіку:
Яго я бачыў сёньня каля крамы
Ці каля фермы? Успомніць не магу...

Падлоўз бліжэй, схаваўшыся за колам,
Намацаў бак, накрыўку адчыніў,
І шлянжыкам маленечкім гумовым
Сабе каністрачку паціху нацадзіў.

Далей — мяне альбо злавілі,
Альбо я ціхенька сыйшоў.
Калі злавілі — засудзілі,
Калі сыйшоў... Ну, дык, сыйшоў.

Дзьюкі

БОЛЬ

Навошта хавацца ад болю,
Калі больш нічога няма?
Трапеткага непакою
Ў жыцьці я зьведала шмат.

Так, ведаеш, я кахала,
І быў шчасьлівы мой лёс.
Але я нарэшце згадала
Зор сьлевы і цягу нябёс,

Бліскучае зыркае сонца
І... як гэта проста згубіць....
І вось, у адчаю бясконцым,
Я кроў не магу супыніць.

Зялёную вадкасьць па целе
Ганю я далоньню сваёй,
Каб стала агідная цемра
Пяшчотнай тваёй цеплынёй,

Каб шолах паблеклых лаўраў
Парушыў урэшт цішыню
І каб у вачах мінатаўраў
Убачыла я дабрыню.

Уладзімер Драбышэўскі

ЧЫРВОНЫ ПАРАВОЗ

Наш паравоз, упярод імчы,
Ды толькі надта не сьвішчы.
У вугал кінуць бы вінтоўку,
Дык можа была б болей толку.

Ала Кажэра

НА ВЕЧАРЫ БЕЛАРУСКІХ БАРДАЎ

Прад ноччу сымбаляў замнога,
Лунаюць цені ад падкоў,
Тут пасялілася трывога
І абняла усіх любоў.

З бусьліным болем песьні бардаў
Хаваюць страйкавы імпэт,
Ды з п'янай зьдзеклівай пагардай
Па залі шастае паэт.

У змроку сінімі кругамі
Ахвярны цыгарэтны дым,
Мы пад сьвятымі абразамі
Карцін Алесевых стаім.

Ільля Кірсанаў

НАМ

Яны нам казалі: «БОЛЕЙ
Ня трэба сьцягоў свабодных,
Ня трэба мужыцкай мовы
Й намераў вашых лагодных!»
Яны нам жа кажуць: «НЕЛЬГА
Уздымаці высока галовы,
Уздымаці за Волячку кубкі
Й позірк мець адмысловы!»
Яны яшчэ кажуць: «МАЎЧАЦЬ!
Ціхенька, пакуль шчэ жывыя!
Ціхенька, бо ёсьць у вас дзеткі.
Ня каты мы, але й не сьвятыя».
Але нам зямелька шэпча:
«Хопіць ляжаць!
Бярыце ў рукі каменьні!
НАМ БОЛЕЙ НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!»

Андрусь Клікуноў

***

Ціха дождж цярушыць па гзымсу,
Ахінае душу дзіўнай МРОЯЙ:
Велізарныя чорныя шаты
Паглынаюць усё, манячы воляй,
Паглынаюць усё, душачы воляй,
Гіжай воляй, бязмежнай ад жалю.
Зачыняюцца мройныя шаты...
Дождж цярушыць на краты, за краты,
На здранцьвелых крыжоў скрыжаваньні,
На МАЁ і ТВАЁ пакараньне;
Пакараньне з адвечнага болю,
З хвейных мар, што ў жыцьці патанулі,
Зь сьветлых душ, што навекі паснулі,
З словаў сябра, якіх не прызналі,
Зь ясных зьнічкаў, якія сканалі.

Яўхім Корчак

ГУБЭРНСКІ ГОРАД

Губэрнскі горад..
Змрочныя часы...
Зьбяднелы люд
на плошчы прывакзальнай,
Жанчыны
нежаноцкае красы,
і мужыкі
няголеныя зраньня.

Сярод матораў —
гучны рускі мат
Шматпавярховай
дзіўнай пабудовы.
І сіплы рык:
«Эй, уберыце зад!»
Гучыць як самыя
прыстойныя тут словы.

Губэрнскі горад...
Гэта — як ярмо,
Што ўбіта ў лоб
той прывакзальнай плошчы,
Спрадвечнае
радзімае бяльмо,
Дзе ноч і дзень
фантомаў-коней пошчак.

Вы кажаце,
што ўсюды ўжо асфальт,
Машын замежных
болей, чым на Усходзе.
Вядомае ў немцаў
«es ist kalt»
Гучыць як «бл...»
тут пры любой пагодзе.
Ну досыць пра надвор'е і пра тых,
Што ўжо жыццё сабе пабудавалі.
Губэрнскі горад, у вачах тваіх
Самоты мала. Значна больш — «печали»...

Віктар Ліцьвінаў

***

Халодным срэбным голасам сьпявае
скрыпка
цёплым тонкім пальцам у маёй руцэ й
вачам тваім да болю чорным і празрыстым,
жабрацкім дрэвам, распранутым на зіму,
о сумны лес! о сьнег да рэзі белы ў вачох!,
й празрысты нечаканы сьвет,
распануты ад хмар чырвоных,
маркотны, мяккі і пранізьлівы ў льдзе
застыглым і чароўным звонам!
Зіма... параненай зямлі царыца,
закрыла чорныя рубцы някаватай скуры
і цягнецца йна больш застыглымі
рукамі да морфы факта дэ ў альфавіце
й ня хоча прызнаваць прыставак пры, —
тым больш не прызнае йна факта юрэ,
бо гэта — простая, свабодная царыца!

Ігар Максімаў

МОВА

Не цурайся матчынай мовы,
Уздымай яе, сьвятую, да нябёс.
Прамаўляй мілагучныя словы,
Якія народ стагодзьдзі нёс.
Родная мова цярпела даволі
Зьдзекаў чужынцаў і халуёў.
Клікала люд зь цемры да волі,
Народ ня здолеў прачнуцца ізноў.

Але нацыя, веру, прачнецца,
Зь летаргічнага вырвецца сну.
Уздымецца ва ўвесь рост, схамянецца,
І будзе цаніць мову адну,
Не чужынскую, а родную сваю.

Юры Марушка

НАВАГРАДАК

Сярод лясоў дрымучых
стаіць на горцы слаўны град,
даўней вялікі, стольны,
цяпер маленькі і раённы
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Люблю твае я вулачкі
старадаўнія і новыя,
чыстыя, зялёныя,
сівы, магутны замак,
дзе слаўны князь Міндоўг з дружынаю стаяў
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Прайду я вуліцай Паштоваю,
а потым ціхаю Садоваю.
Ля Міндоўга гары я трохі пастаю.
Падгорная і Паркавая,
Палявая і Замкавая
Да сяброў маіх вядуць.
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Люблю твае я цэрквы і касьцёлы,
Царкоўны звон і аргана адвечныя гукі
Бацькоўскія цёплыя, дужыя рукі
і буслаў клёкат вясёлы.
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Люблю твой парк чароўны
Вясновай сонечнай пары.
Ты помніш наша першае спатканьне
Ля Міцкевічавага кургана, на Замкавай гары.
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Тут сонейка сьвеціць мілей
І ветрык дзьме ласкавей,
Тут птушкі пяюць весялей
А сэрца ўсё б'ецца мацней і мацней.
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Заступнік наш — Архангел Міхаіл,
Праз стагодзьдзі глядзіш ты з гарадзкога герба.
Дай усім нам надзеі, цярпеньня, сіл,
Веры, каханьня і трошачкі дабра!
Навагрудак, Навагрудак, мой любы горад мой.

Алесь Менскі

ЯНЫ І МЫ

Яны паглядаюць
з-пад ссунутых броваў,
на тварах адбіта
пячатка ілжы.
Яны голяць заўжды
самі сабе галовы,
носяць вопратку колеру
кратнай іржы.

Божа, дай вочы,
дай слых,
каб пачуць, зразумець,
не зірнуўшы ў паперку:
мы не падобны да іх —
тых, каго кожную раніцу
бачыш у люстэрку.

Зьміцер Піскур

ПРАЗ ПРЫЗМУ

Горад сьпіць, замкнуўся ў сваіх скрынях,
шэлег-месяц выкаціўся з хмары.
Дахі спачываюць, неба стыне,
у кутку даходзіць мая мара.

Вецер чэша сівым дрэвам грывы,
за сьцяной прывід штось крэхча цяжка.
Ліхтары міргаюць палахліва,
я гляджу у ноч праз прызму пляшкі.

Ігар Пракаповіч

У ТРЫСЬНЯГАХ

У трысьнягах заўзята крэкчуць качкі,
Садзіцца сонца ціха за гару.
І сок бярозавы, прачнуўшыся ад сьпячкі,
Струменіць кроплямі на бялую гару.

Пяшчотна радасьць лашчыцца ля сэрца,
Нябёсы вішняй сьпеюць на зары.
Саната ціхая над возерам ліецца
І затухае недзе ў бары.

Смалісты пах крывой сасны убогай
Прастору вечара і лечыць, і п'яніць.
І над пустой, астылай ўжо дарогай
Маркотны лунь кудысь ляціць, ляціць.

... У трысьнягах ужо прыціхлі качкі,
Сутоньне туманы над возерам пасе.
І сок бярозавы, што бродзіць пасьля сьпячкі,
Сьцякае з дрэва і губляецца ў расе...

Пятро Прыходзька

БУЙНІЦКАЕ ПОЛЕ

Зямля ўся палала жытнёва
З байцамі адвагай адной.
Ля ўсходняй сьцяны Магілёва
Само поле стала сьцяной.

Яно ў самым цэнтры Эўропы,
Каб ворагам ходу ня даць, —
Магло свой рубеж ў акопах
Амаль цэлы месяц трымаць.

Агонь сьмертаносны віхуры
На часткі зямлю разарваў,
Пад танкі і на амбразуры
Гранатамі біў зь перапраў.

Адвага людзкая празь вёрсты
Край родны на подзьвіг вяла:
Ад Брэсцкае крэпасьці проста
К Буйніцкаму полю ішла.

І зноў сваім подзьвігам ратным,
Што месца ў гісторыі меў,
Сюды вершнік зь мечам булатным
На быстрай Пагоні ляцеў...

Сягоньня над полем бярозы
Зіхцяць за аблокаў бялей,
У возера «Матчыны сьлёзы»
Заглядваюцца з алей.

Здалёку і зблізку праз годы
Прыходзіць сюды цэлы сьвет.
Імя тут сваё назаўсёды
Пакінуў вядомы паэт.

О, роднае поле! З табою
Падзелім і сэрцаў цяпло, —
Каб толькі для нас полем бою
Ніколі ты больш не было!

Браніслаў Пяткевіч

ФАЛЬШ

Хлусьня і фальш адно і тое,
Ніколькі тут няма сумненьня,
Яны ідуць упоруч двое,
Каб утрымаць сваё імкненьне.
Чужынец з маскай патрыёта
Віншуе нашу знакамітасьць,
І з вышыні свайго узлёту
Кідае позірк свой як літасьць.
Ён сам прадасьць сваю айчыну,
Сам матку родную адкіне.
У нас у складзе «вэртыкалі»
Ён не прымае нашай мовы
І кіне гіры так на шалі,
Каб узмацніць на нас аковы.
Ды што казаць, старая сьвітка
Ня грэе цела на марозе.
Ці наймі ён, ці мо наймітка,
Для нас ня гожы у дарозе.

Крысьціна С.

***

Пачуцьцё болю...
Пачуцьцё жалю...
Пачуцьцё жаху...
Пачуцьцё пяху...
А ці ня хочаш
Спазнаць асалоду
Ад адчуваньня
Поўнай свабоды?

Давыд Сьцізорык

ВЕЦЕР У ШЫБЕ

Слухайце! Слухайце, кожным акенцам,
Як б'ецца вецер! Як б'ецца вецер
У шыбе... Зьняволены... Зьняволены вецер!
Слухайце! Слухайце кожным акенцам!
Кожным акенцам: уважліва, прагна.
Вецер за кратамі! Вецер за кратамі —
Гэта насьмешка над воляю ветру.
Слухайце сьпевы ў шкле амярцьвелым!
Не кранайце шкло моўчкі, біце далоньню:
Вольнаму ветру — вольная воля!
Вольная воля яму ў Вольным Краі!
Нам — вольныя вочы, каб мы назіралі,
Як ён лунае ў блакіце — шчасьлівы...

Вецер у шыбе! Вецер у шыбе!

Аляксей Чубат

ЦЫКЛ

Хтось вечна шукае кветак
На рынку, у садзе, на полі,
Жывых, арганічна прыгожых,
Пульхных і стромкіх даволі.

Заўсёды зрывае найлепшыя,
Купляе бяз слоў у гандляркі,
Калі патрэбна — крадзе,
Патрэбна — плоціць далярамі.

Пяшчотнай далоняй абхопвае,
Павольна ідзе дадому,
Мінае паркі й сквэры,
Не заўважае знаёмых.

Прыйшоўшы, ставіць у вазу,
Сядае ў фатэль, назірае,
І думае кожнага разу,
Як лёс прыгажосьць карае.

З напругай чакае той момант,
Як зваліцца першы пялёстак,
Што йдзе на покліч прыроды,
Гармонію рушачы проста.

І ўскоквае, ломіць сьцябло:
Адно, другое, трэцяе;
І кветкі ляцяць праз вакно
У сьметнік, з пылком на суквецьцях.

Алесь Шадрын

***

Люстэрка адбівае нябачнае сьвятло,
І цень незразумелы мой розум ахапіў;
Нічога я ня чую, я адчуваю сон
Бясконцы ды тужлівы — пачатак Цішыні;
Калі прыходзіць гора — да сьмерці доўгі шлях
Здаецца паратункам адзіным ад бяды;
Я трызьненьня чакаю, каб больш ня бачыць сьвет —
— Жахлівы ды пачварны, такі які ён ёсьць.
Збавеньня я чакаю, мой лёс у маіх руках,
Будынак свайго цела спрабую зьнішчыць сам;
І сілы паступова адыходзяць ад мяне,
Я баўлю час самотны, прыгадваючы дзень,
Калі спаткаў мітрэнгу, трывогу, мітусню,
Калі маркотны вецер у хату завітаў;
Чакаючы разьвязкі, чакаючы канца,
Лягчэй, я думаў, будзе на сэрцы й на душы,
Але няма палёгкі, а толькі скрухі вір
Ды музыкі жалобнай гучаньне да відна;
О, Вартаўнік Прыроды!
Крыніца ўсіх зямных!
Пачуй мой крык апошні!
Адчуй мой чорны боль!

Алена Шарэпа-Лапіцкая

***

Да Чайкі паплыву:
— Вазьмі мяне з сабой
І пагайдай на хвалях
белапенных!

Я ўсё Табе аддам —
Табе, Табе адной —
І роспач, і тугу,
І скарб душы бясцэнны!..

Дзе ты сама царыш
у празрыстасьці,
як Дух,
У бязьмежнасьці,
Чужому недасяжнай, —
З Табой, Адзіная,
З Табою мы ўдвух
Два сэрцы панясем
Імклівасьцю
Адважнай!

Над морам узьляцім,
Высока над вадой,
Дзе ты — Магутная
Над хвалямі
Царыца!

Пад неба ўзьнімемся
Над бязданьню марской
І наш узьлёт красой
Не паўтарыцца!..

Сымон Шаўцоў

МАНЮКА ШЭРАЯ ЗЯЗЮЛЯ

Ты, шэрая зязюля
Ня добрая маці
Дзяцей не гадуеш
Чужым падкідаеш.
Толькі варожым
Людзей баламуціш
Праўду ня кажаш
Заўжды ім хлусіш,
Што ім ня доўга
Жыць ў Беларусі.

М.Яўмененка

НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ — НЕ ГІБРЫД

У глыбіні Сібіры ёсьць
Для беларусаў шмат мясьцінаў,
Адкуль груган ня зможа косьці
Занесьці ў Беларусь-Радзіму.

Жывёльны страх перад Расеяй
У беларусаў застаецца.
Пакуль ім Воля не пад сілу,
Хаўрусам зь ёю будуць грэцца.

Так ёсьць, было і гэтак будзе
Яшчэ ня год, ня два, ня дзесяць
У беларускай халабудзе,
Паколькі беларусы дзеляць

Саміх сябе на праваслаўных,
Каталікаў ды вуніятаў,
Паколькі іхні розум — страўнік
Знаходзіцца ў руках вар'ятаў.

Глядзіш, чачэнцаў — нашмат меней,
Але ж яны абаранілі
Свой гонар, годнасьць і адметнасьць:
З Расеяй дружна гаманілі

Не заляцаньнямі, а сілай
Ня толькі зброі, а і духу.
Ім аказалася па сілу
Агрэсару даць аплявуху.

Змаглі таксама і прыбалты
Вампіру паказаць на дзьверы
Сваёй адметнай зброяй кшталту
Адзінства нацыі і веры.

Сусед паўднёвы Украіна
Сваю адметнасьць заслупіла
Ад праімпэрскае краіны —
Велікарускага вампіра

Жаданьнем цеснага хаўрусу
З дэмакратычнаю Эўропай.
Адны вось толькі беларусы
Нямыленымі ўлезьлі ў попу

Да тых, хто біў іх неаднойчы,
Сьпяшаюцца, бо ў попе цёпла
І днём, і раніцай,і ўночы.
І да чаго ж натоўп наш цёмны!

Ён памяняў сьвятло на цемру,
А Незалежнасьць на гібрыд,
Паветра сьвежае — на сера-
Вадародны ангідрыд.

Эўрапейская Сацыяльная Хартыя*

Частка III

Артыкул 20

Абавязкі

1. Кожны з Дамоўных бакоў абавязваецца:

a) разглядаць Частку I гэтай Хартыі як дэкларацыю мэтаў, дасягненьня якіх яна будзе дамагацца ўсімі неабходнымі сродкамі ў адпаведнасьці з уступным пунктам вышэйпамянёнай Часткі;

b) лічыць, што абавязковую сілу для яго маюць як найменш пяць зь сямі наступных артыкулаў Часткі II гэтай Хартыі: артыкулы 1, 5, 6, 12, 13, 16 і 19;

c) за выключэньнем артыкулаў, абраных ім у адпаведнасьці з папярэднім падпунктам, лічыць, што абавязковую сілу для яго мае такая дадатковая колькасьць артыкулаў альбо пунктаў Часткі II гэтай Хартыі, якую ён абярэ, пры гэтым агульная колькасьць абавязковых для яго артыкулаў і пунктаў мусіць складаць ня менш за 10 артыкулаў альбо 45 пунктаў, што маюць лічбавае значаньне.

2. Артыкулы альбо пункты, абраныя ў адпаведнасьці з падпунктамі «b» і «c» пункта 1 гэтага артыкула, паведамляюцца Дамоўным бокам Генэральнаму сакратару Рады Эўропы пад час здачы на захаваньне ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб ухвале.

3. Кожны з Дамоўных бакоў можа ў далейшым заявіць праз паведамленьне Генэральнаму сакратару, што ён прымае за маючыя для сябе абавязковую сілу любыя іншыя артыкулы альбо любыя іншыя пункты, якія маюць лічбавае значаньне, Часткі II Хартыі, якія ён яшчэ не прыняў у адпаведнасьці з палажэньнямі пункта 1 гэтага артыкула. Такія прынятыя ў далейшым абавязкі разглядаюцца як неад'емная складовая частка ратыфікацыі альбо ўхвалы й набываюць такую самую сілу, пачынаючы з трыццатага дня пасьля даты паведамленьня.

4. Генэральны сакратар Рады Эўропы паведамляе ўсім урадам, якія падпісалі Хартыю, і Генэральнаму дырэктару Міжнароднага бюро працы пра кожнае паведамленьне, якое ён атрымаў згодна з гэтай Часткай Хартыі.

5. Кожны з Дамоўных бакоў мае сыстэму працоўнай інспэкцыі, якая адпавядае ягоным нацыянальным умовам.

Частка IV

Артыкул 21

Даклады адносна прынятых палажэньняў

Дамоўныя бакі раз на два гады накіроўваюць Генэральнаму сакратару Рады Эўропы даклад, форма якога вызначаецца Камітэтам міністраў, адносна ўжываньня прынятых імі палажэньняў Часткі II Хартыі.

Артыкул 22

Даклады адносна палажэньняў, якія не былі прынятыя

Дамоўныя бакі праз адпаведныя прамежкі часу й паводле просьбы Камітэту міністраў накіроўваюць Генэральнаму сакратару даклады адносна палажэньняў Часткі II Хартыі, якія не былі прынятыя імі пры ратыфікацыі альбо ўхвале, ці робяць гэта праз наступнае паведамленьне. Камітэт міністраў з пэўнай пэрыядычнасьцю прызначае, адносна якіх палажэньняў запрошваюцца такія даклады і ў якой форме яны падаюцца.

Артыкул 23

Накіраваньне копіяў

1. Кожны з Дамоўных бакоў накіроўвае копіі сваіх дакладаў, згаданых у артыкулах 21 і 23, тым са сваіх нацыянальных арганізацыяў, якія зьяўляюцца чальцамі такіх міжнародных арганізацыяў працадаўцаў і працоўных, якія запрашаюцца, каб быць пададзенымі ў адпаведнасьці з пунктам 2 артыкула 27 на паседжаньнях Падкамітэту Ўрадавага сацыяльнага камітэту.

2. Дамоўныя бакі накіроўваюць Генэральнаму сакратару любыя заўвагі па згаданых дакладах, атрыманыя ад гэтых нацыянальных арганізацыяў, калі гэтыя арганізацыі просяць пра гэта.

Артыкул 24

Разгляд дакладаў

Даклады, накіраваныя Генэральнаму сакратару ў адпаведнасьці з артыкуламі 21 і 22, разглядаюцца Камітэтам экспэртаў, у распараджэньні якога знаходзяцца таксама любыя заўвагі, якія накіроўваюцца Генэральнаму сакратару ў адпаведнасьці з пунктам 2 артыкула 23.

Артыкул 25

Камітэт экспэртаў

1. Камітэт экспэртаў складаецца ня больш чым зь сямі чальцоў, якіх прызначае Камітэт міністраў са сьпісу прапанаваных Дамоўнымі бакамі незалежных экспэртаў, якія вядомыя сваёй бездакорнай сумленнасьцю й зьяўляюцца прызнанымі спэцыялістамі ў міжнародных сацыяльных пытаньнях.

2. Чальцы Камітэту прызначаюцца тэрмінам на шэсьць гадоў. Яны могуць прызначацца на новы тэрмін. Аднак тэрмін паўнамоцтваў двух чальцоў, якія будуць вызначаныя пры першым прызначэньні, сканчаецца праз чатыры гады.

3. Чальцы, тэрмін паўнамоцтваў якіх сканчаецца пасьля першапачатковага пэрыяду ў чатыры гады, вызначаюцца паводле лёсаваньня Камітэтам міністраў адразу ж пасьля першага прызначэньня.

4. Чалец Камітэту экспэртаў, прызначаны для замяшчэньня чальца, тэрмін паўнамоцтваў якога ня скончыўся, займае гэтую пасаду да сканчэньня тэрміну паўнамоцтваў сваго папярэдніка.

Артыкул 26

Удзел Міжнароднай арганізацыі працы

Міжнародная арганізацыя працы запрашаецца прызначыць прадстаўніка для ўдзелу ў якасьці кансультанта ў працы Камітэту экспэртаў.

Артыкул 27

Падкамітэт Урадавага сацыяльнага камітэту

1. Даклады Дамоўных бакоў ды заключэньні Камітэту экспэртаў прадстаўляюцца да разгляду Падкамітэту Ўрадавага сацыяльнага камітэту Рады Эўропы.

2. У Падкамітэт уваходзіць па адным прадстаўніку ад кожнага Дамоўнага боку. Ён запрашае ня больш за дзьве міжнародныя арганізацыі працадаўцаў і ня больш за дзьве міжнародныя арганізацыі працоўных накіроўваць на ягоныя паседжаньні сваіх назіральнікаў, якім надаецца кансультатыўны статус. Акрамя таго, ён можа прыцягваць да кансультацыяў ня больш за двух прадстаўнікоў міжнародных няўрадавых арганізацыяў, якія маюць кансультатыўны статус пры Радзе Эўропы, па пытаньнях, у якіх гэтыя арганізацыі найбольш кампэтэнтныя, такіх, да прыкладу, як сацыяльны дабрабыт ды эканамічная й сацыяльная абарона сям'і.

3. Падкамітэт падае Камітэту міністраў даклад, які ўтрымлівае зробленыя ім высновы, і прыкладае да яго даклад Камітэту экспэртаў.

Артыкул 28

Кансультатыўная Асамблея

Генэральны сакратар Рады Эўропы перадае Кансультатыўнай Асамблеі заключэньні Камітэту экспэртаў. Кансультатыўная Асамблея выказвае сваё меркаваньне адносна гэтых заключэньняў Камітэту міністраў.

Артыкул 29

Камітэт міністраў

Камітэт міністраў большасьцю ў дзьве траціны галасоў з тых, якія маюць права засядаць ў Камітэце, можа на аснове даклада падкамітэту й пасьля кансультацыі з Кансультатыўнай Асамблеяй даваць кожнаму з Дамоўных бакоў любыя неабходныя рэкамэндацыі.

Частка V

Артыкул 30

Адхіленьне ад выкананьня абавязкаў ў выпадку вайны альбо нацыянальнай пагрозы

1. У выпадку вайны альбо іншай нацыянальнай пагрозы для жыцьця нацыі, любы Дамоўны бок можа зрабіць захады да адхіленьня ад сваіх абавязкаў па гэтай Хартыі ў памеры, дакладна неабходным у дадзеным становішчы, пры ўмове, што такія захады не супярэчаць іншым яго абавязкам паводле міжнароднага права.

2. Любы Дамоўны бок, які скарыстаў гэтае права на адхіленьне ад прынятых на сябе абавязкаў, у належныя тэрміны вычарпальна інфармуе Генэральнага сакратара Рады Эўропы пра прынятыя захады й прычыны, зь якіх яны былі ўзятыя. Ён таксама мусіць інфармаваць Генэральнага сакратара пра тое, калі такія захады спыняць сваё дзеяньне й калі ў поўнай меры адновіцца ўжываньне прынятых ім палажэньняў Хартыі.

3. Генэральны сакратар інфармуе іншыя Дамоўныя бакі й Генэральнага дырэктара Міжнароднага бюро працы пра ўсе паведамленьні, атрыманыя ў адпаведнасьці з пунктам 2 гэтага артыкула.

Артыкул 31

Абмежаваньні

1. Выкладзеныя ў Частцы I правы й прынцыпы, калі яны эфэктыўна праводзяцца ў жыцьцё, і іхнае практычнае ажыцьцяўленьне, як гэта прадугледжанае ў Частцы II, ня могуць падпадаць пад ніякія абмежаваньні, акрамя пазначаных ў Частках I і II, за выключэньнем абмежаваньняў, усталяваных законам і неабходных у дэмакратычным грамадзтве дзеля абароны правоў і свабодаў іншых асобаў альбо абароны грамадзкіх інтарэсаў, нацыянальнай бясьпекі, здароўя насельніцтва альбо маральнасьці.

2. Абмежаваньні, якія дапускаюцца ў гэтай Хартыі ў дачыненьні да прызнаных у ёй правоў і абавязкаў, не падлягаюць ужываньню дзеля іншых мэтаў акрамя тых, дзеля якіх яны прадугледжаныя.

Артыкул 32

Дачыненьні паміж Хартыяй і ўнутраным правам альбо міжнароднымі пагадненьнямі

Палажэньні гэтай Хартыі не супярэчаць палажэньням унутранага права, двухбаковых альбо шматбаковых дамоваў, канвэнцыяў альбо пагадненьняў, якія ўжо маюць сілу альбо могуць мець сілу, і якія будуць больш спрыяльнымі для асобаў, што знаходзяцца пад абаронай.

Артыкул 33

Выкананьне палажэньняў Хартыі праз калектыўныя дамовы

1. Дзяржавы-ўдзельніцы, у якіх палажэньні пунктаў 1, 2, 3, 4 і 5 артыкула 2, пунктаў 4, 6 і 7 артыкула 7 і пунктаў 1, 2, 3 і 4 артыкула 10 Часткі I гэтай Хартыі замацоўваюцца звычайна ў дамовах, якія заключаюцца паміж працадаўцамі або арганізацыямі працадаўцаў — з аднаго боку, і арганізацыямі працоўных — з другога, альбо звычайна ажыцьцяўляюцца іншым чынам, чым праз закон — могуць прымаць на сябе абавязкі, якія вынікаюць з гэтых палажэньняў, і гэтыя абавязкі разглядаюцца як выкананыя, калі дзеяньне гэтых палажэньняў праз пасярэдніцтва такіх дамоваў альбо іншым чынам пашыраецца на пераважную большасьць зацікаўленых працоўных.

2. Дзяржавы-ўдзельніцы, у якіх гэтыя палажэньні звычайна замацоўваюцца ў заканадаўчым парадку, таксама могуць прымаць на сябе абавязкі, якія вынікаюць з гэтых палажэньняў, і гэтыя абавязкі разглядаюцца як выкананыя, калі дзеяньне гэтых палажэньняў праз пасярэдніцтва закону пашыраецца на пераважную большасьць зацікаўленых працоўных.

Артыкул 34

Тэрытарыяльнае прымяненьне

1. Гэтая Хартыя прымяняецца да тэрыторыі мэтраполіі кожнага з Дамоўных бакоў. Кожны ўрад, які падпісаў Хартыю, можа пры падпісаньні альбо здачы на захаваньне ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб ухвале накіраваць на імя Генэральнага сакратара Рады Эўропы заяву з пазначэньнем тэрыторыі, якую дзеля гэтых мэтаў варта разглядаць у якасьці тэрыторыі мэтраполіі.

2. Любы з Дамоўных бакоў можа пры ратыфікацыі альбо ўхвале гэтай Хартыі альбо ў любы іншы час пасьля гэтага накіраваць на імя Генэральнага сакратара Рады Эропы заяву пра тое, што дзеяньне Хартыі цалкам альбо часткова пашыраецца на тыя тэрыторыі або тэрыторыю па-за мэтраполіяй, пазначаныя ў гэтай заяве, якія ён прадстаўляе ў міжнародных адносінах альбо за якія нясе міжнародную адказнасьць.

3. Дзеяньне Хартыі пашыраецца на тэрыторыю альбо тэрыторыі, пазначаныя ў заяве, згаданай у папярэднім пункце, пачынаючы з трыццатага дня пасьля даты атрыманьня Генэральным сакратаром паведамленьня пра такую заяву.

4. Любы з Дамоўных бакоў можа ў далейшым праз паведамленьне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы заявіць пра тое, што ў дачыненьні да адной ці неалькіх тэрыторыяў, на якія ў адпаведнасьці з пунктам 2 гэтага артыкула было пашыранае дзеяньне Хартыі, ён прымае за маючыя абавязковую сілу любы артыкул ці пункт, якія маюць лічбавае значаньне, якія ён яшчэ не прыняў у дачыненьні да гэтай тэрыторыі альбо тэрыторыяў. Такія прынятыя на сябе ў далейшым абавязкі разглядаюцца ў якасьці складовай часткі першапачатковай заявы ў дачыненьні да гэтай тэрыторыі й дзейнічаюць у тым самым памеры з трыццатага дня пасьля даты паведамленьня.

5. Генэральны сакратар паведамляе іншым урадам, якія падпісалі Хартыю, і Генэральнаму дырэктару Міжнароднага бюро працы пра любое паведамленьне, накіраванае яму ў адпаведнасьці з гэтым артыкулам.

Артыкул 35

Падпісаньне, ратыфікацыя і ўступленьне ў сілу

1. Гэтая Хартыя адкрытая для падпісаньня чальцамі Рады Эўропы. Яна падлягае ратыфікацыі альбо ўхвале. Ратыфікацыйныя граматы альбо дакумэнты аб ухвале здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы.

2. Гэтая Хартыя ўступае ў сілу з трыццатага дня пасьля даты здачы на захаваньне пятай ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб ухвале.

3. Для любога ўраду, што падпісаў Хартыю, які ратыфікуе яе ў далейшым, Хартыя ўступае ў сілу з трыццатага дня пасьля здачы на захаваньне ягонай ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб ухвале.

4. Генэральны сакратар паведамляе чальцам Рады Эўропы і Генэральнаму дырэктару Міжнароднага бюро працы пра ўступаньне ў сілу Хартыі, пра Дамоўныя бакі, якія ратыфікавалі або ўхвалілі яе, і пра пазьнейшую здачу на захаваньне любой ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб ухвале.

Артыкул 36

Папраўкі

Любы чалец Рады Эўропы можа прапанаваць папраўкі да гэтай Хартыі праз паведамленьне, накіраванае на імя Генэральнага сакратара Рады Эўропы. Генэральны сакратар накіроўвае іншым чальцам Рады Эўропы любыя прапанаваныя такім чынам папраўкі, якія разглядаюцца Камітэтам міністраў і прадстаўляюцца на заключэньне Кансультатыўнай Асамблеі. Любыя папраўкі, зацьверджаныя Камітэтам міністраў, уступаюць у сілу з трыццатага дня пасьля таго, як усе Дамоўныя бакі інфармуюць Генэральнага сакратара пра сваё прыняцьце гэтых папраўак. Генэральны сакратар паведамляе ўсім чальцам Рады Эўропы і Генэральнаму дырэктару Міжнароднага бюро працы пра ўступаньне такіх папраўак ў сілу.

Артыкул 37

Дэнансацыя

1. Любы Дамоўны бок можа дэнансаваць гэтую Хартыю толькі пасьля сканчэньня пяці гадоў з даты ўступленьня ў сілу альбо пасьля сканчэньня любога наступнага двухгадовага пэрыяду і ў любым выпадку мусіць пры гэтым накіраваць за шэсьць месяцаў папярэдняе паведамленьне на імя Генэральнага сакратара Рады Эўропы, які інфармуе пра гэта іншыя Дамоўныя бакі й Генэральнага дырэктара Міжнароднага бюро працы. Такая дэнансацыя не закранае дзеяньняў Хартыі ў дачыненьні да іншых Дамоўных бакоў пры ўмове, што колькасьць гэтых апошніх ні ў які момант ня будзе меншай за пяць.

2. Любы Дамоўны бок можа ў адпаведнасьці з палажэньнямі папярэдняга пункта дэнансаваць любыя прынятыя ім артыкул альбо пункт Часткі II Хартыі пры ўмове, што колькасьць артыкулаў альбо пунктаў, якія зьяўляюцца абавязковымі для такога Дамоўнага боку, ніколі не складалі менш за 10 у першым выпадку і менш за 45 — у другім выпадку, і што ў гэтую колькасьць артыкулаў альбо пунктаў па-ранейшаму ўваходзяць выбраныя Дамоўнымі бакамі артыкулы, якія адносяцца да ліку тых, пра якія адмыслова згадваецца ў падпункце «b» пункта 1 артыкула 20.

3. Любы Дамоўны бок можа дэнансаваць гэтую Хартыю альбо любы з артыкулаў альбо пунктаў Часткі II Хартыі на ўмовах, пазначаных у пункце 1 гэтага артыкула, у дачыненьні да любой тэрыторыі, на якую распаўсюджваецца дзеяньне Хартыі з прычыны заявы, зробленай у адпаведнасьці з пунктам 2 артыкула 34.

Артыкул 38

Дадатак

Дадатак да гэтай Хартыі зьяўляецца ейнай неад'емнай складовай часткай.

У пацьверджаньне чаго ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі гэтую Хартыю.

Зьдзейсьненае ў Турыне 18 кастрычніка 1961 году, на французскай і ангельскай мовах, пры гэтым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які будзе захоўвацца ў архівах Рады Эўропы. Генэральны сакратар адпраўляе належным чынам засьведчаныя копіі ўсім бакам, якія падпісалі Хартыю.

**Працяг. Пачатак у папярэднім нумары «НН».*

КГБ ПА-НЯМЕЦКУ: ШТАЗІ

Працяг са старонкі 1.

— Мы прадстаўляем інтарэсы рабочага чалавека. Гэта была галоўная задача, ускладзеная на нас парлямэнтам, і мы яе заўсёды імкнуліся выконваць. Гэтага не заўсёды было лёгка дасягнуць, даводзілася працаваць у цяжкіх умовах. І усё ж, таварышы! Шаноўныя члены парлямэнту! Мы падтрымлівалі надзвычай цесны кантакт з працоўнымі.

Замест апладысмэнтаў грымнуў сьмех. Усе ведалі, пра які «цесны кантакт з працоўнымі» гаварыў Мільке. Праз чатыры дні пасьля падзеньня Бэрлінскай сьцяны немцы сьмяяліся над чалавекам, якога больш за ўсіх баяліся і ненавідзелі ва Ўсходняй Нямеччыне.

Нямецкія ўлады і розныя незалежныя арганізацыі падыйшлі да дзейнасьці Штазі гэтаксама як да нацысцкага мінулага: было вырашана адкрыць як мага болей інфармацыі шырокаму грамадзтву, уцягнуць людзей у гэты працэс. (Гэта досьвед апошняй траціны стагодзьдзя. Адразу пасьля вайны пра мінулае ў Нямеччыне не гаварылі, яго імкнуліся забыць, спрабавалі жыць, як быццам яго не было. Многія ў Нямеччыне лічаць, што працэс дэнацыфікацыі даў вынікі толькі ў 70-я гады, калі аднавілася публічная дыскусія пра часы нацызму).

У канцы 1991 году Бундэстаг прыняў «Акт аб дакумэнтах міністэрства дзяржбясьпекі», які вызначыў накірункі працы. Была ўведзеная пасада Фэдэральнага камісара Архіваў дзяржаўнай службы бясьпекі былой ГДР, якую ўзначаліў вядомы ў ГДР пастар Ёхім Гаўк. Штат камісіі склаў 3.200 чалавек — архівістаў, дасьледчыкаў, юрыстаў. Аддзел архіваў камісіі займаецца захаваньнем і апрацоўкай дакумэнтацыі. Праз Інфармацыйны аддзел ахвяры маюць доступ да сваіх справаў, сюды адрасуюцца запыты судоў і іншых дзяржаўных установаў. У адукацыйна-дасьледчым аддзеле вывучаюць структуру, мэтады, апэратыўную дзейнасьць Штазі.

За апошнія восем гадоў пабачылі сьвет дзясяткі кніг, ад афіцыйных публікацыяў дакумэнтаў, журналісцкіх расьсьледаванняў і акадэмічных манаграфіяў да мэмуараў усходніх немцаў (як ахвяраў, гэтак і калябарантаў Штазі). Сёньня агульная колькасьць публікацыяў і кніжных выданьняў на гэтую тэму вымяраецца тысячамі назоваў.

Тым ня менш, у Нямеччыне лічаць, што апрацоўка дакумэнтаў Штазі ўсё яшчэ ў пачатковай стадыі. За камуністычным часам у архівах Штазі, раскіданых па ўсёй Усходняй Нямеччыне, былі сабраныя ня тысячы, а мільёны дакумэнтаў. Нямецкі пісьменьнік-дысыдэнт Стэфан Гэйм адзначыў з гэтае нагоды: «Наўрад ці калі-небудзь які-небудзь гістарычны пэрыяд быў так шырока і дасканала дакумэнтаваны, як сорак гадоў ГДР яе сакрэтнай паліцыяй».

ІНВЭНТАР САЦБУДАЎНІЦТВА

... Тут, у нюрнбэрскім архіве асабліва востра адчуваеш, што папера ёсьць прадуктам культуры, які ня так проста зьнішчыць. Дакумэнты палілі, кідалі ў паперадрабілкі, але магутнасьцяў не хапала, і стала ясна, што ўсе тэксты не спаліць, не ператрушчыць, не разьвеяць па ветры — час Штазі катастрафічна скарачаўся. І тады прыйшоў загад — ірваць.

Попел, як і старонкі, прапушчаныя праз папераздрабняльныя машыны, не падлягаюць аднаўленьню. Аднак чалавечыя рукі, нават калі гэта рукі гэбістаў, ня надта дасканалыя ў справе зьнішчэньня сьлядоў — парванае можна склеіць. Такіх рукатворных абрыўкаў набралася 5.650 мяхоў. А адзін мех набівалі каля 6000 старонак дакумэнтаў.

Памеры Штазі даюць пэўнае ўяўленьне пра маштаб задачаў гісторыкаў. Бюджэт ГДР у апошні год яе існаваньня выдаткаваў Штазі 3,6 мільярды марак, або 1,3% нацыянальнага бюджэту. У гэтым жа годзе Штазі праводзіла інвэнтарызацыю. Паводле яе, Штазі мела: 18.000 кватэраў, 1.262 офісы, 1.181 сакрэтную навучальную базу і схованку, 14 гатэляў, 305 дамоў адпачынку, 99 спартовых комплексаў, 67 мясцовых камандных пунктаў і пунктаў сувязі, уласны шпіталь і рэабілітацыйны цэнтар ва Ўсходнім Бэрліне.

Штазі належала 12.093 аўтамабілі, 5.450 грузавікоў і аўтобусаў, 124.504 рэвальвэры і пісталеты, 76.592 аўтаматы, 3.611 снайпэрскія вінтоўкі, 1.215 кулямётаў, 3.537 адзінак супрацьтанкавых узбраеньняў.

У гэтым сьпісе няма самалётаў, верталётаў, падводных лодак і баявых караблёў, але Штазі, безумоўна, мела доступ і магла карыстацца ўсімі наяўнымі ў краіне сродкамі барацьбы за сацыялізм.

Прыведзены пералік — толькі жалеза, як на кампутарным жаргоне называюць мэханічную частку кампутара. Прыводзяць у дзеяньне, запускаюць, ажыўляюць усе органы таталітарнага цмока людзі — іх называюць «кадры».

ПІРАМІДА НС

... Я хадзіў па калідорах архіву, гутарыў з супрацоўнікамі, разглядаў шматкі з тэкстамі і нават нотамі, паспрабаваў падняць адзін мех: ён важыў каля пуду. Мне патлумачылі, што вага залежыць ад таго, як старанна парваная папера: чым драбней, тым цяжэй. Ёсьць старонкі, парваныя проста напалам, ёсьць — на дзясяткі шматкоў. Рэкорд — аркуш, склеены з 98 абрыўкаў. Я спытаўся, што было на тым аркушы, чаму яго ірвалі так старанна, мэтадычна, карпатліва, чаму так не хацелі, каб яго пабачыла чужое вока, што хавалі і чаго баяліся больш за ўсё?

Гэта быў сьпіс, сказалі мне, два з паловай дзясяткі прозьвішчаў.

— Якіх прозьвішчаў? — спытаўся я.

— «эНэСаў» — быў адказ.

Паводле дакумэнтаў, у Штазі налічвалася каля 91 тысячы штатных супрацоўнікаў. Яны працавалі ў цэнтральным апараце ў Бэрліне, у пятнаццаці рэгіянальных цэнтрах і ў некалькіх сотнях мясцовых канцтораў Штазі. Гэта кадравыя афіцэры і унтэрафіцэры, службоўцы, для якіх Штазі была афіцыйнам месцам працы.

Іх вачыма, рукамі, вушамі былі «ІМ» — так ў нямецкай мове гучыць скарачэньне «неафіцыйны супрацоўнік» (эНэС), як называлі агентаў у ГДР. Паводле адных крыніцаў, 109 тысячаў немцаў шпіёнілі за суграмадзянамі на час падзеньня Бэрлінскай сьцяны, іншыя прыводзяць лічбу ў 180 тысячаў — 1% насельніцтва. (У друку сустракаецца і лічба 300 тысячаў.)

НСы перадавалі свае данясеньні прыкладна 12 тысячам штатных супрацоўнікаў. На аднаго афіцэра прыпадала каля 12 эНэСаў на раённым узроўні і каля 3-5 на больш высокім ўзроўні ўправаў.

Апроч эНэСаў, існавалі так званыя «агульныя супрацоўнікі», АэСы, якія давалі толькі падпіску аб неразгалошваньні. Інструкцыі Штазі вызначалі розьніцу паміж гэтымі дзьвюма катэгорыямі агентаў наступным чынам: «АэСы звычайна дзейнічаюць зь меншай сакрэтнасьцю, чым эНэСы». Паколькі кантакты з АэСамі звычайна не дакумэнтаваліся, дакладнай інфармацыі пра тое, колькі нямецкіх грамадзянаў мела сувязь са Штазі ў такой форме, не існуе.

Пасьля вярбоўкі эНэС мусіў падпісаць афіцыйную заяву, у якой браў абавязак заўсёды падтрымліваць Штазі, нават у справах супраць сваякоў і блізкіх сяброў.

Прыкладна палова эНэСаў працавала пад кіраўніцтвам цэнтральнага апарату, а другая палова — на мясцовыя філіі Штазі. Насуперак распаўсюджанаму меркаваньню, эНэСаў выбірала сама Штазі, дабраахвотнікаў амаль не прымалі. Штазі перш за ўсё цікавілі асобы, найбольш карысныя зь яе пункту гледжаньня, зусім не абавязкова найбольш палітычна лаяльныя. Каштоўнага кандыдата часам вырошчвалі на працягу некалькіх гадоў. У падручніках Штазі згадваюцца тры асноўныя вэрбовачныя тэхналёгіі: апэляцыя да палітычных і ідэалягічных перакананьняў; прапанова фінансавых альбо іншых выгодаў; у якасьці апошняга сродку — шантаж.

Для параўнаньня: у 1989 годзе, пасьля краху ўлады КПСС у Літве, у Вільні апублікавалі некаторыя сакрэтныя дакумэнты КГБ, у іх ліку інструкцыі, фармуляры, анкеты. Стандартная анкета агента-асьведамляльніка складалася з 29 параграфаў. Апроч біяграфічных зьвестак, афіцэр-вэрбоўшчык, які запаўняў анкету, мусіў напісаць адказы на шэраг пытаньняў, у тым ліку падрабязна выкласьці мэту вэрбоўкі. Аднак, паколькі справа была пастаўленая на паток, дык для зручнасьці ў падрадкоўніку дробным шрыфтам прыводзіліся тыповыя адказы. Параграф нумар 23 «Завэрбаваны» прадугледжваў наступныя варыянты працягу: «на патрыятычнай глебе, з выкарыстаньнем кампраматэрыялаў, з варожага асяродку». Пытаньне нумар 24 «Супрацоўнічаць пагадзіўся», паводле досьведу КГБ, мела такія верагодныя адказы: «ахвотна, хістаўся, пасьля доўгага перакананьня, паставіў умовы і г.д.». У наступнай графе адзначаліся «каштоўныя асабістыя якасьці» агента: «памяць, назіральнасьць, аналітычныя здольнасьці, здольнасьць уваходзіць у давер, фізычная сіла, валявыя якасьці, здольнасьць да пераўвасабленьня і г.д.» Далей у анкеце ішло пытаньне «Якія маe спэцыфічныя магчымасьці». Падрадкоўнік прыводзіў некаторыя зь іх: «выезды ў іншыя раёны, наведаньне прыватных кватэраў паводле характару працы, маe лецішча, уласную аўтамашыну, умее вадзіць аўтатранспарт і інш.» Пытаньне нумар 27 фіксавала «асабістыя інтарэсы, зацікаўленьні і схільнасьці», сярод іх «спорт, паляваньне, музыка, мастацтва, зьбіраньне калекцыяў, турызм, радыёаматар, кінафотааматар, аматар гульні ў карты і іншых азартных забаваў». Перадапошняе пытаньне ацэньвала «надзейнасьць агента». Трэба было адзначыць, ці агент «праверaны праз агенturу, з выкарыстаньнем апэратыўна-тэхнічных сродкаў і інш. вынікі праверкі» Завяршала анкету фактычна яшчэ адна анкета «Зьвесткі пра асабістыя сувязі, якія маюць апэратыўную цікавасьць». Сюды заносіліся імёны, адрасы, прафэсіі знаёмых новасьпечанага агента і зьвесткі пра іх, якія «заслугоўваюць апэратыўнай увагі».

Ідэалісты ўзначальваюць сакрэтныя службы ў таталітарных дзяржавах толькі на пачатку іх дзейнасьці. Ім на зьмену прыходзяць садысты-каты і цынікі-прагматыкі. Штазі вызначала імкненьне да найбольшай магчымай эфэктыўнасьці. Дзеля гэтага ўсе эНэСы былі падзеленыя на шэсьць асноўных катэгорыяў.

Найбольш агульным быў «неафіцыйны супрацоўнік дзеля пранікненьня і забесьпячэньня зоны адказнасьці». Звычайна такія эНэСы зьбіралі рознаплянавую інфармацыю і сачылі за пэўнай групай людзей, часта на працы. Усё, што заслугоўвала ўвагі, эНэС паведамляў свайму непасрэднаму начальству, у бальшыні выпадкаў «неафіцыйнаму супрацоўніку-кіраўніку іншых неафіцыйных супрацоўнікаў».

Часам Штазі імкнулася завэрбаваць агента з блізкіх знаёмых якога-небудзь вядомага дысыдэнта. У такім выпадку эНэС атрымліваў павышэньне і клясыфікаваўся як «неафіцыйны абарончы супрацоўнік з сувязямі з ворагам і/альбо беспасярэдным уплывам на асобаў, якія падазраюцца ў варожай дзейнасьці». Яшчэ адзін кшталт — «эНэС для бясьпекі кансьпіратыўнай дзейнасьці і сувязі». Гэтыя эНэСы мусілі быць у любы час гатовыя знайсьці транспарт і прытулак для правядзеньня сакрэтных апэрацыяў Штазі.

Больш рэдка сустракаецца «эНэС для спэцыяльных заданьняў» — асоба, якая займае важную пасаду альбо валодае дасьведчанасьцю экспэрта, да якой зьвяртаюцца па кансультацыю альбо дапамогу ў правядзеньні асабліва важнай апэрацыі. У надзвычайных выпадках у якасьці «эНэСа цэнтральнай управы» выкарыстоўваўся кадравы супрацоўнік Штазі.

Колькасьць эНэСаў у кожнай з названых катэгорыяў зьмяншалася паводле важнасьці, уся структура нагадвала піраміду, дзе самыя каштоўныя супрацоўнікі месьціліся бліжэй да верху. Калі ў ніжэйшых клясах лічбы эНэСаў незадакумэнтаваныя, дык дакладна вядома, што на канец 1989 году ў Штазі налічвалася 3.030 так званых «афіцэраў для спэцзаданьняў». Іх вызначала высокая прафэсійная падрыхтоўка і лаяльнасьць да сацыялістычнай дзяржавы, яны займалі ўсе ключавыя пасады ў дзяржаўных установах ГДР і нярэдка дакладалі наўпрост кіраўніцтву Штазі. Піраміду вянчала элітная катэгорыя — каля ста «невядомых супрацоўнікаў» — шпіёны за шпіёнамі, якія сачылі за іншымі эНэСамі.

180 КМ ЧЫТАНЬНЯ

... У архіўных пакоях, дзе ідзе працэс аднаўленьня мінулага тайнай паліцыі, усё зьнешне вельмі проста і звычайна. Стаяць кавaваркі і кубачкі для гарбаты, на сьценах вісяць фатаграфіі членаў сям'і ці папулярных актораў. На паліцах — пакункі спэцыяльнай празрыстай стужкі для склейкі. У адной катушцы — 50 мэтраў паласы шырынёй два сантымэтры.

— Што гэта ў вас за графікі — зьвярнуў я ўвагу на разгалінаваны каляндар студзеня зь нейкімі лічбамі насупраць датаў, які вісеў ля ўваходу.

— Паказчыкі, колькі аркушаў удалося аднавіць за дзень, — патлумачылі мне. Лічбы сьведчылі пра прадукцыйнасьць працы: 3, 9, 8, 0, 0, 8, 6...

— Бывалі тыдні, калі не маглі скласьці ніводнага аркуша. Бывала, складалі некалькі дзясяткаў за дзень. Як пашанцуе зь мехам...

У сярэднім аднаму архівісту патрабуецца на аднаўленьне аднаго мяха каля трох месяцаў.

Інфармацыю звычайна вымяраюць байтамі, колькасьцю словаў, радкоў, старонак, кніг. Нямецкі вопыт даў новую адзінку: кілямэтра-мяхі. У цэнтральнай архіўнай управе Штазі ў Бэрліне тэчкі са справамі запоўнілі паліцы агульнай даўжынёй 100 кілямэтраў. У пятнаццаці акруговых архівах паліцы цягнуліся яшчэ на 78 кілямэтраў. Гэта дарога ад Менску да Вільні.

Паводле ацэнак, гэтая калекцыя налічвае больш за паўтара мільярды старонак. Апроч таго, у Бэрліне ў кампутарызаваным архіве захоўвалася 6 мільёнаў індывідуальных біяграфічных даведак на ўсходніх немцаў і замежнікаў.

Сюды трэба дадаць і тыя 17.000 мяхоў рэзанай ды ірванай паперы, якія знайшлі дэманстранты, калі 15 студзеня 1990 году ўварваліся ў будынак Штазі ва ўсходнім Бэрліне. Гэта каля ста мільёнаў старонак даносаў, рапартаў, фатаздымкаў, відэа і аўдыёзапісаў. Перад гэтым з комплексу будынкаў Штазі тыднямі разносіўся пах паленай паперы.

Прыкладна траціна зьнішчаных, але адноўленых дакумэнтаў — матэрыялы сачэньня за актывістамі-дэмакратамі і царкоўнымі дзеячамі ў 80-я гады, але сустракаюцца і матэрыялы на перабежчыкаў, якія загінулі пад час пераходу Бэрлінскай сьцяны яшчэ на пачатку 60-х гадоў.

У 1992 годзе у Бэрліне выйшла кніга «Чытаючы нашыя справы: падручнік для вывучэньня тэчак Штазі». У ёй аналізуецца парадак і арганізацыя дзейнасьці Штазі, у тым ліку тры асноўныя апэратыўныя працэдуры. Першая і самая масавая — так званая «праверка дабранадзейнасьці». Яе мэта — спраўдзіць, ці можна даверыць той ці іншай асобе намэнклятурную пасаду.

Другая ступень — «апэратыўная асабістая праверка», якую праводзілі, калі чалавека падазравалі ў «нармальнай» крымінальнай альбо палітычнай, дысыдэнцкай дзейнасьці. У такім выпадку Штазі, апроч вывучэньня дакумэнтаў і біяграфіі, працавала са знаёмымі і калегамі аб'екта праверкі дзеля збору дадатковай інфармацыі. Самай пільнай акцыяй, з прыцягненьнем вялікай колькасьці супрацоўнікаў і тэхнічных рэсурсаў, былі так званыя «апэратыўныя захады». Да іх зьвярталіся, калі Штазі знаходзіла прыкметы дзейнасьці «варожанэгатыўных сілаў» крымінальнага альбо дысыдэнцкага кшталту.

Гэтыя апэрацыі парушалі тайну перапіскі і сувязі, гарантаваныя сацыялістычнай канстытуцыяй ГДР. Пэрлюстрацыяй пошты займаліся спэцыяльныя службы мясцовых аддзяленьняў сувязі. Архівы сьведчаць, што, у залежнасьці ад пільнасьці мясцовых уладаў, у 80-я гады ў ГДР пераглядалася ад 1 да 5% ўсёй пошты.

Тэлефоны праслухвала так званая Управа 26. Ва Ўправе 26 у 1989 годзе працавала 1.486 чалавек, якія маглі адначасова праслухоўваць 3.780 міжгародных тэлефонных размоваў і кантраляваць 50 лініяў тэлексу. Поўныя магутнасьці выкарыстоўваліся ня часта, напрыклад, пад час правядзеньня Лейпцыгскага кірмашу; звычайна Ўправа праслухоўвала і запісвала ад 1000 да 2000 званкоў у кожны дадзены момант.

Прыкладна палова ўсіх заявак на праслухоўваньне паступала ад 2-й Цэнтральнай Управы — усходненямецкай контрвыведкі. 20% складалі размовы дысыдэнтаў і супрацоўнікаў ключавых дзяржаўных установаў — гэта былі кліенты 20-й

Працяг на старонцы 16.

Падаюць сыняжынкі, дыямэнты-росы...

Бывае, выходзіш з хаты і, у залежнасьці ад таго, што перад сабой бачыш, міжволі згадваеш паэтычныя радкі. Або шпацыруеш зь сябрамі па Вільні і незнарок пачынаеш дэклямаваць: «Скажы мне, Вільня, хто твой сын законны»... У Менску напяваеш: «Родны мой горад, любоў мая». І кожнага разу адно тое самае не надакучвае. А бывае, ідзеш удваіх і, не дамаўляючыся, не пераглянуўшыся нават, дэклямуеш дуэтам тыя самыя словы. Памятаю, выходзім са школы ў першы сьнег і пачынаем на розныя лады: «Зима, крестьянин торжествуя»... Школа была насупраць ЦК КПБ, таму можна ўявіць сабе ўмоўнасьць гэтых словаў, апрача хіба слова «зіма». Гэтак глыбокае адчуваньне таго, што адбываецца ў прыродзе, змушае казаць паэтычнымі словамі. Пазьней, з набыцьцём беларускай тоеснасьці, гэты працэс ускладніўся. Бо словы школьнае праграмы яшчэ й самі сабою перакладаліся на беларускую мову. «Зіма, вясковец урачыста на санках абнаўляе шлях, ягоны змораны каніска цягнецца цугам абы як»... і далей якая-небудзь ужо поўная абракадабра, але з захаваньнем ранейшага настрою.

Нашыя аўтары выйшлі раніцою ў свае засьнежаныя за ноч двары і кожнага зь іх асяніла свая думка. Зьміцер Бартосік разважаў якраз пра цытаты.

Прага заўтрашняй цытаты

Іншым часам у мяне ўзьнікае ўражаньне, што наша літаратура ад часоў першай «Нашай Нівы» нічога вартага цытаваньня не нарадзіла. Прычым не адмыслова адшуканай цытаты дзеля большай важкасьці ўласнае думкі, а таго, што напрошваецца на язык міжвольна. І амаль усё, што лавіла маё вуха ў размовах зь сябрамі, было напісанае амаль сто гадоў таму. «Няма таго, што раньш было», — з тэатральнай скрухаю ў голасе кажа мой сябра, аглядаючы паліцы півярні і не знаходзячы на ёй беларускіх гатункаў. Другі, штурмуючы набіты аўтобус, любіць уставіць «Падымайся зь нізін, сакаліна сям'я». Што цікава, дапамагае. Падымаюцца з радасьцю. Асобная тэма — эпітэты на адрас роднага народа. Тут нашыя клясыкі пашчыравалі ад душы, даючы нам, сёньняшнім, магчымасьць не займацца хаця б гэтым —абуджэньнем уласнага люду з гразі, з каленаў, зь ярма, з лапцёў і да таго падобнага. Ды, разам з тым, пры кожным зручным выпадку згадваем і што «сьляпы, быццам крот», і «дурны, як варона» ды іншыя красамоўнасьці, ад якіх любы нармальны чалавек моцна засумняваецца — а ці сапраўды ён здаровы? Нібы пратэстуючы супраць гэтага лапцюжніцтва, ці, можа, успрыняўшы яго як асабістую абразу, мой трэці знаёмы пры кожным адпаведным выпадку не бяз гонару кажа — «хай я дурны, але ж мужык». Але ж клясыкаў ня судзяць. І цытуем мы іх не таму, што яны клясыкі, а клясыкі — таму што мы цытуем.

Цікава, што ў нашаніўскім сьпісе ста лепшых кніг няма прозьвішча Аркадзя Куляшова. Аднак зь якою б гіроніяй мы ні прыгадвалі юнака, што «цьвёрда трымаўся на дапросе», той юнак пражыве нас і нашыя прагнозы. Асабіста мне падабаюцца Куляшоўскія лірычныя радочкі «пайшла ты, любая, пад гоман жоўтых сосен». Не з адною любаю я такім чынам разьвітаўся, але крыўдаў не было. Усё ж клясыка! А адно клясычнае выказваньне суправаджае нас ужо больш за стагодзьдзе. Тое, пра не пакідайце, каб ня ўмёрлі». Невядома, колькі ж стагодзьдзяў нас чакае пад такім жыцьцесьцьвярджальным лёзунгам. Магчыма, пакуль не памрэм.

Адкуль гэткая беднасьць? Ад нашай нецікавасьці да ўласнай афарыстыкі? Ці ад нашай ляноты зрабіць удалы сказ крылатым? У адсутнасьць годнага матэрыялу я ня веру. Веру, што ўдала напісанае слова ў дзясяткі разоў узмацняецца, калі становіцца ўдала, да месца й не аднойчы прамоўленым. Я таксама схільны думаць, што характар нашых цытатаў служыць сваеасаблівай афарбоўкай нашага часу, ці ягоным знакам. І з асьцярожнаю радасьцю ўсё часьцей заўважаю, як шэрыя колеры «кутка цемнаты» патроху саступаюць месца «маёй краіне пад белым сьцягам». Таму што — «наша, не чужое». Таму што — «былі, ёсьць і будзем». Таму, урэшце рэшт, што «з намі анёл абаронца, з намі Божая маці».

Зьміцер Бартосік

Партрэт Уласава

У Вільні сьнег... Я стаю ля мальбэрта і, згадваючы колішні свой занятак, пішу партрэт Аляксандра Ўласава. Сьнег пасяляе ў душы ўрачыстасьць, а асоба Ўласава ўвасабляе высакародзтва.

Першае, што легла на палатно — вусы, бялюткі каўнер і чорны гальштук. Тытан беларускага адраджэньня меў буйную атлетычную паставу, але пры гэтым не цураўся сьвецкага кшталту. І пры гэтым жа быў бясконца вынаходлівым жартаўніком і жыцьцялюбам...

Зайшоў брат. Заўважыўшы, што фарбамі пахне на ўвесь пад'езд, запытаўся, чый будзе партрэт — Багушэвіча ці Купалы? Як для Багушэвіча вусы кароткія, як для Купалы — завялікія...

Вобраз Уласава, першага рэдактара «Нашае Нівы» ад 1906 году, за савецкім часам не дапускаўся ў нацыянальны пантэон, дзе іншыя постаці ўжо маюць свае непазьбежныя стэрэатыпныя аксэсуары. Хоць са сьпіны, але мы пазнаем Скарыну па барэце, Каліноўскага па хустцы на шыі, Багушэвіча — па вусах. Урэшце, вобраз можа быць цалкам прыдуманым. Яўген Кулік зрабіў свой аўтапартрэт і назваў гэта партрэтам Гусоўскага. Сёньня менавіта гэты вобраз уважае за паэта-гуманіста любы школьнік.

Нацыянальныя сыстэмы адаптаваных герояў, дзе кожнаму адведзенае сваё месца на грашовых знаках, марках, этыкетках, паштоўках, сувэнірах — гэта тое асяродзьдзе, у якім адбываецца этнічная штодзённасьць і па якой нацыі пазнаюцца ў сьвеце. Украінцы выявілі на грашах кіеўскіх князёў. Вялікая нацыя — вялікія задачы. Чэхі тыражуюць дурасьлівага Швэйка, аўстрыякі паўсюль выяўлюць Моцарта, ангельцы на кожнай марцы ставяць профіль каралевы, хоць бы і побач з бэгемотам... Французы прысягаюць Свабодзе, бясконца штампуючы сваю Марыяну ў фрыгійскім каўпаку санкюлётаў ад першай да апошняй манэткі, ад статуяў да перачніцаў. Напалеон таксама заняў сваё трывалае месца на бутэльках каньяку, значках і цэтліках. Ягоны вобраз настолькі выразны, што нам дастакова контуру трохвуголкі, альбо манаграмы «N», каб прыгадаць, што Францыя — радзіма ня толькі свабоды, але й невынішчальнага банапартызму. Амэрыканская традыцыя іншая, дзяржаўніцкая. З аднаго боку недасяжная, халодная як сфінкс Свабода, імпартаваная з Парыжу. А з другога: шчыльны шыхт бацькоў нацыі — усіх прэзідэнтаў, якіх па прафілях любы амэрыканец пазнае, не раўнуючы, як савецкі чалавек Маркса-Энгельса-Леніна. Дзеля жарту быў прыдуманы дзядзька Сэм, зь якім можна выраблять што заўгодна. Але немагчыма ўявіць сабе паралёнавага Вашынгтона. Нямеччына за часамі нацыянал-сацыялістаў зьмяніла толькі адзін тыпаж на сваіх дзяржаўных атрыбутах. Задоўга да Гітлера, выдатна распрацаваныя ў профіль і ў анфас кайзэр Вільгельм і фон Гіндэнбург ужо акрэсьлівалі мэнталітэт паўстаючае германскае нацыі. Жалезныя людзі. Па вайне немцы рашуча прыбралі выявы дзяржаўных дзеячоў. Засталіся літаратары, гуманісты, вучоныя (Гутэнбэрг, Дзюрэр, браты Грым). На маё шчырае зьдзіўленьне, гэткім жа шляхам пайшлі і літоўцы: перад сапраўднымі і мітавымі князямі на ўсіх грошах і марках зьявіліся найперш паэты...

У нашым нацыянальным пантэоне сыстэма клішэ была разьвітая толькі ў савецкім кантэксьце. І сёньня паштовыя стандарты Каліноўскага, Багушэвіча, Купалы нібы завісьлі паміж кантэкстамі ўжо і яшчэ няісных дзяржаваў: савецкай і беларускай. Рана ці позна нам давядзецца ствараць сыстэму сваіх клішэ нанова. Гэта адбудзецца тады, калі творцаў ахопіць прага высакародзтва і чысьціні. Найлепей такое пачуцьцё пражываецца, калі падае сьнег. Напрыклад, вось гэты віленскі сьнег, які, магчыма, і падказаў мне мой выбар.

Я думаю пра тое, як салідна і прывабна некалі будзе выглядаць сэрыя беларускіх паштовых стандартаў: дзяржаўны герб «Пагоня», Вострая Брама і партрэт Аляксандра Ўласава.

Сяргей Харэўскі

Братаў ліст

Часам я забываюся пра факт існаваньня паштовае скрынкі. Сыходзячы на працу, проста не гляджу ў той бок. На гэтай плянэце жыве надта мала людзей, якім собіла б напісаць мне пару старонак. Таму адзін Бог ведае, колькі гэтая капэрта правалялася ў маёй паштовай скрыні. Фарбра на штэмпэлі размазаная ці то непагодаю, ці то гарбатаю з лістаношаўскага кубка. Гэта ліст ад майго брата.

Ён маладзейшы за мяне на шэсьць гадоў. Ліставаньне наша ідзе млява. Дзясятак старонак, вырваных са школьнага сшытка за год — гэта ўжо добра. Ліст як ліст. Састарэлыя навіны з дому, пра вучобу, пасьпяхова перанесены грыпус, пра сабачку з вульгарнаю мянушкаю Бім ды беспрасьветную мару паехаць у Чэхію па «Аўдзі-80», і абавязковым рэфрэнам ідзе заклік прыехаць да хаты. Адно разанула вока: «... бабе Машы спаўняецца, як і Кастрычніцкай рэвалюцыі, 80 гадоў...» Падумаў, досьціп такі. У нашай сям'і не было традыцыі весьці адлік часу ад гэтай даты. Але наступная старонка цалкам абвергла гэтую вэрсію.

«Андранік, у нас у Беларусі ўсё спакойна. Ня вер пагалоскам, што ў нас сілаю насаджаецца дыктатура Лукашэнкі, а вер мне. Тут праводзяцца лекцыі й ніякага тэрарызму. А саджаюць членаў БНФ, за тое, што яны хуліганілі ды шкодзілі. Сёлета азьвярэлыя бэнэфоўцы пабілі міліцыю й пераскідвалі міліцыйскія машыны. Яны імкнуліся парушыць парадак, але міліцыя не засталася ў баку. Яна зьбіла хуліганаў дубінкамі й пасадзіла іх у турму. Страшна было глядзець, як азьвярэлыя бэнэфоўцы раскідвалі дарагія міліцэйскія машыны (у майго брата, відаць, як у таго Казьлевіча з «Залатога цяляці», аўтамабільны пункцік), і зьбівалі міліцыю. А кіраўнікі БэНэФэ, ратуючы сваю скуру, адмаўляюць віну, абвяшчаюць галадоўкі й г.д. Гэта вельмі сумна! Лукашэнка гатовы мірыцца з БэНэФэ, але не выходзіць. На гэтым тыдні ў маёй школе была лекцыя на тэму палітыкі Лукашэнкі. Гэтая лекцыя нікому не спадабалася. Я наогул ня слухаў і ўпотайкі спаў. А настаўнікі пільнавалі, каб вучні слухалі лектара, але я аказаўся спрытнейшым. Я ведаю, навошта праводзілася гэтая лекцыя! Яны (менавіта таямнічыя «яны») адмыслова Гэта правялі, каб у будучыні Лукашэнка перамог на выбарах». А далей, як і нічога такога, брацік мой піша пра першыя тамы «Беларускай энцыкляпэдыі», якія набыла мне матка.

Пасьля прачытаньня ў маю галаву палезьлі пытаньні. Навошта ён гэта напісаў? З уласнае ахвоты, альбо паслухаўся якога добрага дзядзьку з пагонамі? Уплыў маіх заўсёды скептычна настроеных да палітыкі бацькоў на такую хаду думак — малаверагодны. І тут яшчэ гэтая параналдальная прага стаць уладальнікам патрыманай «Аўдзі-80». Паабяцалі заплаціць?..

Калі ён гэта напісаў з уласнае ахвоты, то вочы яму не расплюшчыш ніякімі кніжкамі пра менскія вёсны ды кіпучыя чэкісцкія работы. Дарослы чалавек. Ён ня будзе на іх сур'ёзна глядзець, як я ня здатны ўспрымаць патас «Советской Белоруссии». Тут трэба прыдумляць нешта іншае. Але хай тым займаюцца ідэолягі. Мне ж цяжка асэнсаваць, што малое, за якім ты выносіў гаршчкі, мерз у чэргах па дзіцячае харчаваньне — выгадавалася на чалавека, зь якім няма ахвоты спрачацца. Яшчэ я спрабаваў узгадаць, што штурхала мяне адказаць на маміна прыцішанае пытаньне: «Ты што хочаш — ровар ці браціка?» — «Браціка». Сёньня рацыянальнага тлумачэньня гэтаму ўчынку знайсьці не магу, але й не шкадую. Бо ад маіх жаданьняў тады мала што залежала, як і мала што залежыць цяпер.

У блізкіх сваякоў звычайна вельмі падобныя почыркі. Мы з братам не выключэньне. Чужы чалавек не адразу скажа, дзе маёю рукою пісана, а дзе братавай.

Андранік Антанян

... Але вернемся да цытатаў. Мне раптам прыгадаўся Адамовіч. Апошнім часам менавіта ягоныя радкі міжволі прыходзяць у галаву з нагоды ўсялякіх атмасфэрных зьменаў. «Канчаецца лета, яблычны спас, пра Афрыку мараць птушкі»... Або: «Каляды, посная куцьця, ня піша пісем арганістка»... Не спатрэбліваецца нават страфы, дастаткова аднаго-двух радкоў. Можа, іх увогуле дастаткова? Але да монавершаў у нас ставяцца насьцярожана. Яны прачытваюцца хутка, таму хутка і забываюцца.

Славамір Адамовіч цытуецца часта, дарма што ён пакуль ня клясык са школьнае праграмы, а толькі былы сядзелец Віцебскага цэнтралу, галадоўшчык. Ягоныя вершы згадваюцца, хоць іх і не сьпявалі. Вось Глёбуса сьпявалі і шмат. Праўда, ці менавіта гэтым выкліканая запамінальнасьць ягоных радкоў, а такіх таксама нямала? «Мы стаялі ў чарзе па хлеб»... — пры стаяньні ў любой чарзе або «Я стаю на крыжы беларускіх дарог» — часта згадваецца на скрыжаваньнях.

Пачаўшы свае развагі з пары найбольш выразных прыкладаў, якія самі прасіліся ня толькі на язык, але і ў гэты тэкст, я паступова выйшаў на цэлыя россыпы прыкладаў, зь якіх ужо цяжка выбіраць. Добра яшчэ, што абмежаваўся надвор'ем, якое сустракае нас на выхадзе з хаты. А колькі ўсялякіх прыказак усплывае ў галаве з тысячы іншых нагодаў. Прыказак, прымавак ды іншых устойлівых фразэалягізмаў, некаторыя зь якіх тут жа на языку і нараджаюцца. Наступная думка здаецца мне вартаю ўсіх папярэдніх развагаў. Мы гаворым пра фальклёр. Абсалютна жывы і паўнакроўны беларускі фальклёр, які самі ж з дапамогаю нейкае вышэйшае волі і ствараем. Паводле тых самых рэцэптаў, якімі карысталіся нашыя продкі.

Пасьля таго як фальклёрныя скарбы нацыі былі сабраныя, апісаныя і трывала прывязаныя да старажытнага або колішняга вясковага быту, для ўсяе наступнае народнае творчасьці сталі прыдумляць усялякія адрозныя азначэньні. Гарадзкім фальклёрам называлі як правіла вусную творчасьць пралетарыяту або так званы чорны гумар, г.зн. зьявы так ці інакш маргінальныя, не ўсеагульныя. Але з канцом камунізму і Савецкага Саюзу, дзе вусная народная творчасьць часьцяком пісалася ў мэтадычных кабінэтах аддзелаў прапаганды і агітацыі, такія азначэньні перасталі выглядаць пераканаўча. І цяпер усё паступова вяртаецца на свае месцы.

Натуральна, інфармацыйная рэвалюцыя дае фальклярыстам большыя магчымасьці прасачыць паходжаньне той ці іншай прыказкі. Паданьні часьцей выдаюцца за мэмуары. А песьні яшчэ не зрабілі свайго адрыву ад аўтарскага выкананьня да масавага. Але затое зьявіліся іншыя фальклёрныя жанры: чуткі з пагалоскамі, містыфікацыі... Наш горад і наш час, аказваецца, ніяк не запыняюць разьвіцьцё спрадвечнае традыцыі — вуснае народнае творчасьці. Гэта толькі камунізм і эсэсэсэр запынілі яго на 70 гадоў. Але ж не назаўсёды. Наша вёска застанецца музэем фальклору, дзе перахоўваюцца і ўзнаўляюцца старыя скарбы. Так будзе датуль, пакуль яна не прачхнецца ад савецкага і постсавецкага прыгону. Тымчасам жывым расплодзішчам фальклёрных пэрлаў неўпрыкмет становіцца горад. І цяпер справа за малым — за зьяўленьнем новых Насовічаў і Федароўскіх, якія з ранейшай стараннасьцю будуць апісваць гэты працэс.

Сяргей Паўлоўскі

На ўсю моц

Кожнага 25 студзеня ды жніўня, даты нараджэньня й сьмерці Ўладзімера Высоцкага, я зьбіраюся моцна напіцца. Выканаць, як мне здаецца, рытуал памяці да канца й па-расейску. І кожнага разу задума не атрымліваецца. Не знаходзіцца саўдзельніка. Са злосьці я выношу магнітафон на гаўбец і ўрубаю на ўсю моц голас, які так і не ўвайшоў, як мне здаецца, на ўсю поўніцу ў душы беларусаў.

Мне было гады тры, калі я ўпершыню пачуў той голас. Калі запрацавала памяць, першае, што вывучыў, былі «Кони привередливые». Магнітафона ў нас не было, таму я задавольваўся кружэлкамі з «дазволенымі» песьнямі. Недазволеныя даляталі да мяне толькі з адчыненых вокнаў. Куды б я ні сьпяшаўся, уставаў як укапаны ды слухаў. Хоць такім чынам намагаючыся задаволіць сваю цікавасьць да апальнага барда. Разумеў мала, але неверагодна прыгожы голас і напятая да немагчымага манера выкананьня ўражвалі.

Магнітафон у хаце завёўся толькі праз пару гадоў пасьля ягонага сыходу. Ягоная сьмерць у маёй сьвядомасьці быццам адцягнулася ў часе й прасторы, дзякуючы майму няведаньню большасьці напісанага ім. Недзе была Масква й Ваганькава зь ягонаю магілаю, але пакуль у мяне ў запасе заставаліся непраслуханыя бабіны й непачутыя песьні, мёртвае Ваганькава лёгка адцянялася жывым голасам. Толькі калі скончыліся стужкі, што я пазьбіраў ад усіх сяброў ды знаёмых, ягоны канчатковы сыход раптам стаў для мяне самай сапраўднай рэальнасьцю. Ад раптоўнасьці зразуметага я, памятаю, тады плакаў.

З тае пары мне цяжка зразумець людзей, якія могуць абыякава слухаць той голас. Голас, які не ўва мне адным зарадзіў жаданьне авалодаць трыма акордамі ды апрабаваць свае пяшчотныя зьвязкі.

Беларусь не была абыйдзена ягонаю ўвагаю. Якую ён, яшчэ ў 79-м годзе, будучы з тэатрам у Менску на гастролях, на адным са сваіх выступаў назваў краінаю. «Я вельмі добра ведаю гэтую краіну. Я шмат чым зьвязаны зь Беларусяй, зь Менскам». Дарэчы, у яго тут мусілі быць памятныя мясьціны. Наваградчына, адкуль карані ягонай французкай жонкі, менскі раён «Усход», дзе жыў ягоны лепшы сябра Віктар Тураў, Дом афіцэраў, дзе гастраляваў ягоны Тэатар. Аднак беларускіх вобразаў у ягонай спадчыне ня так і шмат. Узгадваюцца «будь то Минск, будь то Брест — в холода, в холода». Нашыя гарады супрацьпастаўляюцца халадам як полюс цеплыні. Таксама згадваюцца беларускія словы, якія ён часам выкарыстоўваў у сваіх вершах. Напрыклад: «вяртайся» ў дарожным дзёньніку. Тамсама ён апісаў Курган Славы: «Два огромных штыка полоснули морозом по коже. Остриями по мирному к верху, а не накренясь». І ці ня дзякуючы ягонаму ўдзелу, нашыя кінакрытыкі назвалі карціну Віктара Турава «Я родам зь дзяцінства» лепшым творам «Беларусьфільма»?

А ці не з Высоцкага пачалася ўся наша бардаўская песьня? Справа тут нават не ў ягонай супэрпапулярнасьці, і тым больш не ў астранамічнай колькасьці напісаных песень. А, здаецца мне, у той ступені разьняволенасьці, якой заўсёды бракавала беларусам, і здольнасьці размаўляць са слухачом на, быццам, «в доску» ягонай мове. Той бытавой мове, якую яшчэ нам трэба знайсьці ці прыдумаць.

Наша культура здолела прабрацца на паліцы абываталя кніжкамі Караткевіча й Быкава, але ў тых дамах беларускае слова з «намагниченных лент» пакуль яшчэ не загучала. Ці не таму высоцкія ноткі прарываюцца амаль ва ўсіх нашых бардаў? Калі для беларускай масы ён ня стаў кумірам, а для эліты ня стаў паэтам, гэта ня значыць, што мы праехалі Высоцкага ці вырасьлі зь яго. А можа не дарасьлі?

Бадай, я адступлю ад свайго «приверженства к фатальным датам» ды часьцей буду выносіць свой магнітафон на гаўбец. Хай слухаюць.

... Зноў, як у дзяцінстве, да мяне вяртаецца адчуваньне далёкасьці тае Масквы і недарэчнасьці зьвестак пра ягоную сьмерць. А калі і вып'ю, то за ягонае жыцьцё, і бяз суму. Ня п'ецца ў Беларусі за ягоны ўпакой.

Зьміцер Бартосік

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст.

Супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі – кожную нядзелю на зьменených хвалях Свабоды. Кожную сераду – паўтор перадачы.

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

Кожную нядзелю на хвалях Радыё Свабода:

Новыя Хвалі, Пастаянны Час,
Нязьменная Свабода
(ад 26 кастрычніка 1997)

Час	К/Hz	Хвалі
18.00 - 19.30	6000, 6170	49
	7155, 7295	41
	3695	75
22.00 - 23.30	6010, 6025,	
	6095, 6170,	49
	7155	41
	9750	31
06.00 - 07.00	5995	49
	7295, 7275	41
	9750	31
	3980	75

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 У 22.00 беларускую праграму можна слухаць у Інтэрнэце: http:/www.rferl.org/bd/be/index.html

Заставайцеся са Свабодай!

Прышчэпленая любоў

Першае маё спатканьне з Высоцкім-сьпеваком адбылося ў дзіцячым санаторыі, у Крыме. Выхавальнік, аквалянгіст-здаравяк, які сваім бясконцым аптымізмам наводзіў нуду на бледных дзяцей з усяе шостае часткі сьвету, прышчапляў нам дзьве рэчы — украінскі патрыятызм і... любоў да Высоцкага. Кружэлкі зь песьнямі апошняга (а іх у яго было дзьве, маленькія нейкія і жахліва заежджаныя) ён ставіў на прайгравальнік можа па дзесяць разоў на дзень. Урэшце, нават тыя дзеткі, што да прыезду ва ўсесаюзную здраўніцу ведалі па-расейску толькі «здрасте» й «спасибо», пачыналі пакрысе балакаць па-харкаўску і на памяць сьпявалі тузін песьняў маскоўскага барда. Здаровыя, мажныя цёткі з санаторнае абслугі таксама былі закаханыя ў сьпеў Высоцкага і дэманстратыўна размаўлялі з намі па-ўкраінску. Наша дзіцячая сьведамасьць лавіла ўсё гэта хвацка. Расейскія песьні Высоцкага і нерасейская мова спляталіся ў адзін камяк даўкага забароненага плада. Праўда, тады яшчэ не было яснасьці — адкуль гэтае адчуваньне забароненасьці?.. Дзеці, нярускія дзеці, раптам навыперадкі пачыналі хваліцца сваімі народамі. Праблемаў з украінскай мовай у мяне амаль не было і неўзабаве, імкнучыся дагадзіць сваім выхавальнікам, я паспрабаваў загаварыць па-беларуску... Гэтак з Крыму я вывез, апроч запасу здароўя, дзьве рэчы: няясную, прышчэпленую любоў да Высоцкага і беларускі патрыятызм...

... Пазьней, калі я гасьцяваў у Узьдзенскім раёне ў сваіх сваякоў, паважаных і дэмакратычна настроеных вясковых настаўнікаў, мне карцела распавесьці ім сваю таямніцу: па-першае, што я беларус, па-другое, што йснуе гэткі таленавіты сьпявак, якога ўпаўпотай слухаюць людзі, якія разумеюць, што да чаго ў нашай краіне. Мае родныя, старыя людзі, якія шмат чаго пачулі на сваім поўным суворых выпрабаваньняў вяку, засяродзіліся: «Ну і што ж пяе той Высоцкі?» Зь дзіцячае памяці, як на злосьць, усплылі толькі песенькі пра жырафа «в желтой жаркой Африке...» і пра дурдом «... вся Канатчикова дача»... Старыя настаўнікі расьсьмяяліся. Неўзабаве іхнае ўяўленьне пра Высоцкага ўзбагаціў, на маё зьдзіўленьне, мой бацька. Ужо ў ягонай інтэрпэтацыі выглядала, што песьні ў Высоцкага блатняцкія — пра зэкаў ды прастытутак, але, вядома, гэта не падстава ўціскаць хоць і гэткага творцу. Я быў, разьятраны, бо ня змог давесьці свайго падлеткавага адчуваньня вышэйшае справядлівасьці. Мае вясковыя сваякі на разьвітаньне падсумавалі: Высоцкім не пераймайся, на сьвеце шмат лепшых паэтаў і музыкаў. Тое, што ты азваўся беларусам — гэта высакародна, але... і пра першае, і пра другое не распавядай чужым людзям.

Пра Высоцкага я, хоць і хацеў бы, забыць ня мог. Ягоны твар зьяўляўся то ў адным, то ў іншым кінафільме, ягоныя песьні чуваць было ў кожным двары. Колькасьць Высоцкага расла разам з колькасьцю палітычных анэкдотаў. Усіх хвалявалі чуткі пра ягонае асабістае жыцьцё. Напрыклад, пра тое, што Высоцкі — беларус, і ягоная жонка Марына Ўладзі — беларуска. Адныя распавядалі, як ён езьдзіць да бацькоў недзе на Берасьцейшчыне, другія — што чулі, як ён гаворыць па-беларуску. Хто сымпатызаваў беларушчыне — сымпатызаваў і слыннаму паўдысыдэнту зь беларускім прозьвішчам. Нам бракавала сваіх пакутнікаў, асабліва жывых... Беларускасьць Высоцкага была настолькі моцнай містыфікацыяй, што першы нацыянальны рок-клюб назвалі ягоным імем.

Пасьля ягонае сьмерці пра гэта ўсё забылася. Высоцкі застаўся самым яркім і шанаваным у Расеі культурным героем 70-х і 80-х гадоў. У нас зьявіліся і ўласныя культурныя героі, якія таксама сталі нябожчыкамі. А нашыя рокеры свае колішнія дачыненьні з імем Высоцкага ўважаюць за прыкол.

З расейскіх паэтаў я сёньня больш цаню... хоць бы і Бродзкага. Як актора, я люблю Высоцкага як пэўны чалавечы тыпаж акрэсьленае эпохі, гэтаксама як і Габэна ці Дугласа. А ягоныя песьні («... слова выходят кор-р-ротки и смачны...») лепш слухаюцца ў расейскіх цягніках: тады доўгія занудныя дарогі за закускай, картамі і Высоцкім лятуць хутка і смачна. Сёньня я змог бы ўсё растлумачыць сваім сваякам — вясковым настаўнікам. Але іх ужо няма. Што цяпер слухаюць у Крыме, я ня ведаю. А заставацца беларусам сёньня не лягчэй, чым колісь.

Сяргей Харэўскі

Магія імя

У 1981 годзе мае бацькі набылі прайгравальнік «Вега-232» і разам зь ім цэлую кіпу кружэлак. Звычайны на той час набор складаўся з Алы Пугачовай, Сафіі Ратару, Чырвоных Макаў, Джо Дасэна, «Аббы» ды Ўладзімера Высоцкага. Прыкладна ў такім выглядзе мой музычны кругагляд праіснаваў да 1987 году. Натуральна, на ўроках музыкі я, у межах дадзенага мне прыродаю таленту, гарланіў пра «во полі березка стояла, выпіла сто грам і упала» ды пра Саўку з Грышкам, што змайстравалі бяз дай патрэбы дуду. Але ўсё гэта была мастацкая самадзейнасьць, удзельнічаць у якой было калі не абавязкова, то вельмі нават пажадана. З бацькоўскага музычнага набору адзіным, што прыйшлося мне да густу, былі кружэлкі Высоцкага. Вяртаючыся са школы, я ставіў на «вяртак» падрапаныя грубай іголкай кружэлкі і жыў пад гэтыя песьні ажно да самага вяртаньня бацькоў з працы. У той час я мог бы даць такое вытлумачэньне слову «воля» — гэта той час, калі бацькоў няма ў хаце.

Фрэнк Запа неяк сказаў, што пісаць пра музыку, гэта ўсё роўна, што танчыць пра архітэктуру. Але ці быў Уладзімер Высоцкі музыкам? Калі даць станоўчы адказ на гэтае пытаньне, то трэба прызнаць музыкам любога панка, у якога хапіла цярпеньня навучыцца рытмічна торгаць дзьве струны на гітары. Якасьці паэтычных тэкстаў Высоцкага нічым не вылучаюцца з аграмаднай лавіны вершаванай прадукцыі паэтаў «трэцяй рукі». Але дастаткова на кружэлцы надпісу «Уладзімер Высоцкі», каб забясьпечыць ёй немалы камэрцыйны посьпех. Я неяк паспрабаваў зрабіць сярод сваіх знаёмых невялічкае сацыялягічнае дасьледаваньне. Людзям з самым розным адукацыйным цэнзам і густам, з розных сацыяльных слаёў задаваў адно й тое ж пытаньне «Ці падабаецца Вам Высоцкі?», і адказы былі абсалютна аднолькавыя — «Ну ня ўсё, вядома. Але сёе-тое з задавальненьнем слухаю».

Яго слухалі й слухаюць у абшарпаных пралетарскіх маласямейках і на пасядзелках багемы, дзе п'юць трунькі праз саломінку ды пускаюць тонкімі струменьчыкамі пад столь цыгарэтны дым. Фэномэн культавасьці Ўладзімера Высоцкага ў савецкай культуры трымаецца на ягонай прафэсіі —акторстве. Ён хацеў і падабаўся вэтэранам вайны, грубым сталярам і шахцёрам, швэям-матарысткам, у інтэрнатах, заселеных прышчавымі пэтэвэшніцамі, футбольным трэнэрам і інжынэрам. Ягоныя досьціпы, як тыя показкі пра Пецьку з Васілём Іванавічам, былі даступныя маленькім дзецям, але ў той жа час сьмешныя для прафэсуры. Ён бездакорна капіяваваў жэсты, словы, манеру паводзінаў людзей таго ці іншага сацыяльнага слою й паўсюдна станавіўся «сваім мужыком». Франтавіком, альпіністам, фізыкам, блазнаватым пралетарам — кім заўгодна. Пражыві ён яшчэ гадоў дзесяць — то касіў бы пад рокера й даваў бы супольныя канцэрты зь якім-небудзь заклапочаным сацыяльнай праблематыкай Шаўчуком, сьпяваў бы жартоўныя песьні пра новых рускіх, мо й пра ППРБ што-небудзь зарыфмаваў. І яго б любілі й шанавалі. Як шануе народ таленты газэтных мастакоў-карыкатурыстаў.

У Беларусі падобнай трываласьцю пасьмяротнай народнай любові можа пахваліцца другі Ўладзімер Сямёнавіч... Караткевіч.

Андрэйк Антанян

25 студзеня споўнілася 60 гадоў з дня нараджэньня расейскага сьпевака і актора Ўладзімера Высоцкага.

Да характарыстыкі гэтага творцы заўсёды ўжываліся самыя моцныя словы. Слова «вялікі» было занадта звычайным і высоцказнаўцы спаборнічалі ў перакокваньні гэтае планкі. Ненарматыўны творца правакаваў на ненарматыўныя ацэнкі. Найбольш сьмелыя крытыкі адважваліся на якое-небудзь «абалдзенны» і выляталі з кантэксту літаратуры, хоць безумоўна набліжаліся да сутнасьці зьявы. У межах жа нарматываў пра Высоцкага кажуць пад самую завязку. У Беларусі так звычайна пішуць хіба што пра народных песьняроў. У выніку ствараецца настолькі непрабойны стэрэатып, а творца пакрываецца такім слоем бронзы, што пачуць за гэтай коркаю жывое сэрцабіцьцё ўжо немагчыма.

Калі ўсё ж вызваліцца ад звышнарматыўных ацэнак, беларускіх фактаў біяграфіі і магіяў, якія спадарожаць вобразу Высоцкага, мы адчуем, што бадай так нічога і не зразумелі ў сутнасьці гэтае зьявы. «Блазан»? Гэткі Дарыё Фо, леташні нобэлеўскі ляўрэат? Чаплін? Вакол Высоцкага мне ўяўляецца атмасфэра «Кабарэ» Боба Фоса, толькі перакладзеная на савецкую рэальнасьць, што, зрэшты, ня цяжка сабе ўявіць. Таленавітыя артысты-блазны, якія ўвесь час балянсуюць на канаце паміж жыцьцём і сьмерцю, дакладней, паміж жартам і забойствам, паміж хохмай і бесчалавечнасьцю. Іх атачае жорсткі і несправядлівы сьвет. І яны, дзеці гэтага сьвету, таксама жорсткія і несправядлівыя. Гэты тыпаж нагадвае мне з уласнага дзяцінства дваравога падлетка-блазна, які жорстка распраўляўся са слабейшымі раўналеткамі. Звычайна такія працягвалі сваю біяграфію ў крымінальным асяродку, зь якім, дарэчы часта зьвязвалі і імя Высоцкага. Апошнім часам, калі схлынуў бруталізм мінулага часу, то і такіх дваравых блазнаўпаханоў паменела. Пара-тройка сацрэалістычных тыпажоў рассыпалася на тысячы непаўторнасьцяў, кожная зь якіх заяўляе пра сваю спэцыфічную вартасьць.

Мне здаецца, Высоцкі ўжо ніколі ня стане культавай фігурай і культурным героем наступных пакаленьняў. Магчыма, ён застанецца як паэт, аўтар тэкстаў уласных песень. Але валадарыць над душамі мільёнаў Высоцкі мог толькі там, у таталітарным савецкім кабарэ, на канаце паміж жартам і забойствам, за крок ад цывілізаванага грамадзтва.

С.П.

Віктар Шніп

У СОННЫМ СЬВЕЦЕ

У сонным сьвеце ўсё абрыдла —
І слова «пан», і слова «быдла»,
І мокры сьнег, што за вакном,
І пляшкі, што з сухім віном,
Якое п'ем, каб ажывіцца,
А не каб піць і не напіцца...
У сонным сьвеце ёсьць жыцьцё,
Але яно, нібы сьмяцьцё,
Патрэбна, знаю, толькі ветру,
Якому толькі я і веру,
Бо вецер — мой, бо вецер — я...
А ўсё астатняе — хлусьня.

***

Ты, нібыта прад сконам, гуляеш
І сябе, як апошнія грошы, губляеш
У піўбарах, кафэ, рэстаранах.

А твой брат з тваіх гуляў сьмяецца,
Ён купляе адных і другім прадаецца
І шныруе, як бык, па Канарах.

А табе тут самота такая,
Што душа, як у полі ваўчыца дурная,
Завывае, ад ценю ўцякае.

Толькі тут не ўцячэш анікуды,
І памрэш без пары ад піўбарнай прастуды,
Прасіпіш: «Наша воля такая...»

***

Сонца хаваецца за небакраем,
Быццам бы Храм у крыві патанае.
Б'ецца, як хвалі, аб белы сьвет вецер
І ў навакол намываецца вечар.
Хата мая, быццам човен Харона,
Ценем плыве па самоце зялёнай
І ў цемнату, нібы ў вечнасьць, зьнікае —
Ноч нараджаецца, дзень памірае...
Я паміж імі, як сьмерці дыханьне,
Я паміж імі, нібы разьвітаньне...

***

Нічога ў сьвеце вечнага няма...
І нават Храм ня тое, што турма
Аднойчы раптам мусіць разваліцца.

І можна гэтым суцяшаць сябе,
Знаходзіць штось анёльскае ў журбе.
А можна проста з раніцы — напіцца.

А можна проста жыць і сумаваць,
І тое, што прайшло — не шкадаваць,
Яно было, як выпітая пляшка.

Нічога ў сьвеце вечнага няма...
Цяпло міне, пачнецца зноў зіма,
І будзе белы сьнег і будзе цяжка.

Сяргей Грабоўскі

Філязофія

«Авалодаўшы граматай, Пятро Глебка пачынае многа чытаць», — піша Шкраба ў падручніку «Беларуская савецкая літаратура». Сытуацыя зразумелая і ў чымсьці нават эратычная.

Кожны жыд нараджаецца і жыве з адчуваньнем таго, што ён належыць да апошняга пакаленьня жыдоў; кожны беларус (і ўкраінец, мабыць, у пэўнай ступені таксама) (дакладней сказаць, кожны беларускамоўны інтэлігент) жыве з адчуваньнем прыналежнасьці ня толькі да апошняга, але й да першага пакаленьня беларусаў. Наступствы два: ён надта шмат сабе дазваляе (ні ў што ня верыць; бяздумна капіяваць; мець уласны правапіс і граматыку; зацята працівіцца выбудоўваньню ўсякіх герархіяў; шмат піць і мала рабіць...) і надта ня любіць рэчаіснасьці (зь яе дамамі «састарэлых і інвалідаў», канвэерным памнажэньнем алігафрэніі, трыюмфам расейскага нацыяналізму над беларускім, а галоўнае, расейскага ладу жыцьця над беларуска-літоўскім, зь яе незразумелымі вынікамі стагодзьдзя і тысячагодзьдзя...).

Юлія Крыстэва ў эсэ «Баўгарыя, мой боль» кажа пра бясплённасьць баўгарскіх інтэлектуалаў і тыя самыя спробы разжыцьця чужым розумам, пра бяздарнасьць мовы і немагчымасьць аналізу баўгарскай сытуацыі з дапамогай мовы, сынтаксысу і структураў, запазычаных з гатовых — ці то структуралісцкіх, ці дэканструктывісцкіх, ці фэнамэналягічных схемаў XX стагодзьдзя (значыць, сытуацыя тая самая ва ўсіх краёх, асьлепленых «Сьвятлом з Усходу») («Сьвятло з Усходу», Пятро Глебка, 1946-47, новая рэдакцыя 1955). Крыстэва дае нечаканую і геніяльную параду. Што рабіць? Нічога не рабіць. Выхоўваць густ.

Бітва за сваю супольнасьць, бітва за Беларусь — гэта перш за ўсё падстава для вялікага этычнага клопату, клопату пра сябе і заўсёднага пазіраньня ўсярэдзіну сябе. Бітва за Беларусь — гэта БІТВА ЗА СЯБЕ (у сэнсе: змаганьне за тое, каб стаць самім сабой, каб споўніць сябе). Іншая рэч, што ад Сакрата, ад Плятона клопат пра сябе быў непарыўна зьвязаны з клопатам пра іншых, пра свой поліс, сваю супольнасьць наймя. Іншая рэч, што пасьля прыйшло хрысьціянства, запатрабаваўшы ад чалавека адмовіцца ад клопату пра сябе і клапаціцца толькі пра іншых. Аднак, я ня бачу тут супярэчнасьці. Супярэчнасьць ёсьць у іншым: між патрэбай у ПАЎЗЕ, маўчаньні, засяроджанасьці на сабе і ў сабе, якую адчувае цяпер кожны з нас, і ня менш адчувальнай неабходнасьцю НЕАДКЛАДНА зафіксаваць у словах, тэкстах, мове, «вымавіць» нашу супольнасьць, нашу Беларусь. Ёсьць супярэчнасьць між патрэбай шмат пісаць і неабходнасьцю «шмат слухаць, каб добра пісаць» (В.Булгакаў).

Бывае момант, калі ў чытаньні няма ні патрэбы, ні неабходнасьці.

Сяргей Грабоўскі — украінскі філёзаф і палітоляг, рэдактар часопіса «Генэза» і газэты «Альтэрнатыва», якая першай сярод украінскіх выданьняў зьмясьціла тэкст «Хартыі-97». Ягоная апошняя кніга — «Украінскі чалавек у вымярэньнях XX стагодзьдзя: да пастаноўкі праблемы».

Андрэй Дынько

Філязофія ў межах экс-СССР знаходзіцца ў стане крызысу. Напісаўшы гэтую фразу, згадваеш, што, здаецца, яшчэ не было эпохі і культурнага мацерыка, дзе б не пісалі і не казалі чагосьці падобнага. Зразумелая рэч: усё дасканалае лепш бачыцца з адлегласьці, і ўсьведамленьня, што ты жывеш у эпоху сапраўдных волатаў мэтафізычнага мысьленьня, звычайна ў сучасьнікаў не ствараецца. Аднак крызысы бываюць розныя. Ёсьць крызысы росту. Ёсьць крызысы заняпаду. Ёсьць нават крызысы плюралізму (сапраўды, Гегель, Кант, Фіхтэ, Шапэнгаўэр, Гердэр, Шэлінг сустрэліся на адным лапіку зямлі ў прыблізна адныя тыя самыя гады, і стварылі ўласныя філязофскія сыстэмы, а Шэлінг яшчэ й не адну — вось дзе бушаваў сапраўдны крызыс плюралізму, калі прышвартавацца да аднога зь берагоў, блаславёнага аўтарытэтам жывога клясыка, было вельмі цяжка — каго абраць? Як не згубіць піводнай кроплі з жывога буяньня думкі? Сапраўдная «квадратура кола»).

Сёньняшні ж крызыс, які датычыць тых абшараў, дзе да нядаўніх часоў сіла ўлады забясьпечвала панаваньне выкаванай «як са сталі, як з агню» ідэалёгіі марксізму-ленінізму, мае зусім іншыя контуры. Яго можна — са зразумелай доляй умоўнасьці — назваць КРЫЗЫСАМ ВАЛЯВОГА ПАРАДКУ. Або інакш — крызысам адказнасьці філёзафа за прамоўленае і, такім чынам, існуючае слова, нават крызысам самога падмурку ФІЛЯ-ЗОФІІ, любові да мудрасьці. А філязофія — гэта ня веды, не халодная веда, не абыякавае апісаньне зьяваў — ці то сацыяльнага

Эратычныя занатоўкі

Адам Глёбус

МЕСЦЫ, ДЗЕ ДОБРА КАХАЦЦА...

Добра кахацца ва ўласнай кватэры.

***

Прыемна займацца каханьнем у пакоі калі ведаеш, што ў яго ніхто ня зайдзе.

***

Няблага ладзяцца эратычныя гульні ў закрытым невялікім басэйне.

***

Вельмі зручна кахацца ў пакоі прастытуткі, калі адкінуць прымхі з забабонамі.

***

Асаблівую асалоду можа прынесьці сэкс на новым ложку, купленым дзеля сямейнай эротыкі і спакойнага сну.

МЕСЦЫ, ДЗЕ БЛАГА КАХАЦЦА...

Блага кахацца на ложку бацькоў.

***

Непрыемна забаўляцца з каханкаю, калі ёсьць апасеньні, што нехта назірае за вамі.

***

Блага распачынаць эратычныя гульні ў кватэры замужняй палюбоўніцы. Як бы ты ні намагаўся, але пачуцьцё небясьпекі будзе авяваць сьпіну лёгкім скразьняком.

***

Займацца ў лесе любоўнымі забавамі кепска. Шукаў-выбіраў зацішны куток, а калі знайшоў, і кабета абняла цябе, і пачалі вы танец, ахвяраваны Эроту, вось тады й зьяўляецца нейкі, ліха на яго, валацуга-грыбнік-ягаднік, і не каб прайсьці адвярнуцца, наадварот — стане, вылупіцца й пазірае, зразумела, каб дзіця недасьведчанае, а то дарослы сівы чалавек, зрэшты, і стары — зразумела.

***

Не дае наталеньня акт, праведзены ў гатэльным нумары. Асабліва раздражняюць крокі на калідоры. Здаецца, вось зараз пакаёўка пагрукае ў ненадзейныя дзьверы й запрапануе які-небудзь зусім яшчэ непатрэбны ручнік.

***

Займацца сэксам у пакоях уласных дзяцей-падлеткаў няўтульна. Я не разбаўлены жаданьня выхаваць дзяцей у цноце. Прысутнасьць вялікай колькасьці іхных рэчаў — цацак, кніжак, апранахаў, чаравікаў — не дае расслабіцца й аддацца сэксу напоўніцу.

МЕСЦЫ, ДЗЕ КАХАЎСЯ...

Першы раз я спазнаў жанчыну на полі, у высокім жыце. У нас доўга не атрымлівалася зьліцьцё, бо ні яна, ні я нічога ня ўмелі. На працягу месяца мы толькі й рабілі, што шукалі куткі, дзе можна распрануцца. Мы разьдзявалі адно аднаго, але далей сорам скоўваў нашыя рухі. І вось у жыце, на зямлі, пэўна, выпадкова, я патрапіў у яе. Яна раскінула рукі, выгнулася насустрач майму целу й закрычала на ўсё поле. А я зьдзівіўся, убачыўшы, якое безабаронна-ружовае ў яе паднябеньне.

***

Шмат разоў даводзілася маркітавацца ў пад'ездах. Ну, няма куды пайсьці... І вядзеш жанчыну ў пад'езд, падымаесься на ліфце на апошні паверх, заходзіш на пляцоўку перад гарышчам, вызваляеш патрэбнае ад апранах (бывала, што футра з каханкі не здымаў) і сьпешкаю, з вар'яцкай хуткасьцю робіш тое, што варта было зрабіць нетаропка, у рытме блюзу, а не рок-н-ролу. Няўтульна. Брудна. Мулка. І ў нечым небясьпечна. А па ўсім няма натоленасьці. Зразумела, гвалт і над ёю, і над сабой. Толькі сыты галоднага не зразумее. І ёсьць, ёсьць у пад'ездным сэксе сапраўдны, узьнёслы, урбаністычны рамантызм.

***

Ванны пакой, лазенка... Вільгаць, бляск, маціцовасьць, няспыннасьць, спакуса...

На сьвяткаваньні ўласнага трыццацігодзьдзя, сабраўшы за сталом чалавек дваццаць гасьцей, я зачыніўся з жонкаю ў ванным пакоі і, стоячы, зрабіў сабе і ёй прыемнае. Па нашых заружавелых тварах і бліскучых вачах госьці, пэўна ж, здагадаліся пра тое, што дзеелася ў лазенцы. Сорам і няёмкасьць давялося заліваць каньяком.

І яшчэ: у ванным пакоі добра хавацца ад дзяцей.

ІНТЫМНЫЯ ДРОБЯЗІ...

Старажытныя даоскія сымбалі (нэфрытавы ствол — мужчынскі пачатак, нэфрытавыя губы — жаночы) вельмі дэкаратыўныя, але й паэтычныя.

***

Калі спалучыць матэматыку з эротыкай, атрымаецца нешта спрошчанае мэдыцынскае, накшталт гігіены.

***

Знаёмая жанчына — Іна сказала, што інтымныя гульні выклікаюць у яе сьмех. Зрэшты, ня так і мала.

***

Забаўна слухаць хрысьціянскіх артадоксаў, калі пачынаюцца развагі пра «глыбіню цялеснае любові». Асабліва сьмешна гучыць зь іх аблямаваных барадою вішнёвых вуснаў слова «глыбіня».

***

Разьбіраць ложак, сьцяліць прасьціны, класьці падушкі, распраўляць коўдру я люблю сам. Можа таму, што зь дзяцінства быў прывучаны да гэтага абвязку, але хутчэй з-за таго, што на ложку, засланым чужымі рукамі, мне мулка засынаць. Нават, калі сьцеле любая жанчына, заўсёды папраўляю за ёй. Разумею, варта займацца іншым, а сам прасьціны разгладжваю і нічога не магу з сабою зрабіць. Дарэчы, і засьцілаць, прыбіраць ложак люблю сам.

***

Павабна глядзіцца жанчына на сініх прасьцінах, цела — жывое золата. Але ёсьць іншыя адценьні. Дагестанка Іра чароўна выглядала на крухмальна-белым тле, як і Ала. У Алы маці — узьбечка. Наогул, эўрапейскім жанчынам больш пасуе цёмная бялізна, а вось азіяцкім — сьветлыя драпіроўкі.

***

Любіш ня тую жанчыну, зь якою кладзесься ў ложак, а тую, зь якой прачынаесься.

перапужаных мужчынаў

быцьця, ці то ўласнай сьвядомасьці, модна зашыфраванай скрадзеным тэрмінам «жыцьцёвы сьвет», — гэта перш за ўсё ЎМЕНЬНЕ ЖЫЦЬ згодна зь Лёгасам сьвету і ўласным Я (якое не зьяўляецца, як гэта вучылі ў савецкім дзіцячым садку, «апошняй літарай», а выступае вянцом усяго альфабэту). Таму й губляе сябе філязофія, якая намагаецца ўцячы ад захапленьняў сьвету (сапраўдных, а ня тых, якія лічацца такімі; на тое й філязофія, каб вяртаць чалавеку страчаную зь першасным грахом здатнасьць называць рэчы сваімі імёнамі, ставіць іх на належнае месца і такім чынам выносіць у сьвет зьмест).

Дык хто ж тут вінны, і ці ня месьціцца крызыс, як казаў той булгакаўскі прафэсар Праабражэнскі, у галовах людзей, а зусім не на вуліцы? Але як бы там ні было, мы бачым самавідавочны прыклад браку ВОЛІ ДА ЖЫЦЬЦЯ, а апошняя можа быць (калі не дамінуюць фантазіі «ператвораных формаў» і «трэцяга стану», якія, згодна з Мамардашвілі, ператвараюць тое, што ёсьць, у пачварныя рэчы, якія прыводзяць да антрапалягічнай катастрофы) і мусіць быць ВОЛЯЙ ДА ВОЛЬНАГА ЖЫЦЬЦЯ — брак якой выяўляе сябе і ў галіне філязофіі. Волі, якая звычайна ня зводзіцца да спантанных дзеяньняў дзеля сёньняшняга выжываньня, а заключаецца ў здольнасьці стабільна ўтрымліваць у полі сваёй дзейнасьці пэўны прадмет (ідэальны ці рэальны), выражаецца ў расьцягнутым у часе намаганьні, накіраваным на пераадоленьне супраціву гэтага прадмету ці абставінаў з мэтай дасягненьня рэалізацыі пэўных праектаў і праграм.

У філязофіі брак волі да жыцьця, да вольнага і тым самым адказнага жыцьця выяўляе сябе ці не найперш у надзвычай папулярнай зараз плыні, якая намагаецца шматлікімі запазычаньнямі з наймадэрнейшых заходніх плыняў, шырокім выкарыстаньнем распрацаванай ТАМ тэрміналёгіі, «умантаванай» ва ўкраінскую ці расейскую мову, заявіць пра сваю апазыцыю да недасканалага посттаталітарнага быцьця. Таму ня трэба ўласных намаганьняў, ня трэба ўпартай штодзённай працы дакладнага мысьленьня, дастаткова раз-пораз браць «штосьці», ляпіць зь яго нейкія сыстэмкі, а пасьля рабіць вельмі аўтарытэтныя высновы. Па-за ўвагай прадстаўнікоў такіх напрамкаў застаецца тое, што заходняя філязофія зьвярталася да рэальных праблемаў заходняга ж грамадзтва, а яе тэрміналёгія, створаная ў жывой літаратурнай мове (ці, іначай, мове прафэсійнай культуры) эўрапейскіх нацыяў, і выступае сродкам разьвіцьця гэтай мовы, не выпінаючыся зь яе агульнага рэчышча. У нас жа вырваныя з кантэксту, з адпаведных стадыяў грамадзкага росту наймадэрнейшыя філязофскія плыні, іхныя пастуляты і высновы, перасаджаныя на наш грунт людзьмі, якія ня ведаюць і не адчуваюць гэтага грунту (або адчуваюць — і ўнутрана баяцца яго), выглядаюць дужа сьмешна. Быццам дзеці вырашылі пагуляць у дарослае жыцьцё. Але ня толькі сьмешна, а і небясьпечна, калі высновы, прыстасаваныя да жыцьця сталых, цэласных культураў, раптам пераносяцца на ўкраінскую культуру.

Апроч таго, гэтыя ўцёкі за тэрміны, за архісучасную, ужо нават не мадэрнісцкую — постмадэрнісцкую філязофію — маюць яшчэ адно вымярэньне — СТРАХ. Страх перад рэчаіснасьцю, якую намагаюцца абвясьціць проста «тэкстам», які, маўляў, можна праінтэрпрэтаваць як заўгодна, і ледзь ня ўсе інтэрпрэтацыі будуць правільнымі. Страх перад неабходнасьцю ўпартай шматгадовай працы, каб выславіць, вы-мавіць гэтую рэальнасьць, як гэта рабілі цягам двухсот гадоў клясыкі той жа нямецкай філязофіі (і «тэрміны» якіх маюць сэнс толькі ў кантэксьце роднай ім нацыянальнай культуры, а па-за ёй робяцца пустымі бразготкамі, хоць і надзвычай прывабнымі для найноўшых патэтыкаў з дыплёмамі дактароў і кандыдатаў філязофіі). Нарэшце, страх перад самім Захадам, перад Эўропай, якая вымушае мысьляра асвойваць зусім іншую традыцыю, чым мілае і роднае «самадзержавіе, праваслаўе, народнасьць», ці —абое рабое, «родзіна, дзяржава, камунізм». Такім чынам, дамінуе зараз ва Ўкраіне выпісаная квазіўкраінскай (і квазіфілязофскай, бо гэта толькі імітацыя, і нават не «гульня шкляных пэрлаў», а імітацыя гэтай гульні) мовай ФІЛЯЗОФІЯ ПЕРАПУЖАНЫХ МУЖЧЫНАЎ. Якая аб'ядноўвае імкненьне да эўрапейскіх заснавальнікаў філязафаваньня і няздатнасьць (больш таго — гістэрычнае нежаданьне) шукаць гэтыя перадумовы ў рэальным быцьці, бо, нават у тым, што застаецца ў перапужанага філёзафа ад цэлага быцьця — у «жыцьцёвым сьвеце» (ня блытаць з жыцьцёвым сьветам эўрапейскага экзыстэнцыяналізму). Апроч таго, існуюць і горшыя варыянты такога перапуду, якія выяўляюцца ў модным і «агульнаабавязковым для сапраўднага інцілягента» звароце да расейскай клясычнай філязофіі і дагматычным паўтарэньні пройдзенага напачатку XX стагодзьдзя — як быццам не было жахаў таталітарызму, ГУЛАГу і Асьвенціму, НКВД і Гестапа, як быццам марксізм-ленінізм не нарадзіўся непасрэдна з той жа расейскай клясычнай філязофіі, калі прага сусьветна-гістарычнай місіі толькі зьмяніла сваю вопратку, а мэта — крыж на Сьв.Сафіі ў Канстантынопалі — зьмянілася на чырвоны сьцяг над зямным шарам. І што цікава: той, хто не ўцякае ў захмарныя вышыні абстракцыі, не пляце карункаў слоўных канструкцыяў, зразумець якія цяжка нават зь філязофскім слоўнікам, лічыцца і «эўрапеізатарамі», і «русафіламі» не-філёзафам, чалавекам без прафэсійнай загартоўкі і неабходнай падрыхтоўкі.

Што ж, у кожным вар'яцтве ёсьць свая лёгіка. У ноч з 24 на 25 кастрычніка петраградзкая інтэлектуальная эліта сабралася ў Мэерхольда на чарговай прэм'еры, і чхаць хацела на нейкія там вулічныя разборкі паміж палітыкамі. А ідэолягі Цэнтральнае Рады («шчыра ўкраінскія») тым часам так захапіліся распрацоўкай столькіх ультрадэмакратычных і супэрэўрапейскіх законаў, што не заўважылі, як пад носам у іх бальшавікі арганізавалі і паднялі паўстаньне. Так бывае, калі філязофія намагаецца не зьвяртаць увагі на «надвор'е», на кантэксты, у якіх пішуцца і чытаюцца яе тэксты, зрэшты, на сваё ПРЫЗНАЧЭНЬНЕ. Тады прыходзіць бацька Бажэнка з кулямёцікам, накіроўвае яго на гурму экзыстэнцыйна перапалоханых анцялектуалаў, вымаўляе сакрамэнтальную філязофскую фразу: «Граждане буржуазія, суб'екты!» — і здымае з «прэдахраніцеля»...

Пераклад Андрэя Скурко паводле прадмовы з часопіса «Філософські студії».

***

Не люблю аблушчаны лак на пазногцях. Уяві: доўгія прыгожыя пальцы рассоўваюць похву, і раптам заўважаеш, што цёмна-вішнёвы лак на пазногцях пачаў лупіцца. Непрыемна робіцца.

***

Калі стаміўся, а жанчына пад табою возьме й пазяхне, так і закарціць яе ўдарыць.

***

Што можа быць горш, чым застацца адзін на адзін зь непрыгожай і неразумнай жанчынаю?

***

Куды ні глянеш — паўсюль толькі горш. Узрост. Няма таго, што раней было. Паціху старысься. Але ёсць момант... Усё больш і больш навокал прыгожых, жаданых, павабных жанчын.

***

Каханка стаіць у душы на адной назе, засунуўшы пальцы ў похву, і кажа: «Такая глыбокая дзірка, што й памыць цяжка».

***

Апошняя кропля нагадвае мне даволі просты вобраз кропкі пасьля сказа.

Вось і скончыўся акт, але ты яшчэ ня выйшаў, ты расслаблены ў жаночых нетрах, і тут, у разьняволенасьці ды й спакоі, без усялякае мышачнае напругі, як бы сама-сабою выштурхоўваецца астатняя кропелька.

І толькі пасьля наплывае сум.

***

Нарэшце вынайшаў тыпова беларускую пазыцыю ў занятках сэксам і назваў яе «Плуг, або хлопец пашаньку пахае». А выглядае пазыцыя наступным чынам: яна стаіць на каленях, паклаўшы галаву на падлогу, рукі яна трымае за галавою, а пальцы сашчэпленыя на патыліцы; тым часам ён уваходзіць у яе ззаду і, узяўшы ў рукі яе ступакі, уздымае іх на ўзровень клубоў. Удары ён наносіць у рытме народнае песьні «Хлопец пашаньку пахае... Ой, ёй, ёй... Яго сошанька крывая... Ой, ёй, ёй...»

***

Яна цёплая, як парное малако. Такою жанчына бывае толькі пад раніцу, пасьля сямігадзінавага сну. І сон яшчэ не пакінуў жаноцкія глыбіні. Ты апускаесься ў малако, у цела, у сон, і доўга не ўзьнікае жаданьня вярнуцца на паверхню, у рэальнасьць.

***

Ёсьць некалькі рэчаў, да якіх не зьнікае цікаўнасьць на працягу жыцьця. Адна зь іх — полавыя адзнакі.

***

Непрыгожыя дзявулі, якія са скуры лезуць, каб толькі спадабацца прадстаўнікам супрацьлеглага полу, робяцца падобныя да жабрачак, што выпрошваюць грошы каля гастраномаў. Дзіўна, але ў адных і ў другіх атрымліваецца дамагчыся свайго, толькі, праўда, па драбязе.

***

Мужчына й жанчына — вечны двубой. Каханьне працягваецца, пакуль няма пераможцы, пакуль адзін ня выказаўся цалкам і нешта не дагаворваецца, пакуль існуе тайна... А калі нарэшце адзін прайграў, а другі не паказаў выгляду, што выйграў і пачаў тактоўна падтрымліваць слабейшага, тады ўзьнікае сям'я.

***

Зыркае сьвятло адштурхоўвае ад каханьня.

***

Шмат хто сумняваецца і многія сьцьвярджаюць адваротнае, але прорву можна пераскочыць толькі ў два скачкі, першы зь якіх мусіць зрабіць мужчына, а другі — жанчына.

***

Самая сарамлівая ў сьвеце істота — Сонца, бо ніхто так не чырванее, устаючы й кладучыся ў ложак.

***

... хутчэй, даражэнькі, хутчэй. Калі можаш, яшчэ шпарчэй. Толькі не спыняйся. Галоўнае, не спыняцца, не перарывацца, не пераводзіць дух. Трэба як мага шыбчэй торгацца, як мага шпарчэй варушыцца, як мага далей заглыбляцца, каб да самае сярэдзіны дастаць, каб ажно да сэрца дакрануцца, каб тое сэрца апынулася ў горле й калацілася, білася, сьціскалася й пульсавала. А таму, хутчэй. А таму яшчэ шпарчэй, даражэнькі мой. Любы мой. Каханы мой. Так-так, вось так і яшчэ, яшчэ, яшчэ. Не спыняючыся, да непрытомнасьці, дарэшты, да болю, да страты, да сьмерці, да жыцьця...

***

Больш за ўсё на сьвеце мяне вабіць узор задавальненьняў, вытканы на кіліме жыцьця.

***

Трэньне скуры — аснова эротыкі.

***

Кансьпірацыю вынайшлі й распрацавалі жонкі, якія здраджвалі мужу.

***

Жанчына паядае мужчыну. Ратунак у апошняга адзін — уцёкі.

***

Эротыка й эратычнае — тое, што маруднае й легкаважнае, а парнаграфія наадварот дынамічная, агрэсіўная й яркая.

***

Беларуская дзяржава рэгіструе шлюбы толькі паміж мужчынам і жанчынаю, але можна некалькі разоў разысьціся й зарэгістравацца з новым партнэрам. У заходніх дзяржавах рэгіструюцца мужчыны з мужчынамі — геі, і жанчыны з жанчынамі — лесьбіянкі, у краінах мусульманскіх мужчына можа афіцыйна зарэгістраваць чатыры жонкі. Раней ці пазьней некаторыя дзяржавы ўзаконяць шлюбы паміж чалавекам і жывёлаю. Зародкі гэтых законаў ужо прамалёўваюцца ў абкладаньні падаткамі гаспадароў сабак і котак, папугаяў і канарэек, такімі ж падаткамі абкладаюцца рэчы нерухомыя. Можна здагадацца: у пэрспэктыве сквапная дзяржава дазволіць рэгістраваць інтымныя ўзаемаадносіны паміж чалавекам і рэччу, будуць гуляцца вясельлі, дзе жаніх — манэкен, а нявеста — прадаўшчыца, ці дзе нявеста — машына «Опэль», а жаніх — камбайнёр.

***

У старажытных беларусаў існавала павер'е пра неабходнасьць маркітаваньня са сваёй жонкай на вясновым засеяным полі, каб Бог даў добры ўраджай. Вельмі часта жанчына раскідала насеньневую вадкасьць мужчыны па полі і пры гэтым прыгаворвала: «Божа! Урадзі мой хлеб! Выйдзі колас зь зямлі высокі й прыгожы!»

***

Саромецца ўласных полавых органаў такое ж глупства, як і ганарыцца іх формамі й памерамі. Але ганарыцца ўсё ж лепей, чым саромецца.

1992-1998

КГБ ПА-НЯМЕЦКУ: ШТАЗІ

Працяг са старонкі 11.

Цэнтральнай Управы. 18-я Цэнтральная Ўправа каардынавала барацьбу супраць эканамічнай злачыннасьці; у яе інтарэсах кантралявалася каля 15% агульнай колькасьці падслуханых перамоваў.

АДКРЫТЫЯ ДЗЬВЕРЫ

... У нюрнбэрскім архіве як агню баяцца скразьнякоў. Лёгкі ветрык з аддчыненай форткі можа зьвесьці на нішто плён шматгадзіннай працы. Успырхнуць і апусьціцца на стол і падлогу адсартаваныя пялёсткі паперы — і пачынай усё спачатку. Адмысловая група кампутаршчыкаў у Франкфурце працавала над праграмай, якая дапамагла б аўтаматызаваць працэс пошуку і складаньня аркушу з абрыўкаў рознай формы. Кампутарнае рашэньне было знойдзенае: сканэр запамінаў форму абрыўка, нумараваў яго, спэцыяльная праграма супастаўляла з абрысамі ўсіх іншых і давала каманду: вазьміце шматок нумар 53749 і прыкладзіце зьнізу да шматка 1092.

— Вы ўяўляеце плошчу, на якой трэба раскласьці, да таго ж па па-парадку, усе абрыўкі? І колькі часу трэба, каб перад тым кожны зь іх пранумараваць? І дзе ставіць нумар, калі тэкст з двух бакоў? — адказалі мне пытаньнямі на маё пытаньне — чаму праца не кампутарызаваная. Вяртаньне гісторыі, як і рэстаўрацыя карцінаў старых майстроў — ручная праца.

Паводле ацэнкі нямецкага гісторыка Клаўса Хэнке, які ўзначаліў Аддзел адукацыі і дасьледаваньняў Фэдэральнай камісіі архіваў дзяржбясьпекі, дакумэнты Штазі вартыя даверу як крыніцы інфармацыі. У Штазі існаваў уласны мэханізм спраўджаньня інфармацыі; дакумэнты Штазі значна менш ідэалягізаваныя, чым матэрыялы партыі. І хаця гэта не азначае, што ў дакумэнтах Штазі ўтрымліваецца толькі праўда, бязь іх немагчыма зразумець гісторыю ГДР. І ня толькі ГДР — у архівах Штазі зараз актыўна працуюць дасьледчыкі зь іншых усходнеэўрапейскіх краінаў, больш за ўсё з Польшчы, Чэхіі і Вугоршчыны.

Фінансава-матэрыяльны аспэкт праблемы — захаваньне і апрацоўка архіву — аказаўся, ва ўмовах ГДР, найлягчэйшым. Цяжэй было разабрацца з комплексам юрыдычных, палітычных і этычных праблемаў. Спачатку думкі рэзка падзяліліся: шмат хто заклікаў зьнішчыць усе дакумэнты Штазі. Маўляў, дакумэнты, якія кампрамэтуюць былых «неафіцыйных супрацоўнікаў» будуць пагрозай палітычнай стабільнасьці Ўсходняй Нямеччыны. Будзе надоўга падарваны давер да дзяржаўных і грамадзкіх інстытутаў, напрыклад, да царквы. Апроч таго, у пэўных выпадках, нягледзячы на вялікую колькасьць дакумэнтаў, надзвычай цяжка даць маральныя ацэнкі.

Другі аргумэнт — пагроза парушэньня правоў асобы, бо няможна было выключыць, што канфідэнцыйная інфармацыя патрапіць у прэсу. Сярод архіўных дакумэнтаў — даносы пра асабістае жыцьцё дысыдэнтаў, алімпійскіх чэмпіёнаў, турыстаў, якія выяжджалі на Захад. Сустракаюцца даносы мужоў на жонак, падлеткаў з царкоўных гурткоў на сваіх пастыраў, эНэСы інфармавалі Штазі пра сэксуальныя адхіленьні аб'ектаў сачэньня, прычым некаторыя з ахвяраў былі іх партнэрамі. Падобная інфармацыя ў прэсе, безумоўна, парушала б канстытуцыйнае права асобы на прыватнае жыцьцё. На гэтых меркаваньнях грунтавалася пастанова сьцерці 6 мільёнаў біяграфічных даведак ў кампутары Штазі ўвесну 1990: пакінулі толькі адзін асобнік раздрукаванага тэксту.

Аднак у спрэчцы «захаваць-зьнішчыць» перамог погляд на архівы як на частку агульнай культурнай спадчыны. Праз год пасьля аб'яднаньня нямецкія палітыкі пагадзіліся адносна формулы, якая гарантавала правы асобных грамадзянаў і адначасна забясьпечвала захаванасьць архіваў Штазі для будучыні. Паводле закону ад 20 сьнежня 1991 году, наглядаць за дакумэнтамі Штазі даручана Фэдэральнаму камісару архіваў дзяржаўнай службы бясьпекі былой ГДР.

Архіўныя працэдуры досыць простыя. Пасьля студзеня 1992 году любы чалавек, згаданы ў дакумэнтах Штазі, у тым ліку іншаземец, мае права азнаёміцца з дакумэнтамі, якія яго тычацца. Пасьля атрыманьня пісьмовага звароту, ведамства Ёхіма Гаўка ўдакладняе, ці зьбірала Штазі інфармацыю на заяўляльніка. Калі так,



чалавек запісваецца на прыём і можа пазнаёміцца з ксэракопіяй сакрэтнай тэчкі. Каб зьмінізаваць магчымую напружанасьць паміж ахвярамі і даносчыкамі, якія былі ці застаюцца ў блізкіх зносінах, у копіі закрытыя імёны тых, хто пастаўляў інфармацыю Штазі. Аднак, паводле заявы ахвяры гэтыя імёны могуць быць адкрытыя. Такім чынам, чалавек сам вырашае, як распарадзіцца сваім мінулым.

Штазі мела справы прыкладна на 5 мільёнаў чалавек. Пакуль пазнаёміліся са сваім жыцьцём у дакумэнтах дзяржбясьпекі 800 тысячаў немцаў (заяўкі падалі 1 млн 200 тысячаў чалавек).

Паводле заканадаўства, пабочныя асобы могуць атрымаць доступ да архіву толькі ў двух выпадках. Першы — калі былы грамадзянін ГДР уладкоўваецца на працу, якая вымагае так званай праверкі бясьпекі. У такім выпадку працадаўца мае права ўведаць мінулае будучага супрацоўніка з гэтага пункту гледжаньня.

Другая катэгорыя дакумэнтаў, да якіх могуць атрымаць доступ пабочныя асобы — справы асабліва вядомых людзей. Заканадаўцы вырашылі, што ў некаторых выпадках грамадзкі інтарэс пераважае над асабістым правам захоўваць сваю біяграфію ў тайне. Дазвол у такім выпадку даецца вучоным-дасьледчыкам і журналістам, якія атрымліваюць «ананімную», без імёнаў, вэрсію адпаведных дакумэнтаў.

УРОКІ НА ЗАЎТРА

Посткамуністычная практыка сьведчыць, што заканадаўчае адкрыцьцё архіваў — гэта неабходны першы этап пераадоленьня таталітарнага мінулага. Навуковае вывучэньне дакумэнтаў, грамадзкае асэнсаваньне спадчыны рэжыму ў цэлым і судовае разьбіральніцтва ў кожным канкрэтным выпадку ёсьць абавязковымі складнікамі цывілізаванага разьвітаньня з таталітарызмам.

Гэта найбольш пасьлядоўна выяўляецца ў нямецкім вопыце. Рассакрэчаньне архіваў у Нямеччыне грунтуецца на тым самым прынцыпе, які датычыць нацысцкага пэрыяду: авалоданьне ці пераадоленьне мінулага (Vergangenbeitsbewaeltigung). Дзеля ўвасабленьня гэтага прынцыпу дзяржава асыгнуе значныя матэрыяльныя рэсурсы як на самыя архівы, гэтак і на дасьледаваньні, канфэрэнцыі, публікацыі на тэмы, зьвязаныя са Штазі.

У Нямеччыне афіцыйна скасаваныя юрыдычныя абавязацельствы неразгалошваць сакрэты, якія падпісвалі грамадзяне ГДР. У выніку былыя як кадравыя, гэтак і неафіцыйныя супрацоўнікі Штазі вольныя расказваць і пісаць пра сваю былую дзейнасьць (за выняткам рэдкіх выпадкаў, калі інфармацыя тычыцца інтарэсаў бясьпекі Нямеччыны альбо закранае інтарэсы трэцяга боку).

Несумненна выйгралі ад адкрыцьця архіваў ахвяры, якія здолелі дамагчыся рэабілітацыі і кампэнсацыі. Што тычыцца асабістых зносінаў, дык выкрыцьцё даносчыкаў паміж калегаў, сяброў, нават сваякоў, несумненна, нанесла новыя раны. Але адначасна ў многіх выпадках гэта дапамагло вырашыць і шмат якія старыя непаразуменьні і канфлікты.

На падставе дакумэнтаў, якія сьведчылі, што той ці іншай асобе нанесеная шкода, пацярпела кар'ера і г.д., ахвяра мае права падаць у суд на асьведамляльнікаў і супрацоўнікаў Штазі.

Многія краіны, як, напрыклад Чэхія, Польшча, пад час першых спробаў разабрацца са спадчынай таталітарызму сутыкнуліся з праблемай вызначэньня віны. Прынятыя законы насілі ў пэўнай ступені карны характар, зыходзілі з прэзумпцыі вінаватасьці і калектыўнай адказнасьці, што выклікала слушную рэзкую крытыку. Апроч таго, адразу паўстала праблема надзейнасьці архіваў.

У ліку абвінавачаных апынуліся і людзі, вядомыя сваёй барацьбой супраць рэжыму. Безумоўна, сакрэтныя службы мелі сваіх асьведамляльнікаў у асяродку дысыдэнтаў. Аднак таксама добра вядома, што тайная паліцыя сьвядома распаўсюджвала чуткі аб супрацоўніцтве зь ёю актывістаў, каб скампрамэтаваць іх, пасеяць разлад у асяродку дысыдэнтаў. Як правіла, такія акцыі прыносілі посьпех — ва ўмовах неправавых рэжымаў і грамадзкай атмасфэры падазронасьці эфэктыўна абараніць сваё імя было немагчыма.

Але і посткамуністычнае грамадзтва неахвоча слухала апраўданьні і, фактычна, у шэрагу выпадкаў, новыя балючыя раны былі нанесеныя тым, хто іх менш за ўсё заслугоўваў. Нават пазнейшыя судовыя апраўданьні не маглі залячыць траўмаў, якія атрымаў невінаваты чалавек. Так таталітарызм працягваў наносіць свае ўдары ўжо пасьля таго, як урачыста абвясьцілі пра яго паховіны. Апроч несправядлівасьці, такая практыка сеяла недавер да адкрыцьця архіваў у цэлым і фактычна спрыяла былым сапраўдным супрацоўнікам сакрэтных службаў. Яны атрымлівалі аргумэнты ў сваю абарону, спасылаючыся на выпадкі, калі абвінавачаньні аказваліся несапраўднымі. Яшчэ адно наступства пасьпешлівых выкрыцьцяў — апатыя, частковая страта цікавасьці да архіўных дакумэнтаў, якая назіраецца цяпер у большасьці ўсходнеэўрапейскіх краінаў.

... Знаёмства са справай прафэсара тэалёгіі Н. не пакідала месца сумневам: прафэсар быў каштоўнай шматгадовай крыніцай інфармацыі Штазі. Камісія Ёхіма Гаўка прадставіла 22 дакумэнты, якія сьведчылі пра гэтую сувязь. Дакумэнты не былі сфальсыфікаваныя, іх аўтэнтычнасьць была цалкам даказаная. На іх падставе прафэсара павінны былі пазбавіць права выкладаць ва ўнівэрсытэце. На судзе абвінавачаны заявіў, што кантакты са Штазі ўваходзілі ў кола ягоных абавязкаў як дзеяча царкоўнай управы, аднак ніякім супрацоўнікам сакрэтнай службы ён ня быў. Калі яго інфармацыя фіксавалася Штазі як апэратыўная, дык сам ён пра гэта нічога ня ведаў. Сьведкі, у тым ліку былыя супрацоўнікі Штазі, патлумачылі, што часам давалі псэўданімы і афармлялі ў якасьці эНэСаў некаторых асабліва важных для сябе асобаў, у прыватнасьці, з царкоўных колаў, бязь іх веданьня і згоды. Прычына — унутрыведамасная канкурэнцыя: адны аддзелы не хацелі, каб да іх крыніцаў падступаліся калегі зь іншых управаў. Суд апраўдаў прафэсара-тэоляга.

У падобным жа выпадку, толькі з прафэсарам анатоміі К., суд на падставе архіўных дакумэнтаў, а таксама сьведчаньняў калегаў і былых супрацоўнікаў Штазі, прызнаў абгрунтаванасьць абвінавачаньняў: анатом-даносчык мусіў пакінуць універсытэт.

Досьвед Нямеччыны мае велізарнае значэньне. Да абвінавачаньняў у злачынствах камунізму тут паставіліся як да ўсіх іншых абвінавачаньняў у злачынствах: прымаюцца пад увагу толькі дасканала праверэныя пад час сьледзтва і пацьверджаныя ў аб'ектыўным судовым раглядзе доказы.

Нягледзячы на агульную высокую верагоднасьць інфармацыі ў дакумэнтах Штазі, нямецкія юрысты прыйшлі да высновы, што яна недастаткова надзейная з пункту гледжаньня права. Паводле пастановы Вярхоўнага суда Нямеччыны, дакумэнты Міністэрства дзяржаўнай бясьпекі прынцыпова ня могуць лічыцца дастатковым доказам дзеяньняў, якія інкрымінуюцца падазраванай асобе.

У Нямеччыне ня толькі не бяруць пад увагу газэтныя інсынуацыі і прыватныя плёткі, але за іх можна патрапіць на лаву падсудных. Суд пераправярае паводле іншых крыніцаў архіўныя дакумэнты; суддзяў цікавіць не само «неафіцыйнае супрацоўніцтва» (для больш-менш вядомых дзеячоў кантакты з уладамі і Штазі былі непазьбежныя), а парушэньне законаў і нанесеная шкода.

Нямецкі досьвед у пэўным сэнсе ідэальны: велізарны эканамічны і інтэлектуальны патэнцыял, высакаразьвітая судовая сыстэма дапамаглі вырашыць як практычныя, гэтак і шматлікія юрыдычныя і маральныя праблемы бяз значных палітычных і сацыяльных узрушэньняў. Нямеччына змагла дазволіць сабе поўную замену сакрэтных службаў ва ўсходніх землях. Ні адна іншая былая сацыялістычная краіна ня ў стане цалкам паўтарыць нямецкі вопыт. (Нават у Нямеччыне, у ідэальных палітычных, арганізацыйна-фінансавых умовах не ўдаўся аднамоментавы пераход — некалькі месяцаў пайшло на прыняцьце парлямэнцкага рашэньня аб замене Штазі фэдэральнымі службамі, але яшчэ паўтары гады Фэдэральнае агенцтва абароны канстытуцыі і Фэдэральная разьведвальная служба ня мелі ўласных мясцовых аддзелаў ва Ўсходняй Нямеччыне.)

Аднак нават нямецкі вопыт засьведчыў, што дзяржава сама ня ў стане пераадолець традыцыі таталітарызму. Гэта можна зрабіць толькі з удзелам шырокай грамадзкасьці. Людзі павінны мець права доступу да свайго мінулага, каб самастойна прыняць рашэньне і зрабіць належныя высновы дзеля свабоды. Бо свабода немагчымая бяз праўды. Гэтая максыма вызначыла лёс сакрэтных архіваў у эўрапейскіх краінах пасьля падзеньня камунізму. Гэтая формула мае і адваротную сапраўднасьць — зачыненыя архівы азначаюць, што камунізм працягвае існаваць. Таталітарызму заўсёды патрабуецца міністэрства праўды.

... Цяпер, пасьля вяртаньня зь Нюрнбэргу, я ведаю, як выглядае жах катаў: гэта мяхі з ірванай паперай.

Аляксандар Лукашук

Нюрнбэрг — Прага

Дарагія чытачы «НН»!

Рэдакцыя выбачаецца за нявыхад газэты з тэхнічных прычынаў 26 студзеня 1998 г. Наступныя нумары «НН» выйдуць 9 і 23 лютага.

Рэдакцыя

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

рэдактар ... Сяргей Дубавец
выдавец ... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік ... Павал Жук
адказны сакратар ... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ... Лявон Раманчык
набор ... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ... Севярын Квяткоўскі
пры ўдзеле ... Сяргея Шупы

АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: niva@user.unibel.by
http://rampage.ml.org/users/~nasa_niva

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 2950. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 2:56 , 02/2/1998 . Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 537. Кошт свабодны. У шапіках "Белсаюздруку" – 9500 руб.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12